© PDF: Kamunikat.org 2011

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "BACKAUSCYNA" ("FATHERLAND")

Responsible Publisher: Wladimir BORTNIK

Printing Office: Buchdruckerei der Apostolischen Visitatur, München 8, Rosenheimer Straße 46a. — Telefon-Nr. 45 81 43

Post Adress: "Backauscyna", München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III
Die Administration der Weißruthenischen Zeitung „BACKAUSCYNA"
München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — Ц А Н А 50 Н. ФЭН.

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND" | LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE"

№ 15—16 (94—95) | Вялікдзень 1952 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ 6

ХРЫСТОС УВАСКРОС!

БОЖАЙ МІЛАСЬЦЮ

СЬВЯШЧЭННЫ САБОР ЯПІСКАПАЎ БЕЛАРУСКАЕ АЎТАКЕФАЛЬНАЕ ПРАВАСЛАЎНАЕ ЦАРКВЫ НА ЧУЖЫНЕ

Да усёчэснага Духавенства, прэпадобнага Манашства й усіх богалюбівых вернікаў БАПЦ.

Вялікоднае Архіпастырскае Пасланьне

ХРЫСТОС УВАСКРОС!

Улюбленыя у Хрысьце Дарагія Браты й Сёстры!

«Анлег анавесьціў Багадатнай: чыстая Дзева радуюся, дый ізноў кажу, радуйся: Твой Сын Уваскрос на трэяц дзень із гробу, і памерлых ажывіў, людзі весялецеся!» (Вялікодны Канон).

Любыя дзеці нашы! Шмат такіх цудоуных песьняў, поўных нявымоунага харасtва, радасьці й Ласкі Божае сыпяваем мы ад вякоў у гэтае Вялікае Сьвята над усімі Сьвятамі, у Дзень Сьветлага УВАСКРАСЕНЬНЯ Госпада нашага Ісуса Хрыста! Бож: «Гэта дзень, што яго даў нам Гасподзь, узрадуемся й узьвесялімся ў ім». І сьвятая Праваслаўная Царква наша, у вялікай радасьці сваёй, заклікае нас далей: «Прасьвятлімся Уваскрасеньня Сьветлым Днём, абнімем адзін аднаго, назавем братамі сябе, і тым, што злое робяць нам, усё выбачым дзеля Уваскрасеньня».

Бо — Хрыстос Уваскрос! Радасьць вечная! Радасьць над радасьцямі! Бо Сваім Уваскрасеньнем Хрыстос перамог сьмерць і нас зрабіў несьмяротнымі! Пасьля Уваскрасеньня Хрыстовага ня стала страху сьмерці. Ня стала найбольшага смутку чалавецтва. Што сьмерць, калі ёсьць уваскрасеньне й жыццьцё вечнае? «Сьмерць! Дзе тваё джала? Пекла! Дзе твая перамога?» (I Кар. 15, 55). Што страх і смутак, калі ёсьць шлях спасеньня, насалода ў Госпада — вечнае шчасьце. Хрыстос Сваёю сьмерцю й Уваскрасеньнем адчыніў нам дзьверы раю й кажа: «Уваходзьце й будзьце вечна шчасьлівымі! Нічога ня бойцеся, толькі веруйце, толькі жывеце па Божаму».

Таму Сьветлае, радаснае Сьвята Уваскрасеньня Хрыстовага найбольшая пацеха чалавека, найвышэйшая мэта нашага жыцьця.

Дарагія дзеці нашы! Абліваецца крывёю любая, гаротная Маці наша — Беларусь. Шмат, шмат тысячаў найлепшых Сыноў і Дачок слаўнага Народу нашага знаходзяцца на сучасных, поўных нявымоўных цярпеньняў «рэках Вавілёнскіх». І Вы, Браты й Сёстры, нясіце цяжкі крыж на Гальгофе сваей. Але ўжо сьвітае! Набліжаецца слаўны мамэнт заканчэньня цярпеньняў нас усіх, набліжаецца мамэнт перамогі Вечнае Праўды! Ужо дрыжыць старожа злой сілы пры Гробе Яго, Спасіцеля нашага! Хутка Вы пачуеце збаўленныя, радасныя словы: «Хрыстос Уваскрос ізь мёртвых, сьмерцьцю сьмерць паканаў і тым, што ў грабох, жыцьцё дараваў.

Таму ў гэты слаўны Дзень Сьветлага Хрыстовага Уваскрасеньня смутак Ваш зьменіцца ў радасьць і ўсе сумлівы зьнікнуць з сэрцаў Вашых, бо сьв. Апостал Якуб кажа: «Таму прасеце зь вераю, ані ня сумлявайцеся, бо той, хто сумляваецца, падобны да марское хвалі, якую вецер уздымае й разьбівае» (Як. I, 6), Уваскрасеньне Хрыстовае разьвеіла ўсе сумлівы, дало радасьць і надзею й на нашае ўваскрасеньне ды на вечнае жыцьцё ў Царстве Божым.

Таму ў гэты Сьветлы Дзень Уваскрасеньня Хрыста, Спасіцеля ўсяго сьвету, у Нябёсах — весяляцца, на зямлі — радуюцца, цешыцца ўвесь сьвет тленны й нятленны, бо — Хрыстос Уваскрос, прымірыў людзей з Богам і зрабіў іх дзяцьмі Яго, спадкаемцамі Царства Нябеснага.

Няхай-жа ніхто й нішто не зацемніць нашай радасьці ў гэты Сьветлы, Вялікі й Сьвяты Дзень! З Богам няма смутку! З Богам няма роспачы, зьняверы! З Богам мы маем цьвёрдую, непахісную надзею на спаўненьне нашых спадзяваньняў. Няхай яшчэ ня скончыліся нашыя цярпеньні і вораг Дабра й Праўды насьмяхаецца з нашых мукаў і сьлёзаў, але як цёмную ноч зьмяняе сьветлая зараніца, ясны дзень, так і наш смутак зьменіцца на радасьць і вясёласьць, калі толькі мы будзем зь Ім, Спасіцелем нашым, калі мы разам ізь сьв. вярхоўным Апосталам Пятром скажам Яму: «Ты ведаеш, Госпадзі, што любім мы Цябе».

Няхай наш Народ і пакутуе яшчэ ды сярод навальніцы зла й няпраўды зьнемагае, але, калі з намі будзе Вялікая, Магутная Праўда Яго, мы пераможам усякую цемру, усякую найстрашнейшую злую сілу. Калі мы будзем з гэтай Праўдай Уваскрослага Спасіцеля нашага, споўніцца прароцтва Ісаі й для Народу нашага: «Тыя, што цярпелі зьдзекі, будуць цешыцца сваёю доляй, бо ў краіне сваей удвая асягнуць, і радасьць вечная будзе ў іх. Бо Я ёсьць Гасподзь, што люблю Праўду, ненавіджу зьдзерства й насільля й аддам ім нагароду па праўдзе» (Іс. 61, 7-8).

Вось-жа, любыя дзеці нашы, з праўдай і надзеяй на Справядлівасьць Божую мужна пераносьце ўсе цярпеньні й часовыя няўдачы на шляху змаганьня з насільлем, крыўдаю й няпраўдай, што чыняцца над Народам нашым. Няхай кажны чын Ваш будзе накіраваны на ўзмацненьне нашага агульнага дабра, братэрства, любові й згоды між Вамі, а Міласэрны Гасподзь наш Ісус Хрыстос паможа нам ласкаю Сваёю ў пакутах нашых, прывядзе нас да Волі, да Шчасьця, да Радасьці й Свабоды ў кажнай нашай беларускай сямейцы ды ў Роднай, Любай Краіне нашай — Беларусі!

Бо дзеля нашага спасеньня — Хрыстос Уваскрос!

Любыя ўсячэсныя Айцы, Браты й Сёстры й уся нашая богалюбная паства! Вітаем маліцьвенна ўсіх Вас — і тых, што на выгнаньні лёс закінуў, і тых, што ў цямніцах і высылках марнеюць, і тых, што ўдома мучацца — зь Вялікім Сьветлым Днём, Радасьці й Надзеі, Сьвятам над Сьвятамі — Уваскрасеньнем Хрыстовым! Адзіным сэрцам і адзінымі вуснамі засьпавайма песьню ангельскую — «Радуйся Дзева, радуйся, радуйся багаслайленая, радуйся прапраслаўленая: Твой-бо Сын Уваскрос на трэці дзень із гробу» (Вялікодны Канон).

І адзінымі вуснамі й адзіным сэрцам радасна адкажам: Запраўды Уваскрос!

Любоў, Ласка, Мір і Благаславенства Уваскрослага Госпада нашага Ісуса Хрыста з усімі Вамі. Амін!

СЬМІРЭННЫ АРХІЯПІСКАП СЯРГЕЙ
Галава Сьвяшчэннага Сабору Япіскапаў Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы.

СЬМІРЭННЫ ЯПІСКАП ВАСІЛЬ
Сакратар Сьвяшчэннага Сабору Япіскапаў БАПЦ на Чужыне.

Дадзена Року Божага 1952 месяца красавіка Аўстралія — Амэрыка.



Уваскрашэньне, фрагмэнт Ізэнгаймскага аўтара, пэндзля аднаго з найвялікшых маляроў, Маціса Готтарда Нітгарда (званага Грынэвальд), каля 1512—1516 г. (Клішэ атрыманае з Рэдакцыі ўкраінскай газэты «Хрысьціянскі Голас»).

Хрыстос Уваскрос — Уваскрэсьне Беларусь!

Бадай ніводнае сьвята ў разуменьні й адчуваньні беларускага народу ня мае такога глыбокага сымбалічнага сэнсу, як Вялікдзень. Вялікдзень — гэта ў першую чаргу сьвята ў памяць Уваскрасеньня Хрыста, г. зн. сьвята рэлігійнае. Але, апрача свайго рэлігійнага зьместу, мае яно ў народным разуменьні й яшчэ іншыя аспэкты.

Зьбягаючыся ў часе якраз з пачаткам вясны, калі замёрлая зімовым сном прырода прачынаецца да новага жыцьця, зьяўляецца Вялікдзень сымболем усякага адраджэньня, усякага ўваскрасеньня. І хіба з гэтае прычыны зьяўляецца яно сьвятам радасьці, сьвятам вясельля. Не дарма адна з найбольш пашыраных вялікодных рэлігійных песьняў пачынаецца славамі: — «Вясёлы дзень для нас настаў...»

Другім сваласаблівым мамэнтам Вялікоднага сьвята ёсьць яго народны, можна сказаць нацыянальны характар. Зь Вялікаднем бо зьвязана мноства народных звычаяў, абрадаў і песьняў, якія гэтаму сьвяту ў разьдзеле беларускай народнай творчасьці вызначаюць важнае месца. Даволі ўспомніць толькі беларускіх валачобнікаў ці алалоўнікаў, якія ў Вялікодную ноч ходзяць ад хаты да хаты, сыпяваючы пад вокнамі валачобныя песьні, называныя ў некаторых мясцовасьцях «вінамі» (ад паўтаранага ў іх рэфрэну — «Ой, віно-ж маё зялёнае»), каб пабачыць, як глыбака ўкаранілася сьвята Вялікадня ў народнай традыцыі.

Але для беларускага народу, які стогне ў вакоўках няволі і, як калісьці Хрыстос, нясе цяжкі свой крыж на Гальгофу, найбольш важным і павучальным зьяўляецца ягоны сымбалічны мамэнт — ягоны сымбаль уваскрасеньня ўсякае духовае сілы, якая, маючы ўсе жыцьцятворчыя задаткі, ніколі памерці ня можа. У надлюдзкіх муках і цярпеньнях Хрыста, Ягонай сьмерці й цудоўным Уваскрасеньні мы беларусы шукаем аналёгіі да нашага собскага народу.

Бо й Беларусь, як некалі Хрыстос, завісла сяньня на крыжы, а на галаву ейную ўзложаны крывавы цярнёвы вянок. Беларускі народ у няволі злога духа — бальшавізму церпіць нявыносныя мукі, у ахвяры за сваю сьвятую ідэю прыносіць жыцьці соцен тысячаў найлепшых сыноў і дачок сваіх. І ня гледзячы на тое, што гэтая жахлівая няволя трывае на Беларусі ўжо некалькі дзесяцігодзьдзяў, ня гледзячы на тое, што ейная лютасьць што раз больш сільнейшая, ейны цяжар што раз больш вялікшы, не змагла яна зламаць непераможнага духа беларускага народу.

У сваіх муках выказаў беларускі народ столькі жыцьцёвае сілы, столькі гарту духа, такую глыбіню нацыянальнага зьместу, што, будучы пераможаным

(Заканчэньне на 2 балоне)

Роля Эміграцыі

Не адзін ужо раз у нашай прэсе зьмяшчаліся артыкулы аб значэньні й заданьнях беларускае эміграцыі, але толькі апошнім часам зьвернута на гэта асаблівая ўвага, што, бязумоўна, сьветчыць пра нязвычайную важнасьць наяўнасьці гэтай-жа эміграцыі.

Дзеля гэтага ня будзе тут лішнім яшчэ раз зьвярнуць на яе хоць крыху ўвагі. Беларуская эміграцыя, як нярэдка й трапна адзначалася ўжо ў прэсе, па сваўму характару зьяўляецца палітычнай. Бо хіба ня знойдзецца ніводнага сапраўднага беларуса, які не хацеў-бы вярнуцца да свайго роднага краю, й які таксама вельмі добра разумее, што без змаганьня за народныя правы, яму няма больш павароту на Бацькаўшчыну. Гэтым і паясьняецца інтэнсыўны ўдзел нашае эміграцыі ў агульным ходзе вызвольнага змаганьня беларускага народу. На сяньня ня можа быць ніякага сумліву ў тым, што наяўнасьць добра зарганізаванае эміграцыі зможа ў вялікай меры ўзмоцніць нашыя пазыцыі ў змаганьні за незалежнасьць. Усё сумніўнае, адносна гэтага, разьвяе гісторыя апошніх 50 гадоў, якая дае нямала вельмі характэрных прыкладаў аб выкананьні тэй, ці іншай эміграцыяй не абы якой ролі ў ейным змаганьні за нарадныя правы. Найяскравейшым прыкладам гэтага зьяўляецца актыўная дзейнасьць жыдоўскіх эмігрантаў, якія, фактычна, стварылі самыя вырашальныя перадумовы для асягненьня перамогі над арабамі й ангельцамі.

Пра нязвычайную важнасьць прабываньня беларусаў на чужыне гавораць яшчэ ходзь-бы толькі адны савецкія ноты да амэрыканскага ўраду, у якіх пагражаецца амэрыканцам за падтрымку вызвольных рухаў паняволеных народаў з-за зялезнай заслоны (як ведама найсільнейшыя паўстанскія рухі адбываюцца якраз на Беларусі й Украіне) не гаворачы ўжо аб шматлікіх нападах савецкае прэсы на беларускую эміграцыю з урадам Б. Н. Р. на чале, пры дапамозе якой нібы амэрыканцы намагаюцца разьдзьмухаць пажар вайны ў Савецкім Саюзе.

Усё гэта пераконвае нас аб вялізарным значаньні наяўнасьці добра зарганізаванае беларускае эміграцыі.

Дзеля гэтага сяньня нямашака ніякай патрэбы даводзіць ці разважаць, што эміграцыя штосьці больш паважнейшага зрабіць ня зможа, або што, беларускі народ на бацькаўшчыне вырашыць усё дазваньня сам. Пазыцыя й заданьні беларускай эміграцыі зьяўляюцца зараз больш чым ясныя. Зусім правільна падчыркнуў сп. П. Каранеўскі ў сваім артыкуле «Роля эміграцыі» («Бацькаўшчына», № 9/88), што бацькаўшчына будзе мець вырашальны голас у справе будучага лёсу Беларусі, але гэта ня значыць, як некаторыя думаюць, што беларусы на эміграцыі павінны сядзець злажыўшы рукі, тады, калі крывава-чырвоны бальшавізм палошчыцца ў моры сьлёзаў, крыві й тартураў беларускага народу.

І той хто зьяўляецца абыякавым да беларускае справы на эміграцыі, ёсьць таксама абыякавым і наагул да ўсяго беларускага што раўназначна зноў-жа абыякавасьці да сваіх найбліжэйшых, да сваіх бацькоў ці сем'яў, якія дажываюць мо' апошнія свае дні ў пратухлых падвалах М. В. Д., або задратованых концлягерах, але ўсё-ж чакаючых на нас з найвялікшай надзеяй як на вызвольнікаў, што расьсякуць магутным узмахам беларускага мяча бальшавіцкія аковы няволі. Для нас беларусаў на сяньня існуе толькі адзін дэвіз: «Праца, змаганьне, жыцьцё — ўсё для Вольнае Беларусі» ад якога мы нідзе й ніколі, незалежна ад таго, дзе мы знаходзімся — на эміграцыі, ці на бацькаўшчыне, ня толькі не павінны атрасаць рук, а наадварот — прысабечыўшы ганаровыя свомасьці гэнага дэвізу, прылажыць усіх зусільляў, каб як найхутчэй мы маглі ўрачыста адсьвяткаваць Перамогу ў Вольнай Беларусі.

Дык да працы! Нястойма бясчынна з боку!

Сумеснымі сіламі яшчэ больш загострым змаганьне!

Саўка Сакалёнак

© PDF: Kamunikat.org 2011

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Чаго баяцца ў «Новым Рускім Слове»

Чаго баяцца ў «Новым Рускім Слове»

Сакавік — першы веснавы месяц і назоў свой атрымаў таму, што якраз у гэтую пару пачынаюць свой рух жыццёдайныя сокі дрэваў і расьлінаў пасьля вялікай зімовай сьпячкі. Прыродныя аднак законы не заўсёды ўдаецца датарнаваць да справаў грамадзкага парадку, асабліва ў дачыненьні да рэдакцыі «Новага Рускага Слова», зь ейным сваеасаблівым разуменьнем нацыянальнай справы.

Там, на працягу сакавіка, панавала яшчэ лютая зіма й, бадай што, цяжка будзе дачакацца якогась руху новых ідэяў-сокаў, бо рэдакцыя газэты, а зь ёй і бальшыня расейскай палітычнай эміграцыі, ніяк ня могуць прачнуцца ад хварабліва-зацяжнай зімовай сьпячкі зь ілюзорнымі мроямі аб рэстаўрацыі даўно мінулага, а гэтак мілага сэрцу «ісьцінаму» патрыёту вялікага «калхозу-адзінай і непадзельнай» із такімі правінцыямі, як: Закаўкаскі Край, Туркестан, Маларасійскі Край, Севера-западны Край і пад.

Бог аднак зь імі, хай сабе цешацца! Нас цікавіць зусім ня гэты хранічны рэцыдыў кансэрватызму думаньня й навет ня спосабы выказваньня гэтых вельмі часамі дзікіх і няўдольных думак, якія хіба толькі пераконваюць іхных засьляпенцаў-прыхільнікаў. Кажны цьвяроза думаючы не адважыцца аднесьці да ўдалых шыты вельмі грубымі ніткамі г. зв. «рух» фэдэралістых «сходнякоў», — гэты неданосак, зроджаны з хвараблівага ўлоньня рэдакцыі «Новага Рускага Слова», дзе не апошнюю скрыпку вядзе ведамы ўжо «ўкраінец», «фэдэраліст» А. Дікій. Нас парадусім цікавіць тое, як сабе ўяўляюць ажыццяўленьне сваіх хвараблівых мрояў гэтыя «патрыёты». Дзеля гэтага мы ўважна сачылі й будзем сачыць за падобнымі, хоць часта й нуднымі, разважаньнямі й довадамі, каб сваечасова даваць адпор.

Дык вось з гэтага гледзішча характэрным зьяўляецца новае выступленьне напярэдадні сакавіка м-ца (29. 2. 52 г.) А. Сяргеева з артыкулам «У чым небясьпека». А. Сяргееў сьпяшаецца падзяліцца з тымі думкамі, якія ў яго паўсталі з нагоды палемікі паміж Р. Абрамовічам і рэдактарам «Слова» М. Вэйнбаўмам. Яго «палохае» тое, што будзе на другі дзень пасля вызваленьня радзімы ад бальшавізму. Але ня трэба думаць, што А. Сяргееў вельмі палахлівы, бо ён зусім не баіцца прызнаньня «права» народам «Расеі» на самаазначэньне ўключна да аддзяленьня, таму што: «Гэтае права трэба прызнаць. Але вельмі сумліўна, каб народы абавязкава скарысталі зь яго дзеля выхаду із складу будучай дэмакратычнай Расеі» (дзіўная ўпэўненасьць! — А. С.)

Дзеля гэтага Сяргееў раіць ня вельмі палохацца таго, што «самастыйнікі» будуць, як ён кажа, імкнуцца ўсяляк устанавіць «сваю» ўладу ў нацыянальных рэспубліках, «ня лічучыся з воляй і жаданьнямі народаў». Самі сабой, навучае аўтар, «самастыйнікі» ня вельмі небясьпечныя, бо каб захапіць уладу ў тэй ці іншай краіне, недастаткова аднаго хаценьня.

Праўда, паважаны спадару, чаго баяцца? Волю й «жаданьні» народаў выражаеце толькі вы ды «іжэ з вамі», а ў вас із А. Дікімі ды П. Уранавымі, апрача аднаго «хаценьня» ёсьць, ці будзе, яшчэ нешта больш мацнейшае, а што менавіта — здагадацца ня цяжка, бо вы-ж самі кажаце: «Небясьпека ня ў гэтым. Небясьпека ў іншым. У самастыйнікаў **могуць аказацца гарматы... й кулямёты, самалёты й танкі, дараваныя «чужымі дзядзькамі»...** Вось тагды й не пазьбегнуць міжсобнага змаганьня й хаосу» (падкрэсьленьне нашае — А. С.). Чаму-ж гэта «не пазьбегнуць», паважаны? Нам здаецца, што якраз наадварот. Гэтыя гарматы будуць стрымоўваючай сілай перад «хаценьнямі» няпрошаных апякуноў. Хіба-ж будучыя «дэмакраты» новай Расеі рынуцца на «покарэніе» ці «воссоединеніе» не сваіх земляў, або можа паспрабуюць «працягнуць брацкую руку»? Ну, тагды справа іншая. Хтось пэўне й стукне па гэтай «ручцы». Да гэтага аднак не павінна дайсьці менавіта пры той умове, калі ўсе народы будуць імкнуцца толькі да вызваленьня ад бальшавізму сваіх краёў, бязь ніякіх апэтытаў на чужое, на нейкую «апеку» над іншымі, пры роўнапраўным удзеле ў гэтым змаганьні ня толькі людзей, але й дыспазыцыі зброяй. Што г. зв. «сэпаратыстыя» й не падумаюць навет, каб ісьці на Маскву рабіць там свой парадак, можна быць упэўненымі: хопіць ім працы на ўпарадкаваньне сваей зруйнаванай гаспадаркі.

Чаго-ж тады баяцца гэтых кулямётаў? Кажны займае сваё ў сучасных межах рэспублікаў, а некаторыя іншыя спрэчныя тэрытарыяльныя пытаньні вырашацца пазьней міжнароднымі воргамі ці палюбоўнымі пагадненьнямі, ды й да гэтага ўроенага Сяргеевым хаосу недапусьцяць і тыя, хто павядзе супраць бальшавізму.

Справа тут ня ў гэтым. Гэты Сяргееўскі хаос толькі пудзіла на непасьвечаных у запраўднасьць. Але ня трэба быць вельмі мудрым, каб спасьцерагчы, што найбольш трывожыць Сяргеевых.

Сваю запраўдную трывогу Сяргееў выказвае колькімі радкамі далей: «...І яшчэ небясьпечней, калі заходнія дзяржавы выйдуць на змаганьне з бальшавізмам пад сьцягам распадзелу Расеі... А тэндэнцыі да гэтага ў палітычных дзеячаў Заходняга сьвету меліся й маюцца. Артыкул Фульлера трывожыць не таму, што напісаў яго ангельскі генэрал, што карыстаецца аўтарытэтам, як ваенны спэцыялісты, але й таму, што ён адбівае ў той ці іншай меры настрої кіруючых колаў Ангельшчыны».

Дык вось дзе запраўдная «небясьпека» паводля Сяргеева — гэта страх перад разьбіцьцём ілюзыяў захаваньня паранейшаму «вялікай адзінанепадзельнай» Расеі! Страх перад праявамі зразуменьня Заходнім сьветам запраўдных імкненьняў расейскага імпэрыялізму, незалежна ад ягонага колеру!

Вось чаму рэдактар «Н. Р. Слова» навучае, што: «...заданьнем дэмакрацыі й галоўным, калі не адзіным заданьнем расейскай палітычнай эміграцыі, уплываць на пазыцыю заходніх дзяржаваў гэтак, каб гэтая пазыцыя была супраць распадзелу Расеі... Трэба ўплываць на гэтую пазыцыю цяпер, а не калі ўжо будзе позна».

Вось чаму гэтак сьпешна й таму зусім няўдольна выпстрыкнуў у Нью-Ерку, у тым-жа «Рускім Слове», славуты неданосак, г. зв. «украінцы фэдэралістыя», якія, як парадавала сьвет «Слова» 2-га красавіка г. г. ужо 30-га сакавіка «аб'ядналіся» із «беларускімі» фэдэралістымі (!), што маюць «шматлікіх прыхільнікаў у ЗША, Паўдзённай Амэрыцы, Канадзе й Эўропе» (размах, як бачыце, не абы які. Праўду кажучы, дык мы даўно чакалі на зьяўленьне падобнага фрукта — нашых, собскіх, «беларускіх» андрэяў дзікіх, аж нарэшце! Ёсьць! З радасьцю можам ім парэкамандаваць з тэй Паўдзённай Амэрыкі, бо з Аргентыны, яшчэ аднаго «прыхільніка» — зацятага расейскага манархістага Саланевіча, бо ён пісаў у сваіх творах, што «тоже белорус» і ненавідзіць «самастыйнікаў»).

Дык вось гэты «новы прэпарат» ці «саюз» пэўне й будзе дапамагаць Вэйнбаўму «уплываць» на пазыцыі Заходняга сьвету. Апрача «каардынацыі» й аб'ядналь ня змаганьня за вызваленьне ад камунізму сваіх народаў, а гэтак сама й усіх іншых народаў СССР» (гэта, як кажуць, дзеля рэклямы — А. С.) ён будзе «супроцьдзеяць тым шавіністычным групам, што сваёй дзейнасьцю сабатуюць справу змаганьня з камунізмам» (трэба толькі чытаць «сабатуюць справу ўтварэньня новага выданьня вялікага расейскага калхозу» й гэта ўжо будзе не рэкляма, а запраўдная мэта).

Сяргееў яшчэ скардзіцца на тое, што ў галіне «ўплываньня» расейцы вельмі мала робяць і ў гэтым ён бачыць другую небясьпеку. Ён прапануе ўсім кваліфікаваным журналістым, што ведаюць ангельскую мову й якіх даволі шмат, ладзіць сыстэматычныя выступленьні перад амэрыканцамі на расейскія й, у прыватнасьці, на нацыянальныя пытаньні, бо чужынцы вельмі часта робяць памылкі не таму, што ненавідзяць або баяцца Расеі, а таму, што яе ня ведаюць.

Гэта дык ужо будзе запраўднай небясьпекай, але для нас, паняволеных Расеяй народаў, калі мы будзем спаць ды задаволімся толькі насьвятленьнямі нацыянальных праблемаў амэрыканцам з вустаў Сяргеевых!

З усяго гэтага вынікае, што ўсе высокопарныя заяўленьні аб «дэмакратызме» ды іншых «ізмах» газэты «Н. Р. Слова» ёсьць толькі блеф дзеля затуманеньня вачэй сваім і чужым, а запраўднай мэтай усей пісаніны — перакананьне ў неабходнасьці захаваньня суцэльнасьці «старой пабудовы — вялікай Расеі», апаганеньня вызвольных імкненьняў паняволеных народаў, запалоханьне гэтых народаў і свайго народу пудзілам «міжсобнай разьні», калі «ня дай Бог» дойдзе да самастойнасьці некаторых. Усё гэта ёсьць вынікам паважнасьці, размаху й сілы вызвольнага незалежніцкага руху, які што раз больш здабывае агульнае прызнаньне вольнага сьвету, дарма, што расейскія адзінанедзялімцы імкнуцца яго выкпіць і уманіць ягонае значэньне. Каб у запраўднасьці рух гэты быў толькі нейкай мрояй дробнай групкі, а не народным рухам, то ніколі-б аб ім гэтулькі не гаварылі самі расейцы.

Само жыццё змушае іх да гэтага, бо прамаўчаць, абысьці нельга. Гаварыць яны павінны, а як, дык гэта іншая справа. Робяцца ўсялякія спробы й усе яны ідуць пад шыльдай раз «дэмакратыі» іншы раз «фэдэрацыі», бо інакш цяпер нельга, а можа рыбка на штось «клюне». Дзеля гэтага ад часу да часу падаецца штось із лягеру «самастыйнікаў», бо мы-ж, бачыце, аб'ектыўны часапіс; робіцца гэта аднак такім спосабам, што на гэтае «штось» не даецца адразу прынцыповага й рэчавага адказу, а калі ўжо пройдзе крыху часу й сёе-тое забудзецца чытачом — на арэну выпускаецца А. Дікій ці Уранаў, якія так «прачысьцяць», так перакруцяць сказанае, што родны бацька не пазнае.

Гэтак здарылася й із сп. А. Гуд-ий., які 5-га сакавіка ў «Н. Р. С.» у сваім артыкуле «Супроць тэндэнцыйнасьці й ілюзыяў», высунуў цэлы шэраг паважных тэзаў. Сп. А. Гуд-ий паддаў грунтоўнаму разгляду ўсю дасюлешнюю палеміку ў нацыянальным пытаньні, зь якога вынікае, што ў палеміцы гэтай было шмат тэндэнцыйнасьці, але мала аб'ектыўнасьці й добрай волі. Пасьля гэтага аўтар зусім законна паставіў пытаньне: «Дзе ж галасы прынцыповых і чэсных дэмакратаў-фэдэралістых, зь якімі — мы маглі «перабудаваць будоўлю, зрабіўшы яе ёмкай і сьветлай дзеля ўсіх жыхароў» (із артыкула сп. Вэйнбаўма)». Далей ён пытае: «Чаму ўсе расейцы гэтак аднадумна накідаюцца на украінскіх патрыётаў? (ня толькі украінскіх — А. С.). Ці-ж мы перашкаджаем ім любіць сваю бацькаўшчыну? Чаму Вы, спадарове, апраўдываеце бураў, спачуваеце Касьцюшку й шануеце героя — Гарыбальді, а нас лаеце й пагражаеце зброяй? Мы-ж таксама змагаемся за сваю незалежнасьць.» (таму й накідаюцца, сп-ру Гуд-ий! — А. С.).

У заключэньне А. Гуд-ий прапанаваў: «Перагледзьце свае пазыцыі. І калі-б мы, як роўныя й свабодныя народы, сустрэліся з Вамі ў якімсь аб'яднаньні ці блёку падсавецкіх народаў, то там мы былі-б ня ворагамі, а паважаючымі адзін другога чэснымі саюзнікамі».

Прайшло колькі часу й «адзінанедзялімцы» паслухалі закліку й «перагледзілі» пазыцыі, бо выпусьцілі на сцэну сьпярша трох «украінцаў» з гістэрычным артыкулам «Нельга маўчаць», а ўжо пазьней, пасьля гэтай артылерыйскай падрыхтоўкі, 2-га красавіка (праз месяц пасьля выступленьня А. Гуд-ий) выскачыў з «адказам» ведамы «Андруша» Дікій! Тут ужо ён «даў дыхту». На сцэну зноў выплылі й галычане й Бандэра з Мельнікам і напужаныя імі «сходнякі», а навет Праскі маніфэст Уласава, што таксама «прызнаў права» на «самавызначэньне»! Не абыйшлося й бяз таго, каб гіранічна не адазвацца аб Выконным Органе Украінскай Народнай Рады, як «Правительстве Соборной Украйны» ў маленькім нямецкім гарадку Аўгсбурзе. У заключэньне-ж сваіх гарцаў А. Дікій «раіць» сп-ру А. Гуд-ий ня блытаць двух паняцьцяў: «патрыёт» і «самастыйнік», бо, паводля ягонай запраўды хвараблівa-дзікай тэндэнцыі, усе пералічаныя ім украінскія дзеячы, як др. Баран, др. Вітвіцкі, Добрянскі й іншыя, ня могуць быць патрыётамі, бо яны — вуніяты!

Каб стаўся цуд і гэтыя людзі далучыліся да «фэдэралістых» тыпу А. Дікага, о, тагды-б яны напэўна былі «патрыётамі»! Вось вам лёгіка, прынцыповасьць, дэмакратызм, аб'ектыўнасьць «господ патрыётаў-фэдэралістых». Ці-ж можна пасьля гэтага паважна з падобнымі тыпамі гутарыць? Годзі ўжо слухаць калыханку пра розныя «правы» на самавызначэньне й плебісцыты! Падыходзіць да справы трэба станоўка й патрабаваць станоўкага адказу: хочуць расейцы запраўднага раўнапраўнага ўдзелу ў вагульным змаганьні з бальшавізмам ці не. Калі так, то згода, калі-ж не, то хай памятуюць, што кажны падсавецкі народ чакае той часіны, каб як найхутчэй вызваліцца спад «апекі» Масквы. І, як ужо сказаў успамінаны намі А. Гуд-ий: «Кажны аб'ектыўна й цьвяроза думаючы чалавек павінен зразумець, што адразу-ж пасьля распаду бальшавізму дадзеная тэрыторыя стыхійна распадзецца на паасобныя нацыянальныя гаспадарствы й ніхто гэты працэс стрымаць не патрапіць».

Зусім слушна адзін із украінцаў у лісьце да рэдакцыі «Н. Р. С.» кажа: «Вы ставіце справу прыкладна гэтак: — нацыянальныя мяншыні павінны ВЫХОДЗІЦЬ АБО АСТАВАЦЦА; — мы, нацыяналістыя ставім справу інакш: — УВАХОДЗІЦЬ ЦІ НЯ УВАХОДЗІЦЬ. Мы зусім не адкідаем, што справу гэтую павінен вырашыць сам народ, але перад гэтым трэба яму вярнуць ягоную СВАБОДУ, адабраную й царскай Расеяй і бальшавікамі».

Ці дойдзе калі-колечы да гэтага разуменьня й ацьвяразеньня расейская палітычная эміграцыя — пакажа будучыня, а цяпер, пакуль гэтага няма, мы павінны вельмі ўважна сачыць за ўсялякімі ходамі вялікадзяржаўных шавіністых і не даваць спуску, раскрываючы на кажным кроку іхныя нясумленныя махінацыі, бо спадзявацца можна ўсяго.

Нью-Ёрк, у красавіку 1952 г.

Андрэй Сьвіслацкі

Хрыстос Уваскрос — Уваскрэсьне Беларусь!

(Заканчэньне)

фізычна, у сфэры духа й ідэі аказаўся сільнейшым за свайго ворага.

Гэтым паказаў беларускі народ нязьнішчальныя ў сабе задаткі жыцьця. Мы ведаем, што ўсё здаровае, творчае, здольнае да прагрэсу й жыцьця, назаўсёды памерці ня можа. Ня могуць памерці жывыя, прагрэсыўныя й творчыя ідэі. Ня можа нічога памерці ў прыродзе, што толькі здольнае жыць. Ня могуць загінуць на сьвеце Дабро, Праўда й Справядлівасьць. Усе гэтыя вартасьці могуць быць пераможанымі толькі часова людзкою злосьцю ці сілаю матарыяльнаю, але канчальная перамога астаецца заўсёды за імі. Такі ўжо закон прыроды й людзкога жыцьця.

Гэтак сама й беларускі народ сваёю часоваю сьмерцю паканае сьмерць, бо мае ён у сабе ўсе задаткі несьмяротнасьці. Гэта зьяўляецца найвялікшай догмай нашай нацыянальнай веры.

Хрыстос Уваскрос — уваскрэсьне Беларусь!

Я. К.

Новыя рэвэляцыі аб Катыні

Ведамая ўсім з 1943 году сэнсацыя, якой немцы прыдалі вялікае прапагандовае значэньне — знаход 4.678 польскіх ахвіцэраў у брацкіх магілах каля Катыня, расстрэленых аддзелямі НКВД, была даволі шырака камэнтаваная ў сваім часе ў нямецкай, як і наагул заходня-эўрапэйскай прэсе. Пасьля заняцьця бальшавікамі Смаленску, камісыя НКВД пачала нанава дасьледваньне справы масавай масакры польскіх ахвіцэраў у катынскім лесе. Як і трэба было спадзявацца, вінаватымі аказаліся ў выніках бальшавіцкага «сьледзтва» толькі немцы.

Кончылася вайна й, здавалася, справа Катыну была пахаваная нараўні із шмат іншымі справамі, пакрытымі рознымі трактатамі, палітычнай недалёказоркасьцю заходняга дэмакратычнага сьвету. Але вось мінулі гады й справа Катыну ажыла нанова. Амэрыканскі парлямант стварыў адумысловую кангрэсовую камісыю дзеля больш дакладнага расьсьледаваньня катынскага праступку й устанаўленьня вінаватага нялюдзкай масакры. Гэтая камісыя, як ведама, зьвярнулася ў савецкую амбасаду з просьбай даць апінію савецкага ўраду ў гэтай справе, што савецкая амбасада лічыла патрэбным прыняць як абразу для Савецкага Саюзу.

У сувязі з ажыўленьнем катынскай справы, у сусьветнай прэсе паяўляюцца на гэтую тэму многія цікавыя заўвагі, прыпушчэньні, навет свайго роду «рэвэляцыі». Гэтак, прыкладам, бэльгійскі журнал у французскай мове «L'unité Belge» за 8 сакавіка зьмяшчае цікавы артыкул Г. Бесядоўскага п. н. «Катынь», у якім аўтар падае ўзапраўды рэвэляцыйныя весткі. Ён піша: «Рапарт НКВД з 26 студзеня 1944 г. адкрывае частку праўды. У рапарце гаворыцца аб трупах, якіх закапаньне ў зямлю адбылося ў розных пэрыядах часу, адлеглых ад сябе прыблізна ад 18 месяцаў да двух гадоў».

Аўтар робіць з гэтага наступныя вывады: 1.500 польскіх ахвіцэраў было расстрэляных цераз НКВД у 1940-41 г. г. і 3.000 нямецкім Гэстапо ў 1942 г. Калі-б гэтыя вывады Бесядоўскага ўзапраўды пацьвердзіліся, дык праступнае супрацоўніцтва дзьвюх блізьнячых установаў было-б відавочнае.

Чаму адны й другія выбралі якраз Катынь? На гэта аўтар дае адказ, што Катынскі лес ведамы ў гісторыі, як месца масавых эгзэкуцыяў ваеннапалонных у часы шматлікіх войнаў паміж тагачаснай Польшчай (тут аўтар пад Польшчай разумее «Карону» й Вялікае Княства Літоўскае — беларускую дзяржаву ў мінулым) і, як піша аўтар, магчыма, што Катынь, прасочаны наскрозь крывёй, прыцягнуў сваім флюідам ваенных праступнікаў Гэстапо й НКВД.

У далейшым аўтар раскрывае яшчэ адну праўду, якую ён даведаўся ад ад наго палоннага капітана НКВД Івана Чэрнышэва, зь якім ён быў разам у палоне ў лягеры Орыні, дзе было, апрача яго, яшчэ каля 750 савецкіх ахвіцэраў НКВД. Бальшыня зь іх згінула ў лягеры. Чэрнышэў, будучы раненым падчас спробы ўцёкаў зь лягеру й не надзеючыся перажыць раненьне, расказаў наступнае: «Нашая катынская камісыя раскопвала ямы выключна ў мясцох, наперад абазначаных. Мне было даручана паказваць месцы раскопак паводля карты, якую я атрымаў ад генэрала паддадзелаў НКВД Максімава».

Аўтар робіць вывад, што Гэстапо раскопвала магілы НКВД, а НКВД — магілы Гэстапо. Як адныя, гэтак і другія зьяўляюцца такімі-ж самымі ваеннымі праступнікамі. Нам трудна сяньня сказаць нешта канкрэтнае на гэтую тэму, але будзем спадзявацца, што раней ці пазьней віноўнікі нячуванага ў сьвеце праступку будуць дакладна й канчальна ўстаноўленыя й належна пакараныя.

С. Мінчук

Паданьне аб таямнічым сьвятле

«Ёсьць чары ў забытым, старадаўным,
Прыемна нам сталецьцяў пыл страхнуць.»

Максім Багдановіч

Калісьці ў Віцебску, на Катэдральным пляцы, стаяла высокая, прыгожая званіца, самы большы звон якой звуўся — «Леў Сапега». Гэты звон займеў сваю назву ад імя векапомнага канцлера Вялікага Княства Лілоўскага, якога барэльеф на ім быў адлітаваны. Штогод, у часе Вялікоднае Божае Службы, калі «Леў Сапега», разам зь пяцёркай іншых мілагучных званоў, радасна абвяшчаў гадзіну Сьветлага Хрыстовага Уваскрашэньня, у вокнах калідору, што злучаў старадаўны будынак архірэйскага дому зь яшчэ больш старажытняй катэдрай у імя Аляксея чалавека Божага, нечакана запальвалася сьвятло. Гэтае таямнічае сьвятло бачылі віцебляне, як з боку Альгэрдавае гары ці Ламіхі, гэтак і з Валатоўкаў, што разьлягліся з процілеглага боку, на стромкім беразе ручаю Дунай. А найбольш адважныя зь іх, якія падыходзілі да самых вокнаў калідору, потым узварушана апавядалі.

Адразу пасьля першага гуку «Льва Сапегі» з архірэйскіх пакояў праз зачыненыя дзьверы выходзіў у калідор апошні полацкі й віцебскі грэка-вуніяцкі архіяпіскап Ёзафат Булгак. На ім былі ўласьцівыя ягонай годнасьці сьвяточныя белыя вялікоднія шаты-сакос і амафор, на галаве мітра, на грудзёх панагія й крыж, а ў руках трымаў ён запаленыя дыкірый і трыкірый. У ягоных задуменных вачох адбіваўся сьвет нятутэйшы, тагабочны. Высокага росту, з тонкімі рысамі аскэтычнага твару, архіяпіскап Ёзафат нячутнай урачыстай хадой ішоў па калідору. За крок перад дзьвярмі ў катэдру ён спыняўся і, высока ўздымаючы схрышчоныя дыкірый і трыкірый, тройчы багаслаўляў сыноў і ўнукаў свае колішняе паствы, вітаючы іх адначасна радаснымі для кажнага хрысьціянскага сэрца словамі:

Хрыстос Васкрос!

А потым вяртаўся назад у архірэйскія пакоі, каб зьявіцца зноў праз год у наступную Вялікоднюю Ноч.

І гэтак адбывалася на працягу шматлікіх гадоў, аж пакуль у Віцебск ня прыехаў япіскап Сава Ціхаміраў. Ён загадаў разбурыць званіцу й разьбіць «Льва Сапегу», а зь ягоных аскепкаў адлітаваць у Валдаі новы звон з барэльефам імпэратара. У гонар нябеснага патрона гэтага імпэратара ён пераасьвяціў і катэдру, а перад гэтым значна перарабіў яе. Паверх абразоў і арнамэнтаў, натхненае работы магілёўскіх мастакоў, валадзімерскія маляры намаляваліі сьвятых, дагэтуль віцеблянам невядомых. Яраслаўскія архітэктары ўкарацілі пазорныя барочныя вежы і, скінуўшы іхнія купалы, што нагадвалі лілеі, замянілі іх расейскімі, да цыбулінаў падобнымі макаўкамі. А на варце ўсяго гэтага перайменаванага й перароблена стаў ля дзьвярэй бабінцу гарадавы, прагнаўшы ўсіх убогіх жабракоў, што пашлі сьпяваючы псальмы пра Аляксея чалавека Божага. У часе сьвятаў ён прапушчаў у катэдру толькі добра апранутых і абутых.

У тую самую Вялікоднюю Ноч людзі віцебскія, паспалітыя, простыя праваслаўныя не патрапілі ў катэдру. Кажамякі і шаўцы сустракалі Вялікдзень Сьветлага Хрыстовага Ўваскрашэньня ў сьвятога Юрага на Юр'евай горцы, ганчары-гаршкалепы ў Дабравешчаньня на Замкавай вуліцы, цесьляры й стальмахі ў Прарока Ільлі на Задзьвіньні, кавалі й муляры ў Івана Хрысьціцеля на Задунаўі, стырнікі стругаў і плытагоны ў Чорнай Тройцы на Пескаваціку.

У тую самую Вялікоднюю Ноч таксама запалілася ў калідоры архірэйскага дому таямнічае сьвятло й адразу-ж, як пошуг маланкі, пагасла. Тыя, што былі каля вокнаў, бачылі, як архіяпіскап Ёзафат паранейшаму выйшаў з архірэйскіх пакояў, і раптам ягоныя рукі з даўгімі тонкімі пальцамі задрыжэлі. Дыкірый і трыкірый упалі на падлогу й пагасьлі. А зь цемры, што паглынула сьвятло, пачуўся поўны смутку голас:

«Успамяні, Госпадзе, што над намі
здарылася;
зьвярні ўвагу і паглядзі на нас
паруганых».*)

З таго часу ніхто зь віцеблянаў ні з боку Альгэрдавае гары ці Ламіхі, ні з боку Валатоўкаў, што на Задунаўі, не заўважваў больш гэтага таямнічага сьвятла. І з таго часу ніхто зь іх ня бачыў, каб у Вялікоднюю Ноч ішоў да катэдры архіяпіскап Ёзафат Булгак, што належаў да старога беларускага. ахутанага славай, дваранскага роду.

Можа каму-небудзь і не спадабаецца тое таямнічае сьвятло, якое калісьці запальвалася ў родным тысячагадовым Віцебску? А можа хто-небудзь не дасьць веры гэтаму цудоўнаму здарэньню, якое некалі пачуў я ад віцебскіх старцаў-жабракоў? Мяне гэтае мала турбуе. За тое сам я зь дзіцячай непасрэднай верай стаўлюся да паданьняў, якія стварыў у стагодьдзі свайго ліхалецьця і ў хвіліны шчасьця мой народ. І з гэтай глыбокай і чыстай верай мне жыць ня так цяжка й ня гэтак балюча дыхаць.

3. 11. 1951. **Юрка Віцьбіч**

*) Плач Ярміі — 5, 1.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Уладыслау Галубок — Народны Артысты Беларусі

Уладыслаў Галубок належыў да старэйшага пакаленьня беларускіх нацыянальных дзеячоў.

Радзіўся Галубок у сям'і чыгуначніка ў Менску, у доме пры Койданаўскім тракце. Да рэвалюцыі ён, як і яго бацька, працаваў на чыгунцы. Прырода шчодра надзяліла Галубка ўсебаковымі здольнасьцямі. Але ў часы царскай улады ягоны талент ня мог расьцьвісьці ў поўнай прыгожасьці. Усё беларускае нацыянальнае было тады прыглушана й зацісьнута, усякая праца па падняцьцю нацыянальнае сьведамасьці сярод нашага народу жорстка каралася. Толькі «Наша Ніва», супрацоўнікам якой быў малады Галубок, падтрымлівала нацыянальны дух і веру ў лепшую будучыню. Яна гучэла, як той вечавы звон. Галубок ведаў, што ў тагачасных умовах усе стараньні дзеля арганізацыі беларускай тэатральнай трупы не дадуць жаданых вынікаў і будуць разьбітыя.

Таму да лютаўскай рэвалюцыі Галубок як-бы набіраўся сілаў, вывучаў жыцьцё народу. Ён жыў сярод работнікаў чыгуначнікаў, падтрымліваў сталую сувязь зь вёскамі з пад Менску. Галубок выношваў сваю мрою-думку, якім-бы гэта чынам знайсьці найкарацейшы шлях-дарогу, каб падняць нацыянальную сьведамасьць беларуса, каб ён адчуў сябе чалавекам, а не адвечным «тутэйшым» паслухмянцам пана, урадніка, любой рангі царскага чыноўніка. Галубок хацеў, каб сьведамасьць народу паднялася на такую вышыню, калі беларус ня будзе ня толькі цурацца сваей мовы, песьні, музыкі, мінуўшчыні, але й будзе пераканаты, што ўсё нашае беларускае далёка не апошняе, ня горшае, а наадварот, што мы маем вялікую слаўную гісторыю, багатую мову, цудоўную песьню, музыку, што беларусы маюць права на самастойное незалежнае існаваньне ў сям'і іншых народаў. Галубок прыйшоў да выснаву, што адным з магутных сродкаў падняцьця нацыянальнай сьведамасьці будзе вандроўны народны беларускі тэатр, які зможа ахапіць дзесяткі тысячаў народных масаў па ўсей Беларусі. Вось-жа дзеля гэтага ён і гарэў жаданьнем арганізаваць такі тэатр.

Лютаўская рэвалюцыя стварыла ўмовы й шырокія магчымасьці для дзейнай і карыснай працы Галубка. Агульнае разбурэньне векавога ўкладу, вялізарныя палітычныя падзеі, партыйнае змаганьне, развал вялікай расейскай арміі, войстра высунутыя беларускія нацыянальныя праблемы — у такім стане апыніўся пасьля рэвалюцыі прыфронтовы горад Менск — сэрца Беларусі.

Аднак партыі й іх змаганьне мала цікавілі Галубка. Ён бачыў, што прыйшоў час, калі ягоныя мроі-думкі могуць ажыцьцявіцца. З надзвычайнай энэргіяй, падабраўшы некалькі энтузыястых, разам із сваею жонкаю арганізуе трупу. Першыя паказы адбыліся ў клюбе чыгуначнікаў у Менску. Паказы мелі добры пасьпех. Гэта яшчэ больш пераканала Галубка, што ён выбраў зусім правільны шлях сваей дзейнасьці. Праўда, на самым пачатку працы сустрэліся, на першы пагляд, непераможныя цяжкасьці. Ня было прыстасаваных сцэнаў, самых неабходных дэкарацыяў, грыму, вопраткі, рэквізытаў. Але Галубка цяжкасьці ня спужалі, энтузыязм, аддонасьць ідэі перамаглі ўсе перашкоды.

За кароткі час беларуская трупа Галубка стала вельмі папулярнай у Менску. У пераходныя гады розных акупацыяў яму ўдалося ўберагчы трупу ад разгрому. Зь бегам часу трупу пачалі запрашаць у іншыя гарады Беларусі. Даваліся паказы ў роднай беларускай мове з жыцьця народу, паказы зь песьнямі, скокамі й музыкай.

Аднак Галубок з самага пачатку сваей дзейнасьці адчуў абмежаванасьць і недастатковасьць тэатральнага рэпэртуару для сваей трупы. Як ведама, на сцэне можна было бачыць тады «Зьбянтэжанага Саўку», «Чорт і Баба», «Паўлінку», — амаль і ўсё. Галубок ня кінуўся на прасьцейшы й лягчэйшы шлях скарыстаньня ў пекакладзе расейскіх ці іншых п'есаў. Трэба было тварыць самастойны беларускі рэпэртуар, трэба было мець п'есы з народнага жыцьця, якія былі-б блізкімі й зразумелымі беларускім масам.

Спасярод нашаніўскіх пісьменьнікаў таго часу ня было драматургаў. Вось-жа за гэтую працу, цяжкую й адказную, узяўся сам Галубок. Рэпэртуар паступова абагаціўся арыгінальнымі драмамі з жыцьця народу, якія напісаў сам Галубок для свайго тэатру. Найбольш папулярнымі драмамі былі: «Падкідыш», «Залаты Бог» і іншыя. Пашырылася й праграма выконваных трупаю песьняў. Гэта быў росквіт дзейнасьці ведамага таленавітага кампазытара й зьбіральніка беларускіх народных песьняў Тэраўскага. Пановаму загучэла народная песьня ў вапрацоўцы незабытага Тэраўскага. Ці магло зацерціся ўражаньне беларуса хоць раз пабачыўшы й пачуўшы цудоўнае «На Купальле» ў пастаноўцы Міровіча з народнымі песьнямі апрацоўкі Тэраўскага на лібрэтто Міхася Чарота! Уражаньне заставалася на ўсё жыцьцё. Вось-жа з гэтай залатой скарбніцы Тэраўскага чэрпаў наш Галубок песьні й нёс іх свайму гледачу.

Галубок у сваей трупе зарганізаваў і спэцыяльныя музычныя выступленьні. Выконваліся на цымбалах, жалейцы, скрыпцы, акордэоне беларускія песьні й скокавая музыка. Асабліва прыгожым было трыо трупы. Сам Галубок у цэнтры з акордэонам, цымбалісты й скрыпач па бакох. Трыо карысталася нязьменным пасьпехам. К таму часу трупа ўжо мела добрую каляровую нацыянальную вопратку. Пры першай магчымасьці трупа вышла за межы Менску. Галубка ўжо зналі й ягоныя паказы ў Магілеве, Віцебску, Полацку, Слуцку, Воршы. Завітаў ён з трупаю й у некаторыя мястэчкі й вялікшыя вёскі.

У 1925 годзе Галубок зрабіў вельмі карыснае першае турнэ па Гомельшчыне. Трэба адзначыць, што ў той час Гомельшчына яшчэ ўваходзіла ў склад РСФСР. Паказы адбыліся ў Гомелі ў вялікім клюбе чыгуначнікаў. Выступала трупа ў Нова-Беліцы, Рэчыцы, Хойніках, Чачэрску, Добрушу — цэнтры папяровай прамысловасьці. Трапіў Галубок і ў Бранск, наведаў Клінцы, Старадуб, Навазыбкаў. Ува ўсіх гэтых мясцох паказы ягоныя карысталіся нязьменным пасьпехам, сымпатыяй і прыязьню. Гэтае турнэ па Гомельшчыне мела потым вялізарнае значэньне, бо паказы Галубка былі моцнай прычынай правядзеньня г. зв. «плебісцыту» аб далучэньні Гомельшчыны да Беларусі.

Працу Галубку даводзілася праводзіць часта ў нязвычайна цяжкіх умовах, асабліва калі трупа наведвала мястэчка або вёску. Трудна было знайсьці хоць прымітыўную сцэну, арганізаваць асьвятленьне й г. д. Але гэта ніколі не палохала Галубка, ён быў пасьлядоўным, бо ведаў, што паказ трупы шырыць сьведамасьць народных масаў. Пры адсутнасьці адпаведнага памяшчэньня паказ адбываўся ў гумне, а не, то проста на плошчы або на выгане на роўным месцы пад адкрытым небам. Моладзь зь вялікай ахвотай зносіла дошкі, бярвенні, шчыра працуючы над пабудаваньнем і абсталяваньнем сцэны. Праведаўшы, што мястэчка або вёску наведае Галубок з трупаю, сяляне акалічных вёсак, пажылыя цэлымі сем'ямі, а моладзь пагалоўна, навет з далёкай адлегласьці, сьпяшаліся пабачыць цікавыя паказы, пачуць беларускую песьню, паглядзець, як фацка на сцэне скачуць лявоніху, крыжачка, ды пачуць заліхвацкую вясельную музыку, ад якой — самі ногі холзяць. Усё гэта для вёскі было дзіўна-цудоўным, ня бачаным. Сам-жа гэты чарадзей Галубок быў перад усімі. Ён дае ўказаньні, як будаваць сцэну, рабіць абсталяваньне, развешваць дэкарацыі.

Артыстыя, як мурашкі, рыхтуюцца да паказу. Але галоўнае паказ, якога чакаюць зь нецярплівасьцю. Галубок і на сцэне першы, бо яму прыходзіцца выконваць галоўную ролю ў народнай драме ягонага-ж пяра. Ён-жа ў прыгожай вышываной беларускай сарочцы вясёлы, із заўсёды ветлым тварам, выступае ў трыо на акордыоне. Глядач захоплены, воплескам, выклікам няма канца. Сяляне хочаць, каб артыстыя й сам Галубок яшчэ й яшчэ раз паялі, іграці, скакалі.

Звычайна пасьля такіх шчырых, непасрэдных дачыненьняў да паказу Галубок із сваімі супрацоўнікамі забываў увесь цяжар сваей ахвярнай працы. Артыстыя гэтай запраўды народнай трупы ня мелі й не маглі мець спэцыяльна вузкіх амплюа. У першую чаргу патрэбная была адданасьць справе. Артысты Галубка павінен быў умець выканаць сваю ролю, быць сьпеваком і музыкай, танцорам і грымёрам, быць гатовым пры няспрыяючых умовах пехатой прайсьці 10—15 клм. ад чыгуначнай станцыі да месца паказу ў якоенебудзь глухое мястэчка ці вёску, нясучы на сабе музычныя інструмэнты й дэкарацыі. Павячэраць гарачай бульбай зь кіслым малаком ды пераначаваць дзе-небудзь у гумне на сене ў покат. У такіх выпадках Галубок падбадзёрваў сваіх артыстых, ён казаў: Браткі, трэба яшчэ пацярпець, скора прыйдзе час, калі нас самаходамі будуць вазіць!»

Аднак у бальшыні мясцовасьцяў, куды пападаў Галубок, удзячныя гледачы запрашалі артыстых на вельмі сытную вячэру й ад шчырага сэрца частавалі ўсімі дарамі вёскі, а спаць клалі на высокіх мяккіх падушках, якія клапатлівая маці ўжо прыгатавала на пасаг сваей любай дачушцы. Ды ўжо не пехатой цягнулі на сабе артытыя тэатральны рэквізыт да чыгуначнай станцыі.

Прыезд Галубка пакідаў пасьля сьлед. Вёска, мястэчка, месяцамі жыло гутаркамі аб паказах, аб выкананьні падслуханых песьняў, скокаў. Звычайна там, як грыбы пасьля дажджу, арганізоўваліся драматычныя й харавыя гурткі з моладзі, якія закідвалі Галубка лістамі, просячы аб прысылцы п'есаў, песьняў, грыму, або каб ён даў якую-небудзь параду.

На Беларусі У. Галубок першым, на прапанову тагачаснага наркома асьветы Ігнатоўскага артымаў ад ураду БССР годнасьць народнага артыстага. Гэтую годнасьць ён заслужыў па праву. Тэатр Галубка бязумоўна меў падтрыманьне з боку беларускіх нацыяналістых. Але здаралася й так, калі пры значных сродках, якія адпускаліся тэатрам, Галубка абміналі. Пасьля арышту кіраўніка мастацтваў у наркамасьветы Я. Дылы гэтае становішча ўзначаліў Ільля Гурскі. Яму хацелася зрабіць скорую й бліскучую кар'еру савецкага пісьменьніка, які добра ведае мастацкую справу. У 1930 годзе ён узяўся па заказу напісаць п'есу супраць нацдэмаў. Малаздольны пісьменьнік Гурскі ўзапраўды напісаў бяздарны пашквіль. Услужлівае кіраўніцтва першага беларускага тэатру ўзялося паставіць гэтую хаўтуру. Гурскі паставіў сабе за мэту скампраміваць на сцэне беларускіх нацыянальных дзеячоў. Асабліва пастараўся Гурскі ачарніць бытавы бок жыцьця нацыянальных пісьменьнікаў і ў першую чаргу Янку Купалу. На пастаноўку гэтай бяздарнай пусьценькай п'есы былі ўхлопаны ўсе сродкі, што адпускаліся тэатрам. Аднак ні матарыяльны бок, ні стараньні рэжысуры не памаглі бяздарнай п'есе. П'еса Гурскага бяз звычайнай у такіх выпадках шуміхі, крытыкі ў друку ды прызнаньня памылак пісьменьнікам, была ціхенька зьнятая з рэпэртуару. Дык дзе-ж было калі думаць ды апякавацца Гурскаму нейкім вандроўным тэатрам Галубка!

Дзіўная асабістасьць быў народны артысты Галубок. Заўсёды заняты артыстычна-арганізацыйнай працай у тэатры, ён пісаў п'есы для тэатру, маляваў сваёю собскаю рукою дэкарацыі для паказаў, і ён-жа знаходзіў час, каб таксама аддацца яшчэ аднэй галіне мастацтва — маляваньню. Ягоным жанрам у маляваньні быў краявід Беларусі. Будучы з трупаю ў Слуцку, ён нанёс на палатно вельмі прыгожы куток гэтага старадаўнага беларускага гораду — «Мост праз рэчку Случ». Калі Галубок трапіў у Гомельшчыну, у далёка адлеглы ад чыгункі Чэчэрск, ён намаляваў там вельмі прыгожы эцюд — хату й кузьню каваля, якая стаіць можа й цяпер на высокім беразе прыгожага Сожа ў вакольцы Чэчэрску. Вандруючы па Гомельшчыне, ужо ў Веткаўскім раёне Галубок алейнымі хварбамі стварыў салідны малюнак — Хваёвы бор, а ў ім лясное возера ў ціхі сонечны летні дзень. Заехаўшы з трупаю на польскую мяжу ў глухое мястэчка Вушач на Віцебшчыне, Галубок намаляваў краявід: шырокая дарога-шлях на роўнай мясцовасьці ў бок Заходняй Беларусі, на небасхіле шляхбаўм і на правым баку дарогі прымежны слуп. Сымбалічны малюнак! Галубок як-бы гэткім шляхам імкнуўся перадаць беларускую песьню сваім братом беларусам за гэты хвальшывы кардон, які разразаў цела нашае бацькаўшчыны.

Свае малюнкі Галубок любіў раздаваць сваім блізкім добрым прыяцелям на ўспамін. Гэтыя малюнкі ён любіў перадаць у рамцы сваей Галубкоўскай работы. Вось-жа, калі была арганізаваная выстаўка ягоных працаў, дык прыйшлося малюнкі зьбіраць па кватэрах ягоных сяброў. Па заканчэньні выстаўкі малюнкі ўзноў упрыгожвалі кватэры яго дабрадзеяў.

Пасьля трыццатых гадоў да кіпучай дзейнасьці Галубка пачалі прыглядацца «адпаведныя ворганы». Асьвету на Беларусі ўзначальваў у той час былы валасны пісар, ён-жа й «акадэмік» Беларускай Акадэміі Навук. Такую кар'еру ён зрабіў вельмі проста. Будучы спачатку кіраўніком прафэсыянальнага саюзу асьветнікаў, ён, вычуваючы «свячасовасьць», падняў траўлю супраць пісьменьнікаў нацыяналістых. Гэта быў час першага туру арыштаў. У першую чаргу былі ўзятыя пад абстрэл, хоць і вельмі дробнымі стрэламі, але зь вялікім трэскам і шумам Янка Купала й Цішка Гартны. Цішку Гартнаму ў розных адменах рабіліся закіды з прычыны ягонага выступленьня з заклікам «пакінуць карыстацца ў беларускіх тэатрах аб'едкамі маскоўскай сцэны». Гэты заклік вельмі дорага абыйшоўся Цішку Гартнаму. А ў творах Я. Купалы вышуквалі выражэньні або навет пасобныя словы, за якія можна было-б прычапіцца й абвінаваціць пісьменьніка ў нацдэмаўшчыне.

Зь беларускай літаратуры, тэатраў бязьлітасна, па барбарску вычышчалася ўсё, што мела хоць нейкі намёк на самабытнае. Зьняты былі з рэпэртуару першага беларускага тэатру «На Купальле», «Кастусь Каліноўскі» й іншыя п'есы. Зьнішчаны былі партрэты й статуэткі Скарыны, Каліноўскага. З франтону будынку Менскага тэатру былі зьнятыя бюсты Я. Купалы й Я. Коласа. Па загаду кіраўніка мастацтваў артыстым беларускага ансамблю народнай песьні й музыкі замянілі нацыянальныя сарочкі неймікі дэкадэнцкімі вопраткамі.

Не абмінулі гэтыя «рэформы» й Галубка з трупаю. Самабытныя Галубкоўскія драмы заменены былі новымі, перакладнымі расейскага паходжаньня Тру

(Заканчэньне на 4 балоне)

ЯКУБ КОЛАС

НОВАЯ ЗЯМЛЯ

ПАЭМА

(13)

XVI

ВЕЧАРАМІ

Малюнкі родныя і зьявы!
Як вы мне любы, як цікавы!
Як часта мілай чарадою
Вы ўстаеце перада мною!
І так панадна сьмеяцеся
Жывою баграю на лесе
І злотаблескімі снапамі
Праменьняў-стрэлаў над палямі,
І брылянцістаю расою,
Калі гарачаю касою
Скрозь лісьця сетачкі-аконцы
На ёй зазьзяе ціха сонца,
Яе так песьціць, так кахае,
Па ёй вясёлкі рассыпае!
Я бачу роўныя пакаты
Палёў за Нёмнам і іх шаты —
Аўсоў палоскі, лавы жыта,
Што морам золата разьліта;
І грэчак белыя абрусы,
І лесу два крылы, як вусы,
І цёмны роў, вадой прабіты,
Такі зацяты і сярдзіты;
Ялоўцаў шэрыя аблогі,
Дзе белы мох, сівец убогі
Пясочак жоўты засьцілаюць
І дзе зайцы прыпынак маюць.
Я чую шум разнагалосы
Лясоў, лугоў, дзе звоняць косы
У часе дружнай касавіцы;
Я чую громы навальніцы,
І шум глухі буйных дажджоў,
І песьні звонкія палёў,
І ціхі плач ускрай магілы.
Даўно заціх іх голас мілы.
Даўно ўсё змоўкла і прапала,
Іх толькі памяць захавала.
Але нявіднымі ніцямі
Я моцна-моцна зьвязан з вамі,
Малюнкі роднае краіны!
Эх, зарасьлі вы, пуцявіны,
У гэты мілы мой куточак,
Дзе ныне жоўценькі пясочак
Пад летнім сонцам, пад сьпякотай
І зьзяе смутнай пазалотай
Над самым Нёмнам срэбраводным,
Так сэрцу блізкім-блізкім, родным.
І зарасьлі не палынамі,
Не крапівой, не драсянамі,
Не чаратом, не лебядою, —
А беларускаю бядою.
Ды покі будзе сэрца біцца,
Яно ня зможа пагадзіцца
Ні з гэтым гвалтам, ні зь бядою
Над нашай роднаю зямлёю...
Эх, мілы край адвечнай мукі!
Праклятыя будзьце, вусны, рукі,
Што на цябе ланцуг кавалі!
І ў твар зьняважліва плявалі!
Няхай агонь і жар пакуты
Навекі спаліць зьдзек той люты,
Які справедку там пануе,
Над тым, хто родны скарб шануе
І хто ўсім сэрцам і душою
Застацца хоча сам сабою.
Жыві-ж, наш край! Няхай надзея
Гарыць у сэрцы і мацнее,
Што хоць ня мы, дык нашы дзеці
Убачаць цэльным цябе ў сьвеце!
Алесь на дзеле праканаўся,
Што ён дарэмна марнаваўся,
І што ўжо больш няма збавеньня,
Як толькі ўзяцца за вучэньне,
Як гэты клопат ні марудны.
І што-ж? закон быў ня так трудны.
Ўжо па тэй аднэй прычыне,
Што ён запісан быў на сьпіне
(А ў сэрца ўложан сам сабою),
І ўсё пашло сваей чаргою.
Цяклі дзянькі, ды йшлі нядзелі,
І час тут вольны хлопцы мелі,
Вучылісь толькі да абеду,
Вучылісь нават не бязь сьледу.
І Костусь, мушу я прызнацца,
Ўжо ўмеў на дошцы расьпісацца,
Што вельмі цешыла Міхала
І гонар бацькаў падымала.
Удзень, як лекцыі канчалі,
На рэчку хлопцы выбягалі
Крыху пакоўзацца па лёдзе
Ці так пабегаць на свабодзе,
У сьнег залезьці па калена,
А то насілі козам сена —
Ў зьвярынцы козы зімавалі —
І ім палонкі прасякалі.
І сам дарэктар клышаногі
Ня горш за вучняў бег з дарогі,
Гайсаў па сьнезе, распускаўся
І штурхялямі захапляўся.
А як надарыцца часамі
Яму спаткацца там з казамі,
Тады крычэў ён благім матам,
Тады рабіўся ён вар'ятам, —
Такая радасьць пашыбала,
Так хвалявала, захапляла!
І гэту радасьць, міг шчасьлівы,
Выказваў крыкам праразьлівым:
— А я-я-яй! А я-я-яй! —
Крычэў, хоць вушы затыкай.
Другі раз хлопцы валяць валам
Ў гумно да дзядзькі ўсім кагалам.
На току ў дзядзькі, бы ў сьвятліцы,
Маркотна сьвеціць блеск газьніцы;
Дрыжыць агоньчык сіратліва,
Убокі ходзіць палахліва.
На месьце ўсё тут і прыбрана,
Так гладка ўсё дапасавана.
А тыя-ж граблі ці цапочкі!
Ну, толькі цешыць імі вочкі!
У рукі возьмеш — працы хочуць,
У дзела пусьціш — зарагочуць!
А як наш дзядзька час там бавіць!...
Ён не працуе — ён мшу правіць!
Вось як жывога, дзядзьку бачу,
Я тут партрэт яго зазначу.
Ён нявысок, ня надта ёмак,
Ды карчавіты і няўломак,
А волас мае цёмна-русы,
І зухаўскія яго вусы:
У меру доўгі, густаваты,
У гору чуць канцы падняты;
А вочы шэры, невялічкі,
Глядзяць прыветна, як сунічкі,
Але раптоўна і адразу
Не расчытаеш іх выразу:
То сьмех, то хітрасьць зь іх бліскае
То дабрата, але якая!
А нос... я глянуць мушу ў неба,
Бо не патраплю, як пачаць
І з чым нос дзядзькаў параўнаць,
Каб выйшоў ён такі, як трэба:
Ну, нос кароткі і таўсматы,
Ды досыць спрытны, хоць кірпаты.
Антось наш дбалы, акуратны,
А пры рабоце які здатны!
Што ні замысьліць, то ўсё зробіць
І так прыгоніць, так аздобіць,
Што і для вока нават міла.
І ўсё выразна гаварыла.
Што ён ня толькі гаспадар,
Але й прыроджаны штукар,
Якіх на сьвеце ня так многа,
За дзядзьку людзі просяць Бога:
Каму ён толькі ня спрыяе,
Каго зь бяды ня вызваляе!
У дзядзькі цэлы спрат запасаў —
Ня любіць дзядзька пустаплясаў.
Вось вы зірнеце ў хлеў на вышкі!
Там многа яблынін на лыжкі,
Там ёсьць і груша і кляніна,
Якая хочаш дравяніна:
Грабільны, касьці, клёпкі, восі...

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

У Казахстанскай ссылцы

Вясною 1940 году некалькі пісьменнікаў з Заходняй Беларусі былі запрошаныя Саюзам Пісьменнікаў БССР у Менск. Прышлося пазнаёміцца тады з Купалаю, Бядуляю й многімі іншымі. Уражаньні нашыя з усяго былі няцікавыя. Калі мы раз ішлі па Савецкай вуліцы, голасна гаворачы ды жартуючы пабеларуску, Кучар, які быў разам з намі, нейк спалохаўся, сказаў: «Ведаеце, не гаварэце так голасна пабеларуску, — у нас гэта ня прынята». І гэта было ў сэрцы Беларусі, Менску!

Пару дзён пасьля звароту зь менскіх «гасьцей» у Вялейку, аднае прыгожае раніцы, калі я толькі ўстава́ла з ложка, у нашыя дзьверы пастукаліся ўзброеныя энкавэдзістыя. Яны зь месца абшукалі мяне, дарма, што я была яшчэ навет бяз сукенкі, і загадалі мне заража зьбірацца з хлапцамі. Куды — не сказалі.

Хлапцы былі ў школе. Па іх пайшло двух энкавэдзістых із штыхамі «наперавес». Два іншыя тымчасам абшуквалі пакой і ўсе мае небагатыя рэчы. Хоць гімназыя, перароблена бальшавікамі на «дзесяцігодку», была ў іншым канцы гораду, энкавэдзістыя вельмі хутка прывялі хлапцоў.

На падлогу вывярнулі валізу, сьцягнулі з лавы, на якой была, маю пасьцель, коўдру й падушкі, — усё ператрэсьлі. Забралі альбом з фатаграфіямі, кнігі, лісты. Ярку (старэйшаму хлапцу) ўдалося схаваць некалькі фатаграфіяў пад кашуляй на грудзях, рэшта так і загінула.

Пасьля перагляду рэчы й пасьцель абы як зьвязалі ў клумак і неўзабаве мы ўжо стаялі ў машыне, якая імчала вуліцамі Вялейкі. Шмат такіх машынаў можна было пабачыць у гэны сьцюдзёны, золкі дзень 13 красавіка ў горадзе!

Усіх высыланых звозілі на станцыю й ладавалі ў даўжэзны таварны цягнік. Уся станцыя была поўная людзей. Вартаўнікі — грубыя, брутальныя; сплаканыя, напалоханыя жанчыны (іх ды дзяцей было 99%); сваякі й знаёмыя, якія, — дарма што бальшавіцкія запалохваньні — прыбеглі праводзіць сваіх блізкіх у далёкую, няведамую дарогу. Усё гэта мітусілася, пхалася, лаялася, крычала й плакала. Энкавэдзістыя шчыльна акружылі цягнік, але ўсё-ж той і гэты з натоўпу прарываўся, падбягаў да дзьвярэй вагонаў, падаваў тую ці гэтую забытую рэч, бутэльку малака, яшчэ раз разьвітаўся.

Нас ніхто не праводзіў. Нам ніхто нічога не падаваў, хоць мы й ехалі ў вялікую дарогу, ня маючы пры сабе нават куска хлеба. Ды ці да хлеба тады было? Пачуцьцё страшэннае крыўды сьціскала горла...

А людзей усё прыбывала й прыбывала. Было сьцюдзёна. Ішоў дробны дождж... Вясна ў гэтым чорным годзе не сьпяшалася прыйсьці на зьмену нябывала войстрай і маразянай зіме!

Толькі позна ўвечары цягнік рушыў зь месца. Усе плакалі. І гэтыя, сьцісьненыя шчыльна, як быдлё ў цёмных, брудных вагонах, і гэныя, абапал рэйкаў, што ўсьцяж адганяліся прыкладамі энкавэдзістых, — нябачны ў імглістай цемры вялікі, маўклівы натоўп. Плакала й я, уткнуўшыся ў клумак з пасьцеляй, плакала так доўга й балюча, аж заснула, закалыханая мерным стукатам колаў.

Падарожжа нашае трывала блізу тры тыдні. Цяжка сяньня паверыць, што знайшліся сілы ператрываць усе злыбеды, што выпалі на нашую долю падчас гэтага жудаснага падарожжа. Ехалі мы ўвесь час пад моцнаю эскортаю брутальных энкавэдзістых, у шчыльна замкнёных вагонах, пацёмку, у холадзе й голадзе.

Есьці нам упяршыню далі толькі на трэйці дзень, калі мы мінулі межы Беларусі. Тады-ж нас на часіну выпусьцілі «пад вагон», ня выпускаючы аднак ні на вобмірг з пад нагляду. У нашым вагоне было 30 чалавек, жанчын і дзяцей, у іншых шмат больш, да 40. Усе ціснуліся на бруднай падлозе, на клумках, ахінуўшыся, чым мага. З аднаго боку былі зробленыя з дошчак як-бы нары, дзе таксама сядзелі й ляжалі людзі. Вокны нашага вагону былі забітыя бляхаю, але праз пару дзён хлапцом удалося адарваць цьвякі й прыпадняць яе. Зрабілася крыху відней і можна было па чарзе глядзець на мінаныя шэрыя, няветлыя аколіцы савецкага раю.

Ды што значыць чалавек! Мінула колькі часу, першая роспач крыху прытупілася й у нашым вагоне завёўся такі-сякі лад. Усе пасябраваліся, зжыліся... Перасталі плакаць, ці, лепш кажучы, плакалі кажны сабе, паціху, у куточку. Дзеці павыцягвалі нейкія цацкі, пачалі гуляць. Моладзь, а яе ў нашым вагоне было шмат, хлапцоў і дзяўчатаў ад 12-цёх да 17-цёх год, узялася нават сьпяваць, часам навет жартаваць і сьмяяцца, хоць ніхто ня ведаў, калі й дзе будзе канец нашаму жудаснаму падарожжу.

Але ў іншых вагонах было горш. Найменшыя дзеці (былі такія па 2 тыдні) паміралі. Ня было ня толькі што малака, навет вады, каб даць ім. Раз на двое сутак цягнік прыпыняўся на вялікіх вузлавых станцыях і дзяжурныя па вагоне хадзілі пад вартаю па хлеб і зупу. Гэта было ўсё, што мы даставалі, каб не памерці.

Так, пераехаўшы вялікі кусок Расеі, мы перасеклі Урал, вельмі прыгожы ў сваім суровым, каменным харасьцьве, і апынуліся ў бязьмежных стэпах заходняга Сібіру.

Пачыналася вясна... Сьнег блізу згінуў. Абапал чыгункі, як вокам ськінуць, рудзелі бясконцыя прасторы ссохлае леташняе травы. Дзе-ня-дзе на даляглядзе бялеліся рэдкія бярозавыя пералескі. Было страшэнна пуста, сумна й безнадзейна.

Я ўвесь час сядзела ля акна й глядзела на кавалачак сіняга неба, што было відаць праз шчэліну... «Толькі вясною бывае неба такое сіняе, толькі вясною бываюць далі такія чыстыя...», — настырліва, у такт колаў, зьвінела ў вушшу. Гэты верш, што ўвайшоў пазьней у зборнік «Сягоньня», нарадзіўся якраз аднае веснавое раніцы ў цягніку, што вёз нас у далёкую ссылку праз аднастайныя Сібірскія стэпы.

Пасьля 20-цёх дзён пакуты мы дасягнулі, нарэшце, мэты. Цягнік, які ўжо ад колькі дзён, не даяжджаючы Новасібірску, зьвярнуў быў проста на паўдня, спыніўся на маленькай стэповай станцыі на беразе няжывога салонага возера. Нас выгрузілі й машынамі разьвезьлі па бяскрайных прасторах.

Наш вагон, усе разам, трапіў у глухую калгасную вёску Дзьмітраўку, дзесяткі кілёмэтраў (больш 70-цёх) ад чыгункі. Тут мы дойга сядзелі на вуліцы, у пяску, ня ведаючы, што рабіць і куды йсьці. Нас проста ськінулі з машынаў сярод сяла, і ўсё.

Калі сьцямнела, мясцовыя калгасьнікі, украінцы, пераселеныя сюды яшчэ царскім урадам, якія дагэтуль маўклівым натоўпам прыглядаліся да нас здалёк, пасьмялелі, падыйшлі бліжэй. Тыя, што мелі мякчэйшыя сэрцы, запрапанавалі начлег. Нам пашчасьціла. Нейкая старая забрала нас да сябе, дала есьці. Пашчасьціла й яшчэ некаторым. Але былі й такія, што начавалі на дварэ.

Назайтрае прыехала з раёну НКВД. Сабрала нас усіх у сельсавеце. Доўга перапісвала нас, дапытвала, а нарэшце сказала, што мы ня маем права нікуды з гэте вёскі выходзіць, што маем што дня а 7 гадзіне раніцы мэльдавацца ў сельсавеце й што... мусім сабе радзіць, як патрапім. «У каго няма грошай, — а яны, пэўне-ж, ёсьць у кажнага, вы-ж памешчыкі», — сказаў адзін з энкавэдзістых — «той можа йсьці пабатрачыць ў калгасьнікаў. Нам да вас справы няма, і працы мы вам ніякае даць ня можам, пакуль вы «не пераваспітаецесь» і «не раскулачыцесь».

І мы пачалі шукаць заработкаў, старацца хоць як-колечы наладзіць жыцьцё. Заработкі знайшліся. Справа ў тым, што ўсё калгасьнікі, ня вылучаючы старое, у якой мы начавалі першую ноч і якой было ўжо 80 год, штодня мусілі хадзіць на працу ў калгас. Працавалі яны ад цямна да цямна далёка ў стэпе. Але і ў хаце, аднак, трэба было даваць раду, праца й тут была.

Трэба было нацягаць вады для кароваў апаўдні (студні ў Дзьмітраўцы былі страшэнна глыбокія й вады ў іх было мала), пачысьціць хлявы, вымазаць хату. Хаты ў Казахстане абсалютна бязьлесным, усюды з гліны й прынамсі раз у год іх трэба нанава абмазываць, каб не разваліліся ад дажджу й сонца.

І вось калгасьнікі пачалі нас наймаць, каб выконваць за іх гэтую працу, тым больш, што НКВД афіцыйна гэтага не забараніла, хоць і сказала неафіцыйна, што калі хто зь мясцовых жыхароў будзе памагаць «палякам», дык таго вышлюць «на Камчатку».

Мы, гэта значыцца я з хлапцамі, за посьцілку й два ручнікі нанялі «кватэру» ў ваднаго калгасьніка — месца ў хаце, дзе можна было спаць на глінянай падлозе, і ўзяліся за заработкі, каб не загінуць. Капалі гліну, мясілі яе ў ямах ізь сечкай, лазілі на стрэхі, мазалі іх глінай, правілі камяны, рабілі «саман» (цэглу з гліны мяшанай ізь сечкай), цягалі ваду із студняў. За гэта нам плацілі пшаніцай, давалі хлеб, часам навет малако.

(Заканчэньне ў наступным нумары)

НАТАЛЬЛЯ АРСЕНЬНЕВА

Уладыслау Галубок — Народны Артысты Беларусі

(Заканчэньне)

па «абагацілася» новымі «вартасьцямі», як мастацкі кіраўнік, задачаю якога было вычысьціць ўсё беларускае. Апусьціў сваю ўжо сівеючую галаву заўсёды вясёлы й бадзёры Галубок. У ягонай рабоце ўжо не адчувалася болей энэргіі й ініцыятывы. Ён стаў больш асьцярожным, новага чалавека падазрона аглядаў, «хваліў» усе новыя мерапрыемствы, якія праводзіліся паза ягонай згодай, «знаходзячы» іх сваячасовымі.

Прыбліжаліся жахлівыя 1936 і 1937 гады. У вадну неспакойную ноч 1936 г. «чорны воран» забраў старога ўжо народнага артыстага Беларусі У. Галубка. У 1937 г. ён апынуўся на «вольнай» высылцы на вялізарным мануфактурным камбінаце Кохма Іванава-Вазьнясенскай вобласьці. Галубок павінен быў аддаць свае веды драматычнаму тэатру вялізарнай хвабрыкі Кохма. Галубок стараўся забыць свой цяжкі лёс. Хоць рэчаістасьць была яму чужая, але нейкая надзея працаваць у тэатры, якому ён на сваей бацькаўшчыне аддаў свой талент, падняла ягоныя падаючыя сілы. Тут у цэнтры Расеі ў драматычным гуртку Кохмы Галубок выступаў у паказах пад прыгожай назвай-псэўдонімам «Кветка». Адна гэтая простая мілагучная назва пераносіла яго на мілую дарагую бацькаўшчыну, куды дарога была ўжо яму зачыненая.

Нядоўга прыйшлося карыстацца тут прымусовай воляй. У гэтым-жа 1937 годзе яго вывезьлі ў Сібір, у горад Мінусінск. Самыя неабходныя рэчы яму забаронена было ўзяць з Кохмы. Там у Мінусінску Галубок павінен быў адбываць ссылку й працаваць па спэцыяльнасьці.

Уроджаная энэргія й тут яшчэ канчаткова не пакінула Галубка. Ён распытваў, пісаў, паколькі гэта было магчыма, і шукаў свайго сябру — артыстага першага беларускага тэатру Крыніцу, які быў арыштаваны раней. Магчыма, што ён меў нейкія весткі пра Крыніцу. Ён спадзяваўся, што ўрэшце яго накіруюць на працу ў Данбас — цэнтр вугальнай прамысловасьці. Можна гэта быў звычайны шантаж да Галубка з боку якога-небудзь сьледчага.

Не знайшоў Галубок-Кветка свайго прыяцеля беларуса Крыніцу, не папаў ён таксама і ў Данбас. Толькі паўтара месяца пражыў ён у Мінусінску, бо аднэй ноччу яго вывезьлі ў невядомым кірунку.

Прайшоў не малы час і ўжо ў 1938 годзе сябра па ссылцы праф. Ш. сустрэў нашую беларускую Кветку — Галубка ў катлаване Но. 9 на будаўніцтве вялікага азотнага заводу «Чырчыкстрой» каля Ташкенту. Гэты пакутнік ужо ня выступаў у паказах пад мілай назвай Кветка, а катаржнікам-землякопам рыдлёўкаю й тачкаю выкідваў мэтры зямлі для катлавану зь непаслухмянага грунту, у нясьцерпную сонечную сьпеку ды пры гарачых азыяцкіх вятрох. На Чырчыкстрою працавала некалькі тысячаў катаржнікаў у нязвычайна цяжкіх умовах, якія пагоршылі існаваньне Галубка. Дзе ягоныя дзеці, жонка, што зь імі? Стары, змучаны, аслабеўшы, без надзеі, пакорны лёсу, цягнуў ён лямку катаржніка.

У 1939 годзе з Чырчыкстрою Галубок зьнік. Хадзілі чуткі, што яго з другімі вывезьлі на новыя мукі, на другое будаўніцтва пад Бухару. Тут сьляды аб Галубку гінуць...

Так жыў і дзеіў гэты беларускі палымяны патрыёта. Усё аддаў свайму народу, каб самому загінуць у пустынях Азыі невядомым, абясслаўленым, як «вораг народу».

Нам думаецца, што ні першы, ні другі, ні опэрны тэатры Беларусі не зрабілі для беларускіх народных масаў і часткі таго, што прарабіў за 20 гадоў народны артысты Беларусі Ўладыслаў Галубок із сваімі артыстымі энтузыястымі і зь нязьменным сваім прыяцелям, такім-жа самым энтузыястым — артыстым Буслам. Мы гэтым абсалютна ня хочам панізіць ролю беларускіх тэатраў, іх высокае культурнае й мастацкае значэньне. Ня думаем мы аспрэчваць таленту народнай заслужанай артысткі ўсяго Савецкага Саюзу Ларысы Александроўскай, але яны сваім талентам ня цешылі й ня радавалі абцяжаных лёсам калгасьнікаў ды работнікаў. Мы схіляем свае галавы перад талентам нябожчыка артыстага Крыловіча, які так удумліва й цодоўна выконваў ролю Кастуся Каліноўскага. Паважаем артыстага Уладамірскага, летувіса Грыгоніса, які аддаў свае здольнасьці беларускаму тэатру, артыстку Ржэцкую, Ждановіча, сьпявачку Млодэк ды шмат іншых выдатных артыстых беларускіх тэатраў. Аднак кола іхнае працы й дзейнасьці праходзіла ў Менску, а ў часы гастроляў — у другіх буйных гарадох. Іх абяздоленая калгасная Беларусь ня бачыла, ня чула іх і ня ведае.

Таму толькі Галубок-Кветка па праву заслужыў пачэсную назву запраўднага народнага артыстага Беларусі.

Васіль Будзімер

Няма трайні — йдзі да Антося.
І людзі дзядзьку шанавалі,
А на кірмашы частаўвалі,
Каса чыя нядобра косіць —
Няхай Антося ён папросіць:
Антось наладзіць — так дагоніць,
Тады пабач, як загамоніць!
Каса ня косіць — каса брые
І шчытнякі бярэ сухія,
Бо ў дзядзькі рукі залатыя.
Каб дапісаць партрэт Антося,
Скажу: на сьвеце не знайшлося
Ні ўдоўкі-любкі, ні дзяўчыны,
Каб палучыць дзьве палавіны,
Каб разам шчасьце здабываць
І поруч долю падзяляць.
І я тут сам за дзядзьку мушу
Назад старонку адгарнуць
І аб вясьне яго ўздыхнуць
І добрым словам яго душу
Яшчэ раз шчыра памянуць.
Была вясна, было імкненьне,
І сэрца ведала тамленьне,
І сэрца водгук сэрца чула,
І сэрца к сэрцайку гарнула.
Ды толькі-ж доля ня судзіла,
І любка-Наста, яго міла,
Што так клялася, цалава
І к сэрцу з жарам прыхіляла,
Што так суліла шчасьця многа, —
Яго зьмяняла на другога!
Антось... Ды што!... цяпер забыта,
Даўно пажалі тое жыта
І тыя межы зааралі,
Што дзядзькаў смутак калыхалі.
— Ну, хлопцы: зараз дамо жару!
Саб'ём пасадаў яшчэ з пару, —
Снапы ў радочкі палажылі,
Так і дзяды яшчэ вучылі,
Каб каласы ды з каласамі,
А да пярылаў гузырамі.
— Ну, грымнем, хлопцы, каб зьвінела!
І пяць цапоў ідуць у дзела!
Не малацьба, а бубнаў хоры!
Здаецца-б цэпам вадзіў хворы!
Бічы кладуцца так рытмічна,
Само гудзеньне іх музычна;
Снапы ня ўлежаць, скачуць самі
І сыплюць жыта пад бічамі,
А дзядзька рэй вядзе, гукае
Й адным крыкам памагае:
— Дай, дай яму, брат! дай з-за вуха!
Гэ-гэх, скачы, баба-псяюха! —
Гудуць цапы ўгары праворна,
Ідзе работа дружна, спорна,
Аж падшыбае ўсіх ахвота,
Бо мае свой захоп работа.
Вось так адно й не прыядалась,
Затым было ўсё ў меру, ў пору.
І гладка йшло ўсё тут угору.
Таксама вечар свае бавы
Нясе з сабой ня менш цікавы
І асабліва перад сьвятам,
Калі, бывала, дзядзька з татам,
А зь імі часам гэтак сама
Язык разьвяжа свой і мама,
Пачнуць казаць свае ўспамінкі,
Вясьці размовы пра старынкі,
Пра нязвычайныя здарэньні
І ім даваць тут тлумачэньні.
Цяпер камінак спачывае,
А хату лямпа асьвятляе,
Але маркотна і тужліва,
А цені страшна і маўкліва
То затрасуцца, затанцуюць,
Як-бы каго яны пілнуюць,
То заспакояцца зацята,
Калі замрэ і сама хата.
Тады, здаецца, цені тыя,
Ня проста цені, а жывыя
І нібы ў іх ёсьць нейка справа
І таямнічна і цікава.
Дарэктар к печы прытуліўся,
На дзядзькаў твар утарапіўся.
— Мне сам казаў Пятрусь Грыхінін,
І лгаць-жа ён ня быў павінен:
Да дому ехаў ён з Княжога,
Вакол няма нідзе нікога,
І ціха ўсё, як-бы зацята.
Было ўжо трохі пазнавата,
А ён на воліках пляцецца,
І так яму ўсё штось вярзецца.
Вось едзе ён масток мінае,
Аж хтось з-за паляў вылятае,
Як-жар чырвоны ды вяртлявы,
І хвошча пугай ўлева, ўправа
І па валох і па Пятрусю.
«Вось», кажа, «я табе спазьнюся,
Калі ты так запрацаваўся»!
І аж да Нёмна за ім гнаўся! —
Дарэктар бедны ўвесь жахнуўся,
Ад страху нават аж прыгнуўся.
— Мабыць штось ёсьць такі на сьвеце!
На матку тут зірнулі дзеці:
— Сьвякроў, нябожчыца Анэта
Сама казала мне пра гэта, —
Яна была і цётка Рузя,
Зьбіралі шчаўе дзесь на лузе
Ды йшлі дадому каля Нёмна,
Было зусім яшчэ ня цёмна,
Вось толькі сонца напалову
Зайшло за горку Дземянову,
І нікагусенька нідзе!
Аж — зірк! на саменкай вадзе
Сядзіць хтось, выцягнуўшы ногі,
Над самай буктай, такі сарогі,
Як мае быць, ўва ўсім адзеньні
І курыць люльку ў задуменьні!
Жанчыны ў страсе далей хутка,
Назад зірнулі — нікагутка!
— А хто-ж то быў, цьфу, праваліся?!
Спытаў дарэктар, трасучыся:
Яго той страх нашчэнт занудзіў.
— Ці не Янчур там рыбу вудзіў, —
Азваўся дзядзька не бяз жарту.
А ўсе маўчаць, глядзяць упарта.
Да дзядзькі бліжай хлопец жмецца:
Яму, чорт знае, што здаецца.
У хаце стала больш страхліва.
З-за вокан ноч глядзіць маўкліва,
І гэта ноч як-бы жывая
І быццам нешта яна знае,
Але або тым казаць ня хоча,
Бо на размовы не ахвоча.
А на двары дзесь каля будкі,
Чагось брахнуў сабака чуткі,
Брахнуў і змоўк, бы страшна стала,
І ноч брахаць не пазваляла.
Аслаблі ў Яські ўсе тут гайкі.
— Э, глупства ўсё, ня больш як байкі! —
Міхась азваўся: — хто баіцца,
Таму ўсё можа налучыцца.
На што вам лепш? тут жыў Пшавара...
Вось раз у ночы чуе гукі, —
Ў вакно малоцяць чыесь рукі,
Малоцяць так, бы ў час пажару.
— Хто там? — Пусьці, брат: то я — Сёмка!
Ну, брат, і б'юцца-ж чэрці ёмка!
Ня верыў я, даль-бог, паверу!
На собскім карку чуў, халеру!
На грэблю я, брат, як узьехаў,
Так і засыпаў мне арэхаў!
Я — па кані, ён мне — па карку!
Пасек мне сьпіну праз браварку!
І толькі тут, вось адступіўся,
Калі ў двары ўжо я спыніўся. —
Пшавара з хаты вышаў босы
Агледзіць Сёмкавы калёсы.
І што-ж? вось вам і таямніцы:
Ялова лапка ўлезла ў сьпіцы! —
Яшчэ пра страхі вялі мову
І іх тлумачылі аснову,
І іх істоту разьбіралі,
І трохі зь Яські жартавалі.
Ўсяго было тут вечарамі,
Калі разыйдуцца часамі!
На ўсё была свая прычына
І адпаведная часіна.
Зайшла раз мова аб навуках —
Старых, даўнейшых — і іх штуках —
Аб кнігах з чорнаю пячацьцю,
Аб чараўніцтве, аб закляцьцю,
Аб розных хітрасьцях і зману.
— Вось пусьцяць нейкага туману,

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Беларускія студэнты ў Бэльгіі ўрачыста адсьвяткавалі падвойнае сьвята

Прыгатаваньні да сьвята

Аб дні прыезду Яго Эмінэнцыі Кардынала Тыссэрана ў Лювэн мы даведаліся ад айца Робэрта, якога Кардынал паведаміў, што Ён ахвотна прыймае запросіны Камітэту Дапамогі Беларускім Студэнтам у Лювэне й наведае беларускую студэнцкую групу 25-га сакавіка. У гэты-ж дзень Ён зробіць інаўгурацыю новага Беларускага Студэнцкага Дому. Якое шчасьлівае супадзеньне! Пра 25-ы Сакавік, пра Беларусь, пра беларускую справу й беларускіх студэнтаў у Лювэне ў вадзін дзень будзе ведаць уся Бэльгія! Укараняваньне напружанае трохгадовае працы!

Ня дзіва, што так гарачкава рыхтаваліся да гэтага дня. Хор на штодзенных сьпеўках вывучае «Оду», напісаную з гэтае нагоды сп. праф. М. Равенскім. У Доме стукаюць малаткі, шаруюць пілкі — гэта работнікі сьпяшаюцца закончыць да 25-га аднаўленьне Дому.

Пра 25-ы пачалі гутарыць даўно. Рыхтаваліся на працягу месяцаў, каб паставіць дом на ногі. Дараблялі цэлы трэйці паверх, аднаўлялі рэшту. Трэба-ж урэшце мець свой дом, у якім маглі-б жыць усе разам. Хоць гэткіх, што жылі «на прыватках», было ня шмат, але ўсё-ж лепш, калі ўсе будуць у ваднэй грамадзе: тады й на сьпеўку хутчэй народ склікаць, і зарганізаваць на скорую руку што-небудзь і наагул адчуваецца ў групе больш шчыльнасьці й закончанасьці.

Працавалі з ахвотай: дапамагалі цягаць пясок на верх, цымэнт, бэлькі, рэйкі, чысьцілі, шаравалі, а, калі прыйшло да канчатковага афармленьня сьвятліцы, дык ламалі сабе галовы: Што добрага можа выйсьці зь белае столі й чырвані, якая памаленьку зарысоўвалася ўжо на сьценах? Закладаліся, дыскутавалі, круцілі галовамі. Толькі архітэктар цьвердзіў з паважнай мінай: «Цярплівасьці! Пабачыце цэласьць і тады будзеце меркаваць». Увіхаліся ля Дому, хто як мог. Працавалі ўначы. Баяліся, што ня ўсьпеюць. Мікола сцэптычна ківаў галавой: «Дом дык скончаць, але госьці, здаецца, у сьцены паўліпаюць...»

Але й Дом закончылі, і госьці не паўліпалі ў сьцены, і клюб выйшаў надзвычайны. Не дарма пісала адна зь нязьлічоных бэльгійскіх газэтаў, апісваючы сьвята: «Што да мастацкае апрацоўкі, дык салён дае асобны від жанру...» І ўзапраўды!... Прыгадваюцца словы архітэктара, сп. Калебота: «Адным із шляхотных заданьняў архітэктуры зьяўляецца стварэньне элемэнту, які змушае людзей адчуваць у вакружаючым сваё пэрсанальнае, адчуваць самога сябе, элемэнту, які лучыць і дае пачуцьцё камфорту. Вы, якія прыйшлі сюды з розных жыцьцёвых дарогаў, патрабуеце больш чым іншыя супольных рысаў, якія злучаць вас у вашым змаганьні. З гэткімі думкамі я праектаваў гэтую сьвятліцу».

Сп. Калебот з глыбокім мастацкім пачуцьцём змог знайсьці нявычарпальнае багацьце й утульнасьць у белчырвона-бела-карычнявых колерах. Даў тое, на што так прагна й з такім эстэтычным пачуцьцём углядаюцца вочы... Элемэнт еднасьці!...

Беларускі Студэнцкі Дом у Лювэне (пасярэдзіне белы)

Прамова Айца Робэрта Ван Кавэлярта

Айцец Робэрт, Сакратар Камітэту Дапамогі Беларускім Студэнтам у Лювэне, робіць перагляд працы першых трох гадоў існаваньня групы. Ён кажа:

«Праробленая на працягу мінулых трох гадоў існаваньня КДБС у Лювэне праца часта была цяжкой і напружанай з гледзішча чыста матарыяльнага, але, калі я кіну позіркам назад на мінулы час, дык я адчуваю толькі задаваленьне — задаваленьне з штодзённага кантакту зь ідэалістычнай і ахвярнай моладзьдзю, задаваленьне із супрацоўніцтва зь ей у найлепшай згодзе.

Дазвольце мне коратка апісаць жыцьцё, працу й разьвіцьцё гэтага твору, і мы пабачым, што ні нашыя студэнты, ні іхныя кіраўнікі не закапалі ў зямлю сваіх талентаў.

ПАЧАТАК СПРАВЫ

Эмінэнцыя, ці прыпамінаеце Вы сабе гэныя першыя стараньні, якія рабілі ў Вас Яго Эксцэленцыя Япіскап Слосканс і Прэзыдэнт М. Абрамчык разам з праф. Жадэнам у кастрычніку 1948 г.?

У Нямеччыне, у Марбургу была група беларускіх студэнтаў, якая ў сувязі з праведзенай грашовай рэформай сталася пазбаўленай усіх сродкаў існаваньня, і Вас прасілася пайсьці ім насустрач з дапамогай, каб яны змаглі закончыць сваю вышэйшую асьвету.

Вы ня хісталіся, Эмінэнцыя, бачучы патрэбы, і шчыра прынялі да сэрца лёс гэтае шляхотнае нацыі. Вы пралажылі шлях, які запраўды прывядзе яе да адраджэньня: у першую чаргу стварыць інтэлектуальную хрысьціянскую эліту, а пасьля зарганізаваць масы. Заўсёды канкрэтна гледзячы на рэчы, Вы хацелі ад першага дня, каб гэтыя студэнты мелі свой дом выключна для сябе, Дом, які мог-бы быць для іх кутком іхнае бацькаўшчыны, і дзе-б пасеенае гарчычнае зерне выросла ў дрэва й атуліла іхную цэлую краіну.

Вы згадзіліся ўзяць на сябе адказнасьць утрымаць дзесяцёх студэнтаў, і вось гэта тая навага, якая сталася выходным пунктам усяго, што Вы тут бачыце цыпер. Ваш уклад стаўся неразлучным із зробленай справай. Зь дзесяці студэнтаў група зараз-жа выросла ў чатырнаццаць.

Аддаючыся з энтузыязмам сваім сацыяльным абавязкам як і студыям, студэнты змаглі стварыць із свайго Дому ня толькі цэнтр беларускага нацыянальнага жыцьця ў Бэльгіі, але й прыцягнуць на сябе ўвагу ўсяе беларускае эміграцыі.

ПРАЦА СТУДЭНТАЎ

Яны яшчэ ня былі Вашымі стыпэндыстымі, Эмінэнцыя, як ужо ў 1948 годзе яны залажылі Саюз Беларусаў у Бэльгіі, кіраўніцтва якога ад гэнага часу знаходзілася ў іхных руках, і які яны разьвілі ў сацыяльную, рэлігійную й культурна-асьветную арганізацыю, даючы сацыяльную й хрысьціянскую дапамогу сваім суродзічам.

Я ня ведаю, ці гэта гэтая ахвярнасьць, якою студэнты здабылі Вашую асаблівую сымпатыю. У ўсякім выпадку, пераскокваючы цераз этапы, нашыя студэнты адыгрывалі ў Бэльгіі ад першага году вельмі ўплывовую ролю, як нацыянальныя кіраўнікі. Гэта аднак не перашкаджала іхным студыям.. Ня гледзячы на цяжкасьці, што выніклі з паўгадовага спазьненьня, зь якім яны прыехалі сюды, у Лювэн, і ня гледзячы на няведаньне французскае мовы, зь сямі зь іх, што атрымалі дазвол складаць гадавыя эгзамены ў ліпені, здалі ўсе да аднаго. Гэтыя прыгожыя вынікі выясьняюцца толькі тым, што між імі быў элемэнт малады, бязумоўна, але які яшчэ на Беларусі злажыў довады энэргічнае працы, як Рагуля, Набагез, Жытка й пад.

Ня гледзячы на матарыяльныя цяжкасьці, якія ўзрасталі што раз больш і больш, студэнты сьцягнулі ў Лювэн шмат беларускае студэнцкае эміграцыйнае моладзі, што знаходзілася да гэнага часу ў Нямеччыне, Ангельшчыне, Францыі ды Бэльгіі. З поўным зразуменьнем яны пайшлі на заклік нацыянальных кіраўнікоў — аддацца маральным і гістарычным студыям, якія адпавядаюць больш для падрыхтоўкі культурных і сацыяльных кіраўнікоў.

У 1949-50 годзе лік студэнтаў вырас да 25; у 1950-51 — іх было ўжо 32; у гэтым годзе іх ёсьць 34. У бальшыні яны студыююць палітыку, сацыялёгію, эканомію, псыхалёгію, пэдагогіку, гісторыю й г. д....

Іхныя суродзічы з Саюзу Беларусаў у Бэльгіі — гэта амаль выключна вуглякопы. Кажную нядзелю й у свабодныя дні студэнты наведваюць іх у розных мясцовасьцях, арганізуюць ім рэлігійныя службы, рэфэраты, канцэрты й зборкі для розных інфармацыяў. Яны дапамагаюць сваім работнікам у суадносінах зь інхнымі гаспадарамі. Яны ім асыстуюць у лекарскай апецы, прывозячы іх пры патрэбе ў лювэнскую ўнівэрсытэцкую клініку, дзе яны іх адведваюць, служаць ім за перакладчыкаў і даюць ім духовае падтрыманьне. На працягу пэрыяду ад травеня 1950 году да кастрычніка 1951 г. нашыя студэнты вы-



Кардынал Тыссэран падчас урачыстасьці высьвячэньня Беларускага Студэнцкага Дому

далі 20% із свайго скромнага бюджэту на гэтую сацыяльную працу. Яны гэта робяць з надзеяй стварэньня гэткім чынам сацыяльнага й хрысьціянскага ядра працоўных, якое станецца некалі



Айцец Робэрт ван Кавэлярт прамаўляе перад Кардыналам Тыссэранам

ў вольнай Беларусі пачаткам сацыяльных арганізацыяў падобных да тых, якія яны маюць перад сваімі вачыма ў Бэльгіі.

У кастрычніку, у выніку праведзенага зьезду, студэнты залажылі ў Лювэне Цэнтралю Беларускіх Акадэміцкіх Арганізацыяў. Гэткім чынам, яны задзіночылі маладых беларускіх інтэлектуалістых на эміграцыі ў цэласьць для хрысьціянскага адраджэньня сваей бацькаўшчыны.

Эмінэнцыя, вось нашая трохгадовая праца. Мы перакананыя, што тыя, якія пройдуць праз Лювэн, адыграюць паважную ролю ў вызваленьні Беларусі. Нашым жаданьнем ёсьць расшырыць яшчэ больш гэтую справу. Дапамажэце нам Вашым падтрыманьнем! У сваю чаргу, мы астанёмся вернымі нашым сьвятым ідэалам.

З думкамі аб адлегласьцях, якія дзеляць беларускі народ ад незалежнасьці бацькаўшчыны, ды аб шляхох, што мусяць давесьці да перамогі, льлецца цікае «Магутны Божа...»

Дзень 25-га Сакавіка

Аб прыезьдзе Кардынала да беларускіх студэнтаў паведамлялі ўжо напярэдадні, як і ў дзень 25-га сакавіка, бэльгійскае радыё й прэса.

Пасьля адсьвяткаваньня ў сваім крузе вялікага дня Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі (малебен у беларускай праваслаўнай капліцы й урачыстая акадэмія), пачалася падрыхтоўка да сустрэчы паважанага Гасьця.

Перад домам пачынае зьбірацца натоўп гледачоў. У сталоўцы, што знаходзіцца пад сьвятліцай, уладзілі фанаграфы для зарэгістроўваньня прамоваў і песьняў хору; у клюбе паставілі мікрафон. Фатографы прыладжваюць свае апараты й лямпы. Рэпартэры з блёкнотамі распытваюць гаспадароў-студэнтаў пра праграму дня, гісторыю студэнцкае групы ды пра Беларусь. Толькі хор у нацыянальнай вопратцы й сп. праф. Равенскі ў смокінгу канчаткова занялі свае месцы. Прыгожа пераліваюцца белчырвона-белыя колеры сарочак і паясоў на багатым фоне залі. Госьці, якіх забралася ўжо поўная заля, зь цікавасьцю аглядаюць гэты шматвузорны маналіт. Студэнты, што не бяруць удзелу ў хоры, з нацыянальнымі істужкамі на грудзёх, займаюцца гасьцьмі: даюць патрэбныя інфармацыі, увіхаюцца, каб усё было ў спраўнасьці. Вакол зелень і краскі. На пакрытым белым абрусікам падносе ляжыць чорны хлеб і соль — прыгожыя беларускія традыцыі мусяць быць рупліва захаваныя.

Вялізарныя дзьве залі ўжо запоўнены. Прафэсары, міністры, прадстаўнікі бэльгійскага ўраду, духоўных і сьвецкіх уладаў — усе напружана чакаюць палавіны пятае.

Ля шырокіх белых дзьвярэй Беларускага Студэнцкага Дому спынілася машына. Усе заварушыліся... Натоўп на пляцы зь цікавасьцю аглядае Яго Эмінэнцыю. Кардынал адломлівае ломцік аднесенага Яму студэнтамі й дзьвюмя гімназісткамі ў нацыянальных вопратках чорнага хлеба. Бліскаюць фотоапараты. «Многае лета» запаўняе сьцены сьвятліцы. Пачынаюцца прывітаньні й прамовы.

Прафэсар В. Дэніс, старшыня Камітэту Дапамогі Беларускім Студэнтам (КДБС), горача вітае дастойнага Гасьця. Гаворачы яму пра важнасьць узятага на Камітэт заданьня, прафэсар вымяноўвае доўгі сьпісак урадавых установаў, прозьвішчаў міністраў, прафэсараў і прыватных асобаў, якія ў вялікай меры прычыніліся да акцыі дапамогі й разьвіцьця беларускае студэнцкае справы ў Бэльгіі. Асаблівую падзяку ён складае Кардыналу за тую цёплую прыхільнасьць, зь якой апошні сустрэў палючыя патрэбы беларускага студэнцтва, кладучы гэтым фундамант вялікім дасягненьням, сьветкамі якіх мы зьяўляемся сяньня. Шчыра дзякуе япіскапу Б. Слоскансу, сп. Прэзыдэнту М. Абрамчыку й усім тым, якія першыя пачалі стараньні аб дапамозе патрабуючаму беларускаму студэнцтву. Асаблівая падзяка прыпадае на долю Пэра Робэрта, які за мінулыя тры гады няўтомнае працы стаўся ў вачох беларускіх студэнтаў у Бэльгіі ўвасабленьнем Боскага Провіду.

Кардыналу ўручаецца прыгожа апрацаваная «Ода». За гэтым плыве мастацкае выкананьне яе.

Да глыбіні ўсхваляваным голасам пачынае габарыць Пэр Робэрт. Столькі-ж, як і ён, перажываюць зь ім ягоныя студэнты. І гэты дрыжучы ад усхваляваньня й радасьці голас падкрэсьлівае яшчэ больш шчырасьць ягоных словаў. Не дарма казаў ён напярэдадні: «Для мяне гэта будзе асабліва вялікі дзень: я змагу гаварыць перад усімі аб беларускіх студэнтах і аб тых высокіх ідэалах, якія яны паставілі перад сабой.»

Ганаровая Варта студэнтаў падчас Нацыянальнага Сьвята

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Беларускія студэнты ў Бэльгіі адсьвяткавалі падвойнае сьвята

Прамова д-ра Барыса Рагулі

Пасьля гэтага сп. др. Б. Рагуля, Старшыня Цэнтралі Беларускіх Акадэміцкіх Арганізацыяў на Чучыне, прывітаў папажанага Гасьця.

«У прамове, якую Вы толькі што выслухалі, наш апякун падчыркнуў той ідэал, які вёў нас праз першыя тры гады працы... Так, мы хочам падрыхтаваць будучыню нашае Бацькаўшчыны й узяць актыўны ўдзел ў ейным нацыянальным, сацыяльным ды рэлігійным

Др. Барыс Рагуля прамаўляе перад Кардыналам Тыссэранам

адраджэньні. Мы мусім гэта рабіць у цесным супрацоўніцтве з нашымі суродзічамі на Бацькаўшчыне, што праходзяць сяньня цяжкія гады выпрабаваньня, а таксама й з тымі, што, як і мы, мусілі шукаць прыпынку на чужыне. Нашай вялікай надзеяй зьяўляецца тое, што мы здабудзем іх для нашага вялікага ідэалу; бяз гэтага прыгатавальная праца была-б страчаным высілкам.

Вас, Эмінэнцыя, напэўна цікавіць, што думае беларуская эміграцыя аб сваіх студэнтах, якім Вы далі магчымасьць забрацца ў Лювэне. Гэткае рэзюмэ пакажа, думаю, што праробленая праца не пайшла надарэмна й, што, ня гледзячы на цяжкасьці напачатку, яна здабыла вялікі ўплыў ды зьяўляецца найлепшым абяцаньнем на будучыню.

Дазвольце мне быць тут голасам беларускае эміграцыі й прачытаць некалькі адрыўкаў із шматлікіх пісьмаў, якія прыбываюць штодзённа ў бюро тае ці іншае нашае арганізацыі.

Насамперш, Яго Эксцэленцыя сп. Абрамчык, Прэзыдэнт Рады БНР, затрыманы справамі ад кастрычніка мінулага году ў Задзіночаных Штатах, толькі што прыслаў мне пісьмо, каб выбачыцца за сваю адсутнасьць і ўпаўнаважыць мяне рэпрэзэнтаваць яго тут. Я чытаю:

«Я ўзапраўды шкадую, што не магу быць у Лювэне ў дзень нашага Нацыянальнага Сьвята, якое ў вас там адсьвяткуецца з асаблівай урачыстасьцю. У маіх клапотах і працы Лювэн быў для мяне заўсёды крыніцай супакою й падтрымкі. Знаходзячыся між усялякіх цяжкасьцяў, я заўсёды цешыўся, калі быў сярод вас, бачучы ваш энтузыязм і здабытую вашую сымпатыю. Гэта Божая ласка, якая ўзбудзіла вакол вас і для вас столькі ўвагі й адданасьці.

Кажны дзень, у маіх шматлікіх падарожжах, мне прыходзіцца бачыць, як важна для народу мець эліту з хрысьціянскім узгадаваньнем і асьветай. І тады я ўспамінаю Лювэн і думаю пра вас, якія жывіцё ў асяродзьдзі, што розьніцца да усіх іншых. Пасьля кажнага побыту ў вас, я вяртаюся бадзёрым: бадзёрым ад пахвалаў, якія чуў пра вас, і ад тае адданасьці, зь якой вы адносіцеся да свайго апякуна й старшыні. Я не ўяўляў сабе дастаткова вашае прывязанасьці да іх дагэтуль, аж пакуль, нядаўна, баючыся страціць аднаго зь іх, вы не зьвярнуліся да мяне з просьбай аб інтэрвэнцыі.

З нагоды ўрачыстасьці 25-га Сакавіка скажэце нашым студэнтам, што яны павінны апраўдваць зьвернутую на іх увагу; што каб сваей працавітасьцяй у студыях, адданасьцяй нацыянальнай справе й сваім суродзічам-работнікам, яны стварылі із свайго Дому запраўдны куток Беларусі, дзе-б магло захавацца каханьне Бацькаўшчыны, Народу й нашых хрысьціянскіх традыцыяў ня толькі на працягу выгнаньня, але аж да таго часу, калі мы будзем мець падобны да Лювэну цэнтр — кузьню вялікіх людзей і вялікіх хрысьціянаў, якіх так патрабуе нашая краіна.»

Пасьля гэтых словаў Прэзыдэнта М. Абрамчыка, вось, як рэха, некалькі слоў, узятых між абзацаў лістоў нашае інтэлігенцыі, а таксама простых работнікаў.

Гэтак піша зь лягеру ўцекачоў у Мюнхэне калішні ўрадавец:

«Чаму вы ня пішаце часьцей зь Лювэну?. Каб вы ведалі, як цікавіць нас тое, што робіцца ў Лювэне. Я ўважаю, што Вашая праца надта важная для будучыні нашае Бацькаўшчыны.»

А вось што піша былы настаўнік зь лягеру ўцекачоў у Розэнгайме, у Баварыі:

«Я папрасіў свайго сябру, які прабыў некалькі дзён у Лювэне, падзяліцца за мной сваймі ўражаньнямі. Ён мне проста сказаў, што быў глыбока ўзрушаны настроем беларускіх студэнтаў. Яны поўныя веры, упэўненасьці й волі служыць сваім суродзічам і Бацькаўшчыне. Я веру ў гэта і я упэўнены, што вы ўзмацнееце яшчэ больш і створыце кадры будучае беларускае дзяржавы».

Беларускі лекар піша з Канады:

«Шкадую, што я ўжо кончыў свае студыі й не магу далучыцца да вас у Лювэне, пра які ў нас тут так шмат гаворыцца. Шмат чаго спадзяюцца ад вас, перадусім стварэньня моцнага ядра, якое будзе заўсёды гатовае да ахвяраў у імя пакутнага народу. Няхай благаславіць вас Бог у вашых добрых намерах».

Беларускі лекар з Аўстраліі:

«Паводля вашых лістоў, што характарызуюць мне асяродзьдзе, у якім вы цяпер жывіцё, я перакананы, што ня можна было знайсьці лепшага месца для нашых студэнтаў. Трэба верыць, што Беларусь атрымае кадры, узгадаваныя ў запраўдным хрысьціянскім духу, здольныя да адбудовы свае дзяржавы на здаровай базе».

Работнік піша нам із Задзіночаных Штатаў:

«Я ня бачыў ні Бэльгіі, ні Лювэну, і я навет слаба чытаю, але я часта чуў пра вас і я задаволены, вельмі задаволены. Я ня маю асьветы, але вы зможаце навучыцца шмат добрых рэчаў, каб пасьля ў вольнай Беларусі навучыць маіх дзетак».

Стары беларускі камбатант піша нам з Буэнос Айрэс:

«Я жадаю вам умацаваць вашыя пазыцыі ў Лювэне й пашырыць яшчэ больш лік нашых студэнтаў. Мне здаецца, што вы зможаце падрыхтаваць людзей, якіх у хуткай будучыні будзе патрабаваць Беларусь».

Вось што піша беларускі работнік з паўночнай Францыі:

«Мы чулі, зь якой адданасьцю вы займаецеся беларускімі работнікамі ў Бэльгіі. Мы хацелі-б таксама мець больш лучнасьці з вамі. Спрабуйце разьмеркаваць так ваш час, каб вы й нас маглі адведаць... Калі магчыма, дайце нам канцэрт беларускіх народных песьняў».

Беларускі ўрадавец, што знаходзіцца ў Лёндане:

«Я прабыў тры дні ў Лювэне й вярнуўся ў Лёндан на дзесяць гадоў маладзейшым. Я наладаваўся новай энэргіяй; мы так патрабуем яе, каб дасягнуць нашую мэту — «Незалежную Беларусь».

Урэшце беларуская газэта «Бацькаўшчына» ў нумары з 24-га лютага кажа:

«Беларуская студэнцкая група ў Лювэне выказала дагэтуль многа ахвярнасьці, добрае волі й юнацкага энтузыязму ў няўтомнай дзейнасьці ў галіне прапаганды беларускага імя сярод бэльгійськага грамадзянства. Гэта ўсё заслугоўвае на асаблівую ўвагу й поўнасьцю заслужаную пахвалу яшчэ ў сувязі з тым, што нашыя студэнты, будучы змушанымі вучыцца й здаваць эгзамены, а некаторыя зь іх і вывучаць французскую мову, умеюць знайсьці вольны час для так плоднай працы на карысьць нашай нацыянальнай справы.»

Эмінэнцыя, вось што думае беларуская эміграцыя, ад ейнага Прэзыдэнта да звычайнага работніка, аб справе, якая робіцца ў Лювэне. Прымеце, Эмінэнцыя, гэтую агульную падзяку ўсіх беларусаў, голас якіх можа свабодна дайсьці да Вас.»

*

Сп. Рамук, Старшыня Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня ў Лювэне, ад імя БСЗ дзякуе Кардыналу за той гонар, які ён зрабіў сваім прыбыцьцём на вялікае сьвята 25-га Сакавіка й Інаўгарацыю Беларускага Студэнцкага Дому.

Прысутныя ўстаюць. З маладых грудзей магутна гучаць словы беларускага нацыянальнага гымну:

«...У крывавых муках мы адродзім Жыцьцё Рэспублікі сваей!»

Прамова Айца Робэрта

Кардынал Тыссэран прамаўляе да студэнтаў



Кардынал высьвячае супольную залю.



Кардынал высьвячае пакой студэнтаў.

Прамова Яго Эмінэнцыі Кардынала Тыссэрана

З паражальнай прасьцінёй гутаркі й глыбінёй думкі прамаўляе Кардынал, зьвяртаючыся да студэнтаў:

«Свабоднае духовае разьвіцьцё зьяўляецца найгалаўнейшай патрэбай кажнага чалавека. Вы маеце ўсе магчымасьці свабодна разьвівацца ў хрысьціянскім духу. Культывуйце й перахоўвайце свае рэлігійныя й нацыянальныя традыцыі й сваю культуру!...

Мне было вельмі прыемна пачуць, што вы цікавіцеся сацыяльным пытаньнем беларускіх работнікаў у Бэльгіі. Гэта прыгожа. Памятайце аб сваіх суродзічах, памятайце аб сваім народзе й бацькаўшчыне, бо й Хрыстос на чужыне аплакваў Юдэю...»

*

Хор пяе «Многае лета», прыгожа распрацаванае праф. Равенскім.

Пасьля гэтага адбываецца высьвячэньне й візыта Студэнцкага Дому. Па вароце ўсіх у сьвятліцу госьці й студэнты супольна падыймаюць кілішкі за здароўе ўсіх прысутных і за ажыцьцяўленьне вялікае Праўды, абвешчанае 25-га сакавіка 1918 году.

Фотоапараты працуюць далей. Напоўненая гасьцямі заля праменіць сяброўствам і сымпатыяй. Пачынаюцца знаёмствы, гутаркі. Нацыянальныя беларускія сарочкі бялеюць і рухаюцца па ўсей сьвятліцы. Прыемна ўсьміхаюцца твары...

Хутка кончыцца першая частка ўрачыстасьці. Памаленьку госьці зьбіраюцца на вячэру, якая ладзіцца Камітэтам у ўнівэрсытэцкай галі.

Бяседа ў унівэрсытэцкай галі

На дварэ ўжо цёмна. Вялізарная сярэднявечная заля, падпёртая масыўнымі шэрымі калёнамі, раптам ажыла ад шуму вясёлае грамады. Уздоўж сьценаў сталі белыя сталы. Пасярэдзіне, на асобным століку ляжыць аб'ёмісты торт, красуецца беларуская «Пагоня». Паволі госьці займаюць свае месцы. Кажны зь іх бярэ стаячую перад ім падвойна складзеную картку й дакладна разглядае яе. Зь цікавасьцю чытаюць «праграму» вечару:



Торт «Кардынал»

«Абед, ладжаны ў унівэрсытэцкай галі ў чэсьць Яго Эмінэнцыі Кардынала Аўгена Тыссэрана, Дзекана Сьв. Калегіі й Сакратара Сьв. Кангрэгацыі для Ўсходняе Царквы, пасьля Інаўгурацыі Беларускага Студэнцкага Дому 25-га сакавіка 1952 году ў дзень 34-ае гадавіны Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі.

У часе ўрачыстасьці Беларускі Студэнцкі Ансамбль пры Каталіцкім Лювэнскім Унівэрсытэце пад кіраўніцтвам праф. Міколы Равенскага, былага прафэсара Менскае Кансэрваторыі, выканае рад беларускіх народных песьняў.

Мэню: Полацкі боршч. Наваградзкая парасяціна зь беластоцкай салатай. Віно з Барсак. Віленскія індыкі з гомельскай бульбай. Бургунцкае віно. Торт «Кардынал». Усходні мускат. Кава, лікёры».

Між дзьвюх калёнаў сьцяною стаў хор. Пасьля адсьпяваньня «Ойча наш» піяністы др. Лыслаў кладзе на клявішы пальцы, сп. праф. М. Равенскі далікатна ўзмахвае рукой і мілагучная песьня дадае ўсім апэтыту:

«Хмель лугамі, хмель лугамі,
А пшаніца стагамі.
Малады наш Яська, маладзенечкі,
Павячэрай-жа з намі!...»

Воплескі. Сп. праф. Равенскі сядае за стол на ганаровым месцы, акружаны сваімі студэнтамі-харыстымі. Добра смакуе Полацкі боршч.

Дзеляцца ўражаньнямі з дня, абмяркоўваюць наступную песьню. З рук у рукі перадаюцца «мэню», каб забраць подпісы сяброў і знаёмых, што сядзяць пасуседзку — кажны хоча мець успамін з гэтага ўрачыстага й радаснага вечару.

Пасьля салідных «Віленскіх індыкоў» і «Гомельскае бульбы» льлецца паволь-ная й такая мэлёдыйная «Ад родных ніў...»; за гэтым яшчэ некалькі песьняў.

Раптам заціхае шумная заля. З за сярэдняга стала падыймаецца постаць, — гэта Монсыньёр Уаенбэрг, Рэктар Лювэнскага Ўнівэрсытэту:

«Эмінэнцыя, — пачынае ён — я цешуся, што ўрэшце вы адведалі наш унівэрсытэт, хоць ініцыятыва запрасіць Вас у Лювэн, — прызнаюся — не належыць нам, — яе мы заўдзячваем групе беларускіх студэнтаў.

Падчас прамовы прафэсара Дэніса, старшыні Камітэту Дапамогі Беларускім Студэнтам

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Заканчэньне съвяткаваньня 25-га Сакавіка



Партрэт Кардынала Тыссэрана, пад якім Яго ны собскаручны зварот:

«Я благаслаўляю ад усяго сэрца кіраўнікоў і студэнтаў Беларускага Студэнцкага Дому пры Лювэнскім Універсытэце й прашу іх астаавацца вернымі свайму рэлігійнаму, інтэлектуальнаму й сацыяльнаму ідэалу, які зьядноўвае іх для службы сваім суродзічам на чужыне, вернымі сваей Бацькаўшчыне, якой я жадаю, каб яна адрадзілася ў недалёкай будучыні ў свабодзе, больш хрысьціянскай, чым заўсёды.

† Аўген. Кардынал Тыссэран,
Рым, 10 траўня 1951 г. Япіскап Остыі, Порто і Санта Руфіна».

(Заканчэньне з 7 балоны)

Ад 1936 году мы зь нецярплівасьцю чакалі Вашае візыты, якая мела адбыцца, як вынік атрыманага Вамі ў 1936 годзе ганаровага дактарату, і якая ніколі не адбылася. З тым большай радасьцю вітам мы Вас сяньня тут. Гэтая старая заля зьяўляецца старэйшай за сам універсытэт. Яна перажывала ўсе войны й ліхалецьці й засталася някранутай. Няхай яна сымбалізуе наш сяньняшні вечар. Мы таксама жывём у трывожныя часы, але верым, што з Божым імем пераможам і іх. Я падыймаю тост за Папу, Караля й Беларусь, а гэтым маладым беларускім студэнтам ад усяго сэрца жадаю, каб у блізкай будучыні яны вярнуліся на сваю вольную Бацькаўшчыну.»

Коратка прамаўляе Кардынал, выказваючы сваю радасьць з дня, праведзенага ў запраўдным універсытэцкім асяродзьдзі, і дзякуючы беларускім студэнтам за запросіны, на якія ён спэцыяльна прыехаў у Бэльгію, ды за прыемна праведзены час.

Канчаецца бяседа. Хор адсьпеўвае малітву, і прысутныя пераходзяць у суседні салён, дзе чакаюць іх філіжанка кавы, цыгаркі й супольныя гутаркі.

*

Утульны салён. Дымяцца цыгаркі й цыгары. Абносіцца ўсіх кубкам моцнае чорнае кавы. Ажыўленыя гутаркі кружацца вакол перажытага дня, беларускіх студэнтаў, адсьвяткаванае гадавіны. Рупліва ўвіхаюцца студэнты й госьці, каб атрымаць аўтаграф таго ці другога міністра ці іншага дастойнага гасьця. Столькі ўзбуджэньня, жыцьцярадаснасьці й задаваленьня зь перажытага дня!...

Памаленьку пачынаюцца разьвітаньні. Яшчэ раз хор пяе «Многае лета» адыходзячым гасьцём, а пасьля й сам зьбіраецца на адпачынак...

Толькі ў Беларускім Студэнцкім Доме яшчэ позна сьвяціліся агні. «На гура» сп. праф. Равенскага!... «На гура» Айца Робэрта!... І маладыя моцныя рукі пяшчотна падымалі гэтых двух гэрояў праведзенага Сьвята, пяючы ім з усей юнацкай шчырасьцю «Многае лета»...

Янка З.

Прысутныя на сьвяце госьці

Яго Эмінэнцыя Кардынал Аўген Тыссэран, Дзекан Сьв. Калегіі Кардыналаў і Сакратар Сьв. Кангрэгацыі для Усходняй Царквы.

Яго Эксцэленцыя Апостальскі Нунцыюш Чэнто.

Яго Эксцэленцыя Япіскап Сюнэнс, прадстаўнік Яго Эмінэнцыі Вялікага Канцлера Лювэнскага Універсытэту, Кардынала Архіяпіскапа Малінскага ван Руй.

Яго Эксцэленцыя Менскі й Магілеўскі Апостальскі Адміністратар Япіскап Б. Слосканс.

Пралат ван Уаенбэрг, Рэктар Лювэнскага Універсытэту.

Пралат Літт, Віцэ-Рэктар Лювэнскага Універсытэту й Старшыня Акадэмічкага Камітэту для Чужынцаў.

Праф. Ван дэр Эссэн, Сакратар Лювэнскага Універсытэту.

Праф. Дэніс, Старшыня Камітэту Дапамогі Беларускім Студэнтам у Лювэне.

Яго Эксцэленцыя Дзяржаўны Міністар Ф. ван Кавэлярт, Прэзыдэнт Бэльгійскага Парляманту.

Яго Эксцэленцыя Міністар Юстыцыі й Культу, былы Прэм'ер, Фольен і Мадам.

Паўнамоцны Міністар Мэнье, прадстаўнік Міністра Замежных Справаў П. ван Зэлянд.

Былы Прэм'ер Міністар Эйскенс.

Сп. Ж. Воссэн, Галоўны Сакратар Міністэрства Нутраных Справаў.

Сп. Спрэўтэльс, Шэф Кабінэту Міністра дэ Тай — Міністра Народнага Здароўя й Сям'і.

Сп. Ван дэн Боррэн, Дырэктар Міністэрства Народнага Навучаньня, прадстаўнік Міністра Гармэль.

Праф. Лееманс, Дзяржаўны Дараднік.

Яго Эксцэленцыя Галоўны Архімандрыт Зільянты, Эгзарх манастыра Монт Олівэтто.

Пралат Заніні, Дараднік Нунцыятуры.

Пралат Аста Орлянда, Аўдытар Нунцыятуры.

Архімандрыт манастыра Монт Сэзар у Лювэне, Капэльле.

Дэ Уільс, Архімандрыт манастыра ў Афлігем.

Сп. Ансьё дэ Фаво, аташэ пры Кабінэце Міністэрства Замежных Справаў.

Сп. Сімонс, Эшвэн Прыгожых Мастацтваў места Лювэну.

Сп. Помба, Адміністратар Паліцыі для Чужынцаў.

Сп. Сэнатар В. Рагуля.

Праф. Жадэн.

Пав. а. а. Гарошка, Сіповіч і Чарняўскі.

Пав. а. Смаршчок, Старшыня СББ і Кіраўнік Інтэрнату Беларускае Моладзі ў Лювэне.

Партрэт Япіскапа Васіля, пад ім Яго ны зварот наступнага зьместу:

«Улюбленыя мае Браты й Сёстры, Беларускія Студэнты й Работнікі ў Бэльгіі! Няхай заўсёды ў сэрцах Вашых будзе Той, Хто сказаў: 'Любеце адзін аднаго, як я палюбіў вас' (10, 15, 12) і 'Я ваш Шлях, і Праўда, і Жыцьцё' (10, 14, 6), а Дух Гасподні будзе з Вамі, і ўсе людзі добрае волі будуць любіць і шанаваць Вас, і свабода каханае Беларусі будзе нагародаю нашаю тут на зямлі й вечнае шчасьце ў Нябёсах.

Ласка Вам і мір ад Бога Айца нашага і Госпада Ісуса Хрыста й лучнасьць сьвятога Духа з усімі Вамі. Амін. Року Божага 1952, люты, Нью-Ерк.

Сакратар Сьвяшчэннага Сабору Япіскапаў БАПЦ

† Япіскап ВАСІЛЬ»



Сьвятліца Беларускага Студэнцкага Дому. На сьцяне карта Беларусі з азначэньнем мясцовасьцяў, адкуль паходзяць студэнты. Выжэй з правага боку — Яго Эмінэнцыя Кардынал Тыссэран, зь левага — Яго Праасьвяшчэнства Япіскап БАПЦ Васіль.

Інтэрнат беларускіх вучаніцаў сярэдніх школаў у Лювэне

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

25-га Сакавіка у іншых асяродзьдзях Беларускае Эміграцыі

У Льежы
(Бэльгія)

Беларускія работнікі, якія пражываюць у Льежы й аколіцах, зарганізавалі абходзіны 34-ай гадавіны Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі ў нядзелю 23-га сакавіка. Сьвяткаваньне распачалося Службай Божай за Бацькаўшчыну й Гэрояў, што аддалі сваё жыцьцё за зьдзейсьненьне найвялікшых ідэалаў беларускага народу. Служба, якую адправіў а. Аўген Смаршчок, адбылася ў украінскай праваслаўнай царкве. Хор беларускіх студэнтаў зь Лювэну сваімі песьнямі дапаўняў той урачысты настрой, які панаваў у царкве. На заканчэньне Службы Божай хор адспяваў беларускі рэлігійны гымн «Магутны Божа».

Пасьля гэтага адбылася ўрачыстая акадэмія, якую адкрыў старшыня аддзелу Саюзу Беларусаў у Бэльгіі сп. Мытнік. У сваім уступным слове а. Аўген падчыркнуў вялікае нацыянальнае значэньне гэнай даты ў гісторыі нашага змаганьня за дзяржаўную незалежнасьць. Студэнт зь Лювэну сп. В. Кіпель прачытаў зьмястоўны рэфэрат аб ходзе гістарычных падзеяў, якія прывялі да вялікага Акту 25-га Сакавіка.

Пасьля рэфэрату адбылася мастацкая частка, на якую злажыліся дэклямацыі патрыятычных вершаў, а студэнцкі хор зь Лювэну выканаў песьні: «Падняты родны сьцяг дзяржавы» і «Пагоня». На асаблівую ўвагу заслугоўвала дэклямацыя верша «Я сын краіны беларускай», выкананая наймалодшым з прысутных Віцям Стрэчанем. Урачыстасьць закончылася адсьпяваньнем нацыянальнага гымну «Мы выйдзем шчыльнымі радамі».

А. Шацько

У Парыжы

Дня 30 Сакавіка парыская калёнія беларусаў абходзіла 34 угодкі Акту 25 Сакавіка.

Рана а гадз. 11 у беларускай капліцы пры Сан Сульпіцэ адбылася Богаслужба, адпраўленая айцом Гарошкай, а таксама ў украінскай Аўтакэфальнай Царкве — праваслаўная Богаслужба, адпраўленая беларускім сьвятаром архімандрытам Фінкоўскім.

Пасьля абеду ў памешканьні Хрысьціянскага Сындыкату пры напоўненай залі была наладжана акадэмія. Рэфэрат пра развой палітычных падзеяў 1914—1918 гг., акт 25 Сакавіка й далейшую барацьбу беларускага народу за незалежнасьць зачытаў сп. А. Яцэвіч — старшыня Аб'яднаньня Беларускіх Работнікаў у Францыі.

На мастацкую частку злажыліся дэклямацыі моладзі й некалькі песьняў солё, адсьпяваных сп. Жаўняровічам. Наступна сп. М. Наўмовіч падзяліўся з прысутнымі сваімі ўражаньнямі зь сьвяткаваньня 25 Сакавіка й адкрыцьця беларускага студэнцкага дому ў Лювэне, а наканец прамаўляў архімандрыт Фінкоўскі.

Агульным адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гымну закончана гэты ўрачысты дзень. **Х.**

У Ле Крэзо
(Францыя)

Беларусы гораду Ле Крэзо й аколіц дня 30. 3. 52 ладзілі ўрачыстае сьвяткаваньне Беларускага Нацыянальнага Сьвята абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі Актам 25 Сакавіка 1918 г.

Ўжо з самага раньня пачалі зьбірацца беларусы з места й аколіц перад французкаю сьвятыняю St. Charle. А гадзіне 11 была адпраўлена нашым каханым Айцом Чарняўскім Служба Божая за ўсіх палеглых у барацьбе за волю Бацькаўшчыны, за тых, каторыя й сяньня змагаюцца й за ўсіх тых, якія церпяць мукі ў лягерах і турмах. Пры гэтым Айцец Чарняўскі сказаў вельмі зьмястоўнае й кранаючае сэрцы казаньне, кульмінацыйным пунктам у якім было адчытаньне й паясьненьне Дзесяці Загадаў Беларуса, даных нам у спадчыне нашым мучанікам С. П. Айцом Гадлеўскім.

Пасьля супольнага сьброўскага абеду ўсе сабраліся ў залі Гарадзкое Управы, дзе адбылася сьвяточная акадэмія, прысьвячаная вялікаму гістарычнаму дню 25 Сакавіка 1918 году.

Як у Службе Божай, так і ў акадэміі вельмі лічны ўдзел узяло мясцовае ўкраінскае грамадзтва.

Акадэмію адкрыў кароткім прывітальным словам старшыня мясцовай філіі А. Б. Р. Ф. сп. Нагорны. Пасьля адсьпяваньня песьні «Беларусь наша Маці — Краіна» сп. Нагорны прачытаў рэфэрат на тэму дня й заклікаў прысутных ушанаваць мінутаю маўчаньня памяць змагароў за зьдзейсьненьне Сакавіковых ідэалаў.

Сп. Булыга прачытаў заклік генэрала Кушаля да Беларускіх Камбатантаў і Вэтэранаў. Наступна сп. Гасьціяў сказаў пару слоў, у якіх заклікаў да ўздыму нацыянальнага пачуцьця. Айцец Чарняўскі так-жа ўзяў слова, дзе паясьніў значэньне Сьвята 25 Сакавіка й якое закончыў малітваю «Сымбаль Веры Беларуса».

На артыстычную частку склаліся шматлікія вершы з патрыятычнае й народнае творчасьці дэклямаваныя сп. сп. Трусавым, Гасьціявым, Булыгай і Рашкевічам. Вялікі ўклад унёс сваім выступам 7-мі гадовы акардыяністы Аўген Трусаў, каторы адыграў беларускі народны танец «Лявоніха» й «Марш маладога баяністы», прысьвячаючы гэта спадарству Войтэнкам з удзячнасьці за апеку над ім, калі ён быў у сваім часе застаўся бяз бацькі. Сп. Нагорны адсьпяваў песьню «Дні праходзяць», якою разчуліў усіх сэрцы шмат каго аж да плачу й якую на выклік прысутных сьпяваў на біс.

На заканьчэньне гэтай вялікай урачыстасьці ўсе паўсталі й адсьпявалі Беларускі Нацыянальны Гымн.

Пры гэтым трэба зазначыць, што гэтае сьвяткаваньне яшчэ больш нас усіх падняло на духу й дадало новых сілаў для далейшае дзейнасьці на карысьць нашае Бацькаўшчыны Беларусі й звонкім рэхам адбілася між чужынцамі, аб чым сьветчаць атрыманыя зь іхняга боку словы прызнаньня.

Прысутны

У Мадрыдзе

Дня 25-га сакавіка сёлета беларуская студэнцкая калёнія ў Мадрыдзе належна адзначыла 34-ую гадавіну абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

З гэтае нагоды была адслужаная ўрачыстая Служба Божая ў капліцы Каледжу Сьв. Якуба, у якой прынялі ўдзел Дырэкцыя Каледжу, прадстаўнікі іншых нацыянальнасьцяў і беларускія студэнты.

Службу Божую адправіў а. Рафаэль Марцінэз Таўбман, капэлян Каледжу. Вечарам гэтага-ж дня ў Гішпанскім Нацыянальным Радыё ў Мадрыдзе была арганізаваная спэцыяльная аўдыцыя ў беларускай мове, на праграму якой склаліся: зварот да беларускага народу Прэзыдэнта Рады Беларускай Народнай Рэспублікі інж. М. Абрамчыка, беларускі рэлігійны гымн «Магутны Божа» й беларускі нацыянальны гымн.

Навязваючы да 34-ай гадавіны абвешчаньня незалежнасьці Беларусі, Славацкая Сэкцыя пры Гішпанскім Нацыянальным Радыё ў Мадрыдзе перадала ў праграме славацкай аўдыцыі спэцыяльны матарыял, прысьвечаны беларускаму нацыянальнаму сьвяту.

В.

У Брадфордзе
(Ангельшчына)

Беларуская калёнія ў Ёркшыр (Ангельшчына) у пяршыню адсьвяткавала Дзень Незалежнасьці ў сваім собскім доме. Праз увесь час трэба было шукаць прытулку й прасіць нейкае ласкі, каб наладзіць зборку ці адсьвяткаваць нацыянальнае сьвята. Цяпер гэтыя перашкоды ўжо пераможаныя. Дык Вялікі Дзень 25-га Сакавіка быў урачыста сустраканы ў сваей собскай хаце.

Дня 22 сакавіка сёлета айцец Аляксандар Крыт адслужыў малебен і прысутныя шчыра памаліліся за душы паўшых герояў Беларусі. Пасьля гэтага адбылася ўрачыстая акадэмія, якую адкрыў старшыня мясцовага аддзелу Згуртаваньня Бедарусаў Вялікабрытаніі сп. А. Бута й перадаў слова сакратару управы Акруговага Аддзелу ЗББВ сп. Паўлоўскаму. Трэйцім выступаў старшыня управы Дружыны Ёркс Згуртаваньня Беларускіх Камбатантаў сп. Я. Калбаса. Прывітаньне ад Вікарыяльнае Управы БАПЦ адчытаў сп. М. Гумен. Зьмястоўны й абшырны рэфэрат аб Акце 25-га Сакавіка прачытаў сп. А. Бута, які быў выслуханы прысутнымі зь вялікаю цікавасьцю.

У мастацкай частцы з дэклямацыямі выступілі сп. Лёля Міхалюк, якая прадэклямавала два вершы: «25 Сакавік» М. Машары і «Наша Краіна» Я. Купалы. Сп. П. Паўлоўскі прачытаў верш Я. Купалы «Годзе». Акадэмія закончылася адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гымну.

Я. Крушына

У Манчэстэры
(Ангельшчына)

Аддзел ЗББВ ў Манчэстэры ўрачыста адзначыў дзень Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі 23 Сакавіка. Перад урачыстасьцю а. А. Крытам была адслужана Богаслужба й малебен, прысьвечаны Дзяржаўным Сьвятам. Вялікая падзяка належыцца сп. сп. Абабурскім, якія ўпрыгожылі Богаслужбу сваім удзелам, як харыстыя.

Акадэмію адчыніў Старшыня Аддзелу ў Манчэстэры сп. Гуцько, які адначасна прачытаў і прывітальнае пісьмо ад Галоўнае Управы ЗББВ. Сп. Яськевіч прывітаў прысутных ад імя Беларускіх Камбатантаў.

Зьмястоўны рэфэрат з кароткім аглядам гістарычных падзеяў бел. вызвольнага змаганьня прачытаў сп. Шыркоўскі. Сп. Яськевіч прачытаў верш «25 Сакавіка». З пачуцьцём быў адсьпяваны бел. нацыянальны гымн, апошнія словы якога — «У крывавых муках мы народзім жыцьцё Рэспублікі сваёй» — прысутнымі вымаўляліся з асаблівай урачыстасьцю й моцай, якая выражала гатоўнасьць да змаганьня за Сакавіковы Ідэал.

Аглядчык

У Вініпэгу
(Канада)

Захадамі Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вініпэгу 30-га Сакавіка ў памешканьні украінскай чытальні «Просьвіта» ў Вініпэгу, было зладжанае сьвяткаваньне 34-й гадавіны Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі.

Урачыстасьць адкрыў, студэнт тэалёгіі Сьв. Андрэяўскага Каледжу ў Вініпэгу Сп. Міхась Мацукевіч сказаўшы: што толькі ў вольным сьвеце Захаду, а ў прыватнасьці ў Канадзе, можна так вольна й урачыста адсьвяткаваць, так вялікую ў гісторыі беларускага народу гадавіну, бо на землях Беларусі гэта забаронена . . .

Пасьля ўшанаваньня аднамінутавым маўчаньнем, памяць Яго Маестату памёршага караля Брытанскага Камэнвэльту Джорджа VI-га, з дакладам на тэму: «Абвешчаньне Беларускай Незалежнай Дзяржавы — як факт дакананы» выступіў сакратар БНК М. Сільвановіч.

Дакладчык войстра напятнаваў сучасную акупацыйную палітыку, расейскага акупанта Беларусі, падчыркнуўшы, што сучасная Беларусь паміма таго што зьяўляецца сябрам ЗН — ў запраўднасьці ня ёсьць чым другім, а толькі калёніяй Савецкай Расеі, а беларускі народ ніколі не злажыў зброі ў змаганьні за вольную й незалежную дзяржаву.

Пасьля афіцыяльнай часткі, сіламі Гуртка Мастацкай Самадзейнасьці Беларускай Народнай Песьні й Танцу пры БНК ў Вініпэгу пад дырэкцыяй Аляксандра Радчанкі, быў дадзены канцэрт, на які прыбылі Высокапастаўленыя госьці з сталіцы Канады Атавы, у асобах: слаўны канадыйскі фатаграф Ёсуп Карс з жонкай, Прадуктар Канадыйскай Радыёвай Карпарацыі Сп. Том Тайлёр, прадстаўнікі іміграцыйнага аддзелу сп. сп. В. Гаўгаў і Андрэвс Томсон, першы з Атавы, другі з Вініпэгу.

Высокамастацкае выкананьне нашых народных песьняў: «Нёман», «Песьняру», «Бульба» й другіх ведамым нашым сьпеваком Міхасём Радчанкам і выкананая самым дырэктарам гуртка Аляксандрам Радчанкам з спадарыняй Валяй Гарохавай, солё — Лявоніха захапілі гасьцей. Выканаўцы былі некалькі разоў выкліканыя на біс.

Пасьля заканчэньня мастацкай часткі слаўны мастак-фатограф Ёсуп Карс, выканаў дзесяткі фотоздымкаў з нашых артыстых, а ягоная жонка ведамая караспандэнтка зрабіла зацемкі пра жыцьцё Бееларусў ў Вініпэгу, для канадыйскіх журналаў.

Пра ўрачыстасьць мясцовая англамоўная прэса, прынясла сажнёвыя артыкулы й шматлікія фатаграфіі.

Мікола Вярба

У Сыднэю
(Аўстралія)

Дня 30-га Сакавіка сабраліся беларускія патрыёты ў Сыднэю, каб супольна адсьвяткаваць наша Народнае Сьвята. Айцец благачынны А. Кунцэвіч сваім багата абдораным голасам пераносіў прысутных думкамі на нашу далёкую Бацькаўшчыну, калі горача за яе маліўся й калі маліўся за наш народ і нашу ўладу. Хор зь сямі маладых хлапцоў пад кіраўніцтвам Айца Каменсакага й пры ўдзеле Айца Коломыйцэва (украінца) мілагучна адпейваў Айцу Анатолю.

Пасьля А. Благачынны ў гарачых словах заклікаў усіх прысутных да любові адзін другога, да злучэньня ўсіх навокал Беларускай Праваслаўнай Аўтакефальнай Царквы, да мірнага сужыцьця адзін з другім і не пакіданьня родных звычаяў. Усе прысутныя былі так узварушаныя, што многія плакалі — плакалі ўспамінаючы, што мы яшчэ на чужыне можам маліцца ў роднай мове, свабодна й адкрыта, а там на бацькаўшчыне пустуюць сьвятыні, у турмах гібеюць сьвятары й вернікі.

Пасьля Божае Службы адбылася сунольная акадэмія. За прэзыдыяльным сталом заселі ведамыя беларускія дзеячы. Быў прачытаны рэфэрат і паміма таго, што мова лектара была далёкай ад чыстай беларускай мовы, і паміма таго, што былі шматлікія нясьцісласьці гістарычныя, аднак апавяданьні дакладчыка аб тым, як на Случчыне й на Палесьсі беларускія вёскі ў імя акту 25 Сакавіка змагаліся й аддавалі жыцьцё за народную справу, глыбока ўсхвалявалі прысутных. Наступна маленькая дзяйчынка прадэклямавала верш «Слуцкія ткачыхі» і Сп. Я. Макарэвіч адчытаў некалькі сваіх нядрукаваных вершаў.

Акадэмію закончылі магутным адсьпяваньнем народнага гымну.

Заля была ўпрыгожаная беларускім і аўстралійскім сьцягам і Пагоняй.

Пасьля перапынку мелася адбыцца супольнае паседжаньне й выбары супольнага ўраду дзвюх партыяў. 21 голасам супраць 10 была вынесена пастанова, што прышлы Ўрад будзе прытрымоўвацца Статуту й ня будзе мяшацца ў ніякую палітычную групоўку. Тады Юрка Мілевіч з Камбэры, які ліча 22 гады, выступае з парадоксальнай прапазыцыяй, што пры выбарах ураду будзе галасаваць за сямёх чалавек, якія яму далі пісьмовае ўпаўнаважаньне. Гэтым зарубежнікі хацелі сабе здабыць абсалютную перавагу. Калі пасьля хаатычнага галасаваньня Старшыня сходу дазволіў Ю. М. галасаваць за сямёх (у тым ліку за славутага напасьніка, які збясчэсьціў скаўцкія ьцягі ў лягеры Міхэльсдорф Парэцкага, і ягоную жонку) усе сябры Беларускага Аб'яднаньня ў Новай Паўдзённай Валіі на заклік іх старшыні Сп. Лужыньскага пакінулі залю, бо з такімі «туманамі» няма чало трапіць часу. Сход пакінуў так-жа сакратар і віцэ-старшыня сходу.

(Заканчэньне на 9 балоне)

Прысутны

Кардынал Тыссэран візытуе беларускую моладзь

Дня 27. 3. 1952 па паўдні прыбыў Яго Эмінэнцыя Кардынал Тыссэран у асысьце Монсэньёра Літта, віцэрэктара лювэнскага ўнівэрсытэту, і айца Робэрта ван Кавэлярта зь візытай у інтэрнат беларускае моладзі ў Лювэне.

Ужо ад паўдня беларускі бел-чырвона-белы сьцяг з балькону дому абвяшчаў высокага гасьця Бэльгіі й Лювэну таксама й у беларускім інтэрнаце.

З хлебам і сольлю, паводля старога беларускага звычаю, спатыкаў дастойнага гасьця айцец Аўген Смаршчок і дзяўчаты інтэрнату ў нацыянальных вопратках.

Па беларуску й паводля царкоўнага абычаю прасіў айцец Аўген багаславенства ў высокага дастойніка Каталіцкае Царквы. Прамаўляючы далей па французку, айцец Аўген зазначыў, што ў беларускім інтэрнаце ўзгадоўваецца моладзь на добрых хрысьціянаў і шчырых беларусаў.

Беларускія студэнцкія арганізацыі й студэнтаў у Лювэне рэпрэзэнтавалі: старшыня ЦБАА сп. др. Б. Рагуля, заступнік старшыні БСЗ у Лювэне сп. Я. Запруднік, сп. Зора Савёнак, як студэнтка й настаўніца беларускай мовы ў інтэрнаце. Як госьць інтэрнату, прысутнічаў айцец Леў Гарошка.

Яго Эмінэнцыя цікавіўся дакладна колькасьцю дзяцей, размяшчэньнем дому й гародам, выказваючы зацікаўленьне важнай працай узгадаваньня маладой зьмены прышлага беларускага студэнцтва. Яго Эмінэнцыя пакінуў запэўненьне, што супольнымі сіламі ўдасца разьвіць пачатую вялікую справу.

Гаспадыня інтэрнату, спадарыня Сасэн частавала гасьцей чорнай кавай.

Мір.

Кардынал Тыссэран на аўдыенцыі ў Бэльгійскага караля

Рэха 25-га Сакавіка у бэльгійскай прэсе й радыё

Ужо даўно мінула сьвята 25-га Сакавіка й інаўгурацыі Беларускага Студэнцкага Дому ў Лювэне, але бэльгійскія газэты й часапісы ўсё яшчэ адгукаюцца на гэтую падзею моцным рэхам.

Перад намі антвэрпанская газэта «Дэ Газэт» з чацьвёртага красавіка г. г. даволі абшырны артыкул у ей загалоўлены: **«Тыссэран у Лювэне. Галоўнай мэтай ягонага прыезду ў нашую краіну зьяўляецца адкрыцьцё Беларускага Студэнцкага Дому».** А далей, між іншага, газэта піша:

«Акрамя гэтага цэнтру, беларускія студэнты маюць яшчэ адзін дом, зарганізаваны імі для беларускага юнацтва. Студэнты лічаць вельмі важным тварэньне свае эліты тут, на эміграцыі . . .»

«Дэ Ньювэ Гідс» за 27-га сакавіка г. г. на версе, над загалоўкам зьмясьціла: **«24-ая Гадавіна Абвешчаньня Незалежнасьці Беларускае Рэспублікі».** Далей падаецца падрабязны прабег урачыстасьці й абставіны, якія прывялі да гэтага.

Прыемна адклікнулася аб сьвяце флямандзкая газэта «Гэт Ньюсбляд» за 26. 3. 52 г. У ей мы чытаем:

«Дом быў упрыгожаны зь вялікім смакам. На галоўнай сьцяне знаходзіўся цудоўны абраз. Балышыня беларускіх студэнтаў, хлапцы й дзяўчаты, былі ў нацыянальным адзеньні, і бель іхнае вопраткі выразна адбівалася ад іхных сур'ёзных твараў, на якіх пяражытыя трагэдыі пакінулі свае сьляды. Здавалася-б, што гэтыя маладыя людзі заўсёды маюць у сабе крыху суму й мэлянхоліі, што іх робіць яшчэ больш сымпатычнымі».

Не абыйшлося таксама й бяз кур'ёзаў. Так, напрыклад, камуністычная газэта «Дэ Родэ Ван» за 26-га сакавіка, гаворачы аб прыезьдзе Кардынала Тыссэрана ў Бэльгію, паведаміла, што ён мае наведаць у Бруксэлі «розныя беларускія ўстановы» (вядома, што беларускіх устаноў няма ў Бруксэлі, бо цэнтр беларускіх арганізацыяў знаходзіцца ў Лювэне).

Пра сьвяткаваньне 25-га Сакавіка й адкрыцьцё Беларускага Дому ў Лювэне было дагэтуль зьмешчана больш за 40 артыкулаў у французкай і флямандзкай мовах розных памераў і 12 фотоздымкаў Беларускага Студэнцкага Ансамблю ў 25-ці розных бэльгійскіх газэтах і часапісах.

Гэта толькі тое, што ўдалося выловіць з прэсы. Шмат чаго, напэўна, знойдзецца яшчэ пазьней, асабліва ў прэсе лякальнай, якая таксама шырака камэнтавала гэтую падзею.

Напасьледак у вечары 30-га сакавіка г. г. бэльгійскае радыё з Бруксэлі трансмітавала беларускі рэлігійны гымн «Магутны Божа» й малітву «Блажэнны», выкананыя Беларускім Студэнцкім Ансамблем на сьвяткаваньні 25-га сакавіка ў Лювэне.

Я. З.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Новыя вершы Натальлі Арсеньневай

Цыкль „Першае Кола"

(Заканчэньне. — Пачатак у № 11—12 «Бацькаўшчыны»)

ІЗНОЎ ВОСЕНЬ

Так, пэўне-ж праміне
ўсё:
нябёсаў сінь,
і вецер, любы мне, й кругі на воднай роўні,
і колас поўны,
і сьцябло гірсы,
патрэбнае, ці не,
усё міне ўсёроўна . . .
Як выйдзеш дзе далей,
за места, —
зіхацяць
яшчэ ў траве асот і чыстацелу зоркі,
ды кінулі пылець уцехаю жыцьця
і сэрцы,
й шэрых вуліц столкі.
Зноў восень . . . Зноў гарыць
над кудрай каміноў
увечары агонь пагары крывяністай.
і людзі, і муры
ў сьцень туляцца ізноў,
і жутлыя, і сонныя ўсе чыста.
Я ім не памагу
ні сонца распаліць,
ні стрэсьці зь вейкаў сон.
Іду я раньнем цьмяным
разблытваць той ланцуг,
што выкаваў калісь
нам на пакуту Кон,
да сяньня непазнаны.

КАБ МОЙ ГНЕЎ

Зльліў крывёю злавесны асеньні заход
вочы ўрослых карэньмі у змрок небаскробаў.
Гнеўны вецер
гарой гоніць хмары на сход,
долам — горне лісьцё у рудыя сугробы
Каб мой гнеў быў як гэты віхор, што гудзе
ў гарфах гнуткіх антэнаў, зрываючы струны,
прыкрай зольлю асеньні апырсквае дзень,
у разьяраных хвалях рагоча пярунна,
каб мой гнеў быў агнішчам, што паліць на пыл
і крамнёвыя скалы,
й сумленьні злачынцаў,
што маланкай запальвае вочы сьляпых,
што палае бяз часу, канца і пачыну,
каб мой гнеў не баяўся руін, ні крыві,
абяртаючы сёлы у попел і жужаль,
я-б зрабіла канцы ізь бядою,
завіць
не ўдалося-б ёй новы, засморганы вузел.
І сутоньнем, і ўдзень пад акном у мяне
мо' ўжо з тыдзень трапеча лісток на галіне . . .
Раззлуюся, спрабую, мо' гнеў пратне
век ягоны бязмэтны, зрудзелы,
і згіне,
мо' пакорліва ляжа ў сьцюдзёную гразь,
можа . . .
Чую, як кроў мне захлёствае вочы,
як агнём наліваюцца жылы, гараць
і аблічча, і думкі,
як сэрца грукоча.
Але ціха калышыцца жоўты лісток
на гальлі, зьзелянелым ад плесьні асеньняй.
Ужо ў восенскай цемры густой і ліпкой
ён здаецца ня рэчай, ня явай,
а сьценем.
І мне робіцца сорамна й горка стаяць
пад акном, твар у твар із сутоньнем
і клёнам,
бо я так-бы халеца, каб роспач мая
пакарала таго,
хто Радзіму палоніць!

ВУСЬЦІШ

Сівым сутункам ішла я . . . жыць.
Лісты шасьцелі,
я йшла усьцяж.
Ад іх жаўцелі гужы сьцяжын,
ад іх ратунку нямаш.
Здаецца, жоўцяй наліўся дзень,
рудая вусьціш паўзе зусюль,
у кажным кусьце . . .
душу нідзе
ад сьмерці жоўтай я ня ўтулю.
Ды, зьмяўшы шорах,
віхор узьняў
дождж жоўтых зораў з маіх сьцяжын.
Сатлелі дзесьці яны да дня,
я-ж, я паўз места паймкнула . . . жыць.

КУДЫ ТУГУ МЫ ДЗЕНЕМ

Бязь веры, бязь імкненьняў сэрца — пусьціня,
адцьвілая, зрудзелая, сухая,
дзе ўздыхае
адно бясплодны сухавей,
дзе цішыня
і то, здаецца, не такая.
Нічым ты гэтай пусьціні не наліеш,
ні радасьцяй пустою, ні ўцехай,
ня усьпеніш рэха
па ймклівых песьнях,
што былі калісь мае,
а сяньня — непатрэбны, сьцерты вехаць.
Мне сумна, што ізноў на сьвеце лістапад,
што лічаць ліпы зноў свае чырвонцы,
што сонца
так мала, што хаценьняў —
не дапяць,
што давядзецца ўсё калісьці скончыць.
Не,
буду зноў пяць, і верыць, як даўней,
і спадзявацца Сьвята Ўваскрасеньня,
інакш, дзе сьцені
асеньнія й чужога места сьнедзь,
і ўсю тугу мы дзенем?

АСЕНЬНІЯ ЛІСТЫ

Як плойма вераб'ёў,
што шуганула ў сінь,
ды хмараю рудой ізноў зямлю пакрыла, —
яны ўзьнімаюцца у свой асеньні вырай,
каб ссыпацца й сканаць на леташнім лісьці.
Але пакуль яны імкнулі ў вышу,
ў сьвет
як палыменных слоў разгойданыя нізка,
пазбыўшыся зямное цягі й ціску,
яны жылі, як з нас ніводзін ня жыве.
Бо мы глядзім адно пад ногі,
як брыдзем
размытаю дажджом жыцьцёваю дарогай.
Ня сьніцца нам сыйсьці зь яе на ногаць,
хай знаем —
завядзе у бездань, ці нідзе.
Мінае дзень па дні . . .
Што год — цяжэй ісьці,
ужо не паляцім, каб навет мелі крылы . . .
І вось, маўляў лісьцё, што зноў зямлю пакрыла,
канаем недзе й мы,
не шугануўшы ў сінь!

ХОЦЬ МЫ ЛІСТЫ

Хоць мы лісты, што восенскі віхор,
разгойдаўшы, мяце па далячынях сініх, —
карэньні нашыя ўпіліліся ў падзол
радзімай глебы і таму —
ня гінем.
Ня выкарчаваць нас сякерай, ці агнём,
сталёвай сеткаю ўкавалі мы суглінак.
Калі вярнуць, — вярнеце нас зь зямлёй,
із спадчынай дзядоў,
інакш яе ня кінем.
Адно, ці хопіць ёй, Радзіме, на гады
жывой вады й пажывы для згалелых?
І ў восенскім лісьці хтось, вецер мо', шасьціць:
Трывайце . . .
З вамі я . . .
Адзіны лёс мы дзелім.

25-га Сакавіка...

(Заканчэньне)

У Брысбэйне
(Аўстралія)

Брысбэйн: Дзень 29 Сакавіка быў сьвяточным днём у Брысбэйн. А гадз. 2-й па паўдні ў памешканьні З. Б. В. адбылася ўрачыстая зборка. Заля была перапоўнена беларускімі вайскоўцамі й грамадзянамі. Прыгожа красаваўся белчырвона-белы сьцяг і Пагоня. Урачыстасьць распачалася адчытаньнем шматлікіх прывітаньняў ад беларускіх і інша-нацыянальных арганізацыяў і пасобных адзінак. Быў прачытаны рэфэрат аб Акце 25 Сакавіка. Пазьней былі прасьпяваныя вайсковыя песьні. Пасьля гэтага разгарнуліся гутаркі. Гэты вялікі дзень 34-х угодкаў Акту 25-га Сакавіка прайшоў у падняцьці духу, маліцьве й ідэйных разважаньнях.

У Кэльмскот
(Аўстралія)

Кэльмскот: Кэльмскот гэта невялічкі гарадок, але ён стаўся цэнтрам беларускага жыцьця ў заходняй Аўстраліі. Тут паўстаў новы, але запраўды якасны й даволі колькасны аддзел З. Б. В.

У нядзелю 30. 3. ажыло маленькае мястэчка. Сюды прыбылі амаль усе беларусы, пражываючыя ў гэтым штаце, сябры З. Б. В., — усе, каб супольна адзначыць Вялікі Сакавіковы Дзень.

Урачыстасьць адчыніў старшыня З. Б. В. сп. М. Раецкі, былі прачытаныя шматлікія прывітаньні. Сп. Сейка прачытаў змястоўны рэфэрат.

Пасьля рэфэрату ўсе дружна выконвалі вайсковыя й патрыятычныя песьні. Урачыстасьць закончылася адсьпяваньнем Нацыянальнага Гымну. Шмат сілаў і надзеі й моцнай веры ў пазытыўны вынік далейшага змаганьня й працы для Бацькаўшчыны. Тут варта адцеміць, што гэта першы раз у штаце В. А. арганізавалі й дружна сьвяткавалі беларусы гэты Вялікі Дзень.

(Прадаўжэньне справаздачаў ізь сьвяткаваньняў 25-га Сакавіка ў наступным нумары)

Ізноў у Лендане

Той самы Лёндан . . . дымнаю вуаляй
Прасякнуты да саменькага бруку,
Насустрач лынуў мне маторнай хваляй,
Свайму знаёмаму працягваючы руку . . .

Той самы Гайд-Парк[1]), тое-ж Піккадылі[2])
Ткуць бакханаліі з туманных плямаў . . .
Ды толькі чэрствасьці халоднае ня змылі
Вагні распрысканыя трафікаў[3]), рэкламаў . . .

Пульсуй сабе, артэрыя абтоку,
Ірві сьвятлом імглу ды поцемкі густыя,
Мяне ня ўсмокчаш ты. Застаючыся
з боку,
Я буду ўсьцяж шукаць сваю стыхію.

Лёндан, 21. 12. 1951. **А. Будзіч**

[1]) Гайд-Парк зьяўляецца найбольшым гарадзкім паркам Лёндану, ведамым у цэлым сьвеце.

[2]) Піккадылі — найбольш ажыўлены пэнтр Лёндану.

[3]) Трафік — чырвона-жоўта-зялёныя ліхтары, што кіруюць гарадзкім вуліч-ным рухам.

Праездам праз Two Gates

Пранясьліся й сюдой два гады . . .
Гостэль скончанай казкай застыў.
І рапсодыі чорнай матыў.
Нейк бяздушна . . .
Ліхтарні ўсё сьняць
Па дарогах нязбыўныя сны.
У сьвятле іх, як пэрлы, зіхцяць
Пазнаю нашых буцаў сьляды
Кроплі поту і дзьве вясны . . .

Тамвортс, 26. 12. 1951. **А. Будзіч**

І чалавек хоць і жывы,
Але стаіць без галавы! —
Гаворыць дзядзька, хлопцам дзіва,
Усё іх цікавіць моцна, жыва.
— Я сам такую штучку знаю,
Што без памылкі адгадаю,
Як хто стаіць, ну, хоць бы ў сенях:
Ці на нагах, ці на каленях,
Ці ён там стане, ці ён ляжа!
— Вось гэта штука! — бацька кажа.
— І няўжо, дзядзька, адгадае?! —
Цікавасьць Яську забірае,
І не дае ніяк ён веры
І погляд кідае на дзьверы,
Бо хоча ён сваю асобу
У сені вынесьці на спробу.
— Ну, Костусь, пойдзем мы з табою? —
Ідуць і ў сенях між сабою
Вядуць параду, як пастаць,
Каб бацька ўжо ня мог згадаць.
Дамаўляюць хлопцы так і гэтак,
Бы вулей ставяць пад паветак;
Урэшце ўсё абмеркавалі,
Хітрэй ня трэба, як пасталі:
Адзін прыгнуўся ракушком,
Другі ў падлогу ўпёрся лбом.
— Ну, дзядзька, як мы тут стаіма?
— А так, як цюцькі за дзьвярыма! —
Ім бацька з хаты дзесь азваўся,
І раптам дружны сьмех падняўся.

XVII.

ВОЎК

У будні дні ўставалі рана:
ма калі хварэць на пана,
ма чаго чакаць панукі,
і работы поўны рукі —
ў закладайся на нядзелю.
зілась маці за кудзелю;
лей мужчыны абуваліся,
аю работу запрагаліся.
, пакуль не расьсвітае,
Антосю памагае,
Бо трэба кончыць з малацьбою,
Каб не карцела над табою.
Дарэктар сам з свае ахвоты
Ў гумно любіў рабіць налёты,
Бо ён быў хлопец працавіты
І да работы страх сярдзіты,
Хоць быў яшчэ малы і кволы, —
Адлічны хлопец і вясёлы!
Ідзе з двара часамі ў хату, —
Аб чым тут ходзіць Яську-хвату?
Ён на дрывотню, бярэ дровы;
Ён услужыць усім гатовы,
Гаспадаром і гаспадыні,
Бо што тут зробіцца хлапчыне?
Раз ён абцасам зачапіўся,
З дрыўмі зьнячэўку паваліўся
На крок, ня далей, ад парога,
Але ўсхапіўся і нічога,
І толькі глянуў на абцасы, —
Былі ў іх моладасьць і часы,
Калі рабілі выкрутасы
І на ігрышчы тупацелі,
А тут хадзіць больш не хацелі.
Таксама Ўладзя да работы
Больш, чым да кніжак меў ахвоты:
Любіў ён з цэпам завіхацца,
Або па лесе пацягацца,
Пабегаць з стрэльбай за лісамі
Ці за куніцай, ці тхарамі.
І бацька з гэтым пагадзіўся:
Што-ж? да навукі не радзіўся,
А вось мо' зь меншых што і будзе,
Няхай яны ўжо йдуць у людзі.
Алесь сядзіць, закон чытае
Або з сабою разважае,
А потым зноў у кнігу ўткнецца
І сам сабе штось засьмяецца.
У Кастуся «Родное слово»;
Ён сьлібізуе ўсё нанова,
Але склады штось ня выходзяць
І хлопца ў злосьць адно прыводзяць,
Бо Костусь — хлопец нецярплівы,
У гнеў прыходзіць абурлівы;
Яго падштоўхвае спакуса
Сказаць зьнявагу на Язуса, —
Чаму-ж бо ён не памагае,
Калі на гэта сілу мае?
А потым злосьць яго астыла,
Яму і прыкра і няміла,
Ён сам сябе ледзь ня кусае.
Ох, галава яго дурная!
І ні на грош няма ён кошту,
Яго хвалілі, а за вошта?
І хіба-ж Бог яго ня чуе?
Або яму Бог падаруе
Вось гэты страшны грэх зьнявагі?
Эх, Костусь, Костусь! Ты — брадзяга!

Выносіць сонца дзянёк новы
Скрозь гэты лес стары, хваёвы,
Дзянёк кароткі і прыветны.
Мароз бярэцца, паціскае,
Па лесе лускае, гуляе
І хусту тчэ на беражку.
За ноч падкінула сьняжку.

Міхал ідзе ў свае абходы,
А холад зімняе пагоды
Яго рухавіць і малодзіць.
І колькі тут разоў ён ходзіць!
Тут кажна сьцежка і дарожка
Яму даўно-даўно знаёма.
Міхал у лесе, як-бы дома:
Дзе ні ступала яго ножка!
Якіх куточкаў тут ня знае!
Міхал ідзе, сьляды чытае:
Вось тут танюткі ланцужок
Лёг так прыгожа на сьняжок —
То пара кропак, то дзьве рыскі,
Відаць, што мышчыны расьпіскі.
Другі малюнак, сьлед-трайчаткі
Па лесе кідаюць зайчаткі;
А ліс-хітрэц, выжыга чуткі,
Па сьнезе цягне шнур раўнюткі:
Сьлядок зь сьлядочкам супадае,
Бы лапка тут адна ступае.
Міхал ідзе. У лесе глуха;
Дарэмна зыкі ловіць вуха:
Вакол маўкліва і маркотна,
І лес застыў, глядзіць гаротна,
І толькі дзесь у ельняку
Шалпоча сойка на суку,
Ды стукне дзяцел троекратна.
Міхал ідзе адзін, пануры,
І сам ён хмур, і думкі хмуры,
Як гэты лес, сьнягамі сьцяты,
Або замоўлены, закляты.
Ды гэты лес, хоць ён і немы,
Але скрозь ціш халоднай дрэмы,
Скрозь гэты мёртвы сон зімовы
Вядзе зь Міхалам казкі-мовы.
У лесе кажная мясьціна —
Лужок, палянка, баравіна —
Асобны твар і выраз мае
І хоць што-небудзь выклікае
З таго, што памяць захавала.
Так! Тут было ўсяго нямала,
Тут частка жыцьця лясьнікова.
Ну, хоць-бы гэта вось дуброва!
Грыбоў улетку тут цьма цьмушча,
Народ сюды йдзе — гушчай-гушча.
Тут шум, тут крык, ту гоман, сьпевы
Аж разьлягаюцца ў ёй дрэвы.
І вось, бывала, пан прыкажа —
Сюды пасходзіцца ўся стража
І робіць цэлую параду,
Як, дзе хітрэй зайсьці ў засаду,
І ўсё на гэтых людзей бедных,
Ўсё з-за паноў тых ненаедных.
Садзішся, ловіш. А другая
І на білет рубля ня мае.
І мусіш драць і зь беднаты,
І вінават ня пан, а ты:
Не гаспадар злы — кажа ўсякі —
А гаспадарскія сабакі . . .
А гэты хвойнік абгарэлы!
Напэўна-б вышаў сказ тут цэлы,
Калі-б ад самага пачатку
Апавядаць вам папарадку;
Але Міхалу няпрыемна,
Бо й тут пан лаяўся дарэмна,
А ён стаяў, сьвяціў вачамі
Перад людзьмі і лясьнікамі.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Беларускія партызаны

(Ізь мінулага антыбальшавіцкага змаганьня)

Пад такім загалоўкам мюнхэнская расейская газэта «Голос народа« за 23. 3.52 памясьціла цікавы артыкул, у якім, на падставе матарыялаў Я. Маісеенкі и С. Палякова, пададзена некалькі эпізодаў із змаганьня беларускага народу супраць бальшавізму ў пэрыяд да 1934 г. У асьвятленьні партызанскага руху на Беларусі поунасьцю адсутнічае істотны ў ім нацыянальны аспэкт змаганьня, нават славутае Слуцкае паустаньне, якое вялося у імя ідэяу 25-га Сакавіка, прадстаўленае тут толькі як адзін з этапаў толькі антыбальшавіцкага змаганьня, без паказаньня ягоных пазытыуных мэтаў, тым ня менш, аднак, артыкул заслугоувае на ўвагу, так як ен перадае цэлы рад аўтэнтычных фактаў партызанскага руху на Беларусі. Дзеля гэтага перадрукоўваем яго тут поунасьцю.

Рэдакцыя

Ня гледзячы на рэпрэсыі — карныя экспэдыцыі, масавыя арышты і, як вынік, — растрэлы, турэмныя зьняволеньні, ссылкі, якім падлягала насельніцтва Беларусі, ягонае супраціўленьне савецкай уладзе, актыўнае й пасыўнае, ня спынялася і, бяз сумліву, ня спынілася й па сяньняшні дзень.

Збройныя выступленьні беларускіх антыбальшавікоў палягчаліся ўжо чыста мясцовымі ўмовамі, і непраходныя балоты й лясы сталі надзейным сховішчам для мнагалікіх партызанскіх аддзелаў. Слуцкае паўстаньне ў 20-ых гадох, палескія, полацкія й магілёўскія бунты, партызанцкія аддзелы Чырванца, «Бацькі-атамана», «Белай сьвіткі» і шмат якіх другіх, служаць яркім доказам нязломнага духу народу Беларусі.

У 20-ых гадох у Магілёўскай акрузе асаблівай папулярнасьцю карыстаўся аддзел Чырванца, які хаваўся ў Клімавіцкіх лясох. Сам Чырванец — студэнт, сын расстрэленага бальшавікамі селяніна. Улада, зразумела, абвесьціла яго «бандытам»; ён не чапаў насельніцтва, а нападаў толькі на чэкістых, паставіўшы сабе за мэту забіць іх, па магчымасьці, як найболей.

Мясцовае насельніцтва адносілася да яго вельмі спачуваюча. Калі, прыкладам, пасьля разьбіцьця аддзелу, Чырванца з таварышамі перавозілі ў турму, то ў лесе пад Крычавам на канвой быў зроблены напад, які каштаваў многа ахвяраў абодвым баком, але, на жаль, вызваліць палонных не ўдалося.

У тэй-жа Магілеўскай акрузе партызаніў у тыя гады яшчэ адзін аддзел, які ў бальшыні выпадкаў перахоўваўся недалёка ад Чаўсаў Кіраваў ім былы ахвіцэр царскай арміі із сваімі чатырмя сынамі й двумя зяцямі. Сярод непраходнага балота партызаны знайшлі востраў, і збудавалі на ім запраўднае асялішча, замаскаваўшы яго так, каб нават з самалёту немагчыма было яго заўважыць. Прабіраліся на гэты востраў пры помачы пераносных мастоў: у мясцох, ведамых толькі правадніком, пракладваліся лёгкія мосьцікі, і як толькі было пройдзена некалькі шагоў, — мосьцікі з заду забіраліся й перакладваліся далей.

Швагер «бацькі-атамана», заступнік камандзіра палка, што знаходзіўся ў Магілёве, дастаўляў аддзелу аружжа й амуніцыю. Партызаны часта ўваходзілі ў бой з аддзеламі НКУ, заоівалі таксама паасобных чэкістых. На працягу многіх год ім удалося хавацца ў лесе ад усякіх перасьледваньняў.

Адноўчы, летам 1933 году, калі лепшыя змагары аддзелу вярталіся на востраў з чарговага заданьня, іх падсьцярог у лесе буины аддзел ГПУ. Амаль усе партызаны былі перабітыя, а раненым, што асталіся, чэкістыя прымусілі пралажыць мосьцікі да вострава. Пасьля гвалтоунага бою партызанскае селішча было ўзятае. «Бацька-атаман», два ягоныя сыны й зяць былі заоітыя; астальным двум сыном удалося ўцячы. За сувязь з партызанамі сярод навакольнага насельніцтва было праведзена многа арыштаў; абвінавачаныя засуджваліся ня менш, як на 10 год зьняволеньня.

Апрача паўстаньняў і адкрытага супраціву, аказанага насельніцтвам, сільным быў таксама й пасыўны супраціў. Пасяліўшыся ў глухіх лясох і ледзьве праходных балотах, жыхары прадаўжалі й пры савецкай уладзе захоўваць свае абычаі й хрысьціянскі спосаб жыцьця. Трэба таксама адмеціць, што беларусы прадаўжалі захоўваць усе рэлігійныя абрады й сьвяты, адпраўлялі Божыя Службы, перахоўвалі сьвятароў і г. д. Камуністых і камсамольцаў сярод іх было вельмі мала.

Чыста мясцовымі ўмовамі тлумачыцца так-жа й тое, што з прычыны расьцярушанасьці насельніцтва калектывізацыя праходзіла вельмі туга, і нават яшчэ ў 1937 годзе ня была поўнасьцю закончаная. Навет у 1941 годзе ў Беларусі спатыкаліся такія вёскі, у якіх ня было ніводнага калгасу.

Нельга, напасьледак, не сказаць аб партызанскім аддзеле «Белая сьвітка». На працягу амаль 15 гадоў, уключна да 1934 году, гэты многалікі аддзел (у сярэднім каля 700 чалавек) змагаўся супраць бальшавізму. Усе спробы чэкістых знайсьці месцапрабываньня партызанаў аказваліся безрэзультатнымі — да таго часу, пакуль сярод самых паўстанцаў не знайшоўся прадажнік: памочнік начальніка штабу рэвалюцыйнага змаганьня з савецкай уладай — так сябе называў аддзел — Мікалай Уневіч із за асабістай помсты зьявіўся ў Віцебскае ГПУ й перадаў усе пляны знаходжаньня партызанаў.

Зімой 1934 году ў маленькім гарадку Вялічку разыграўся апошні акт трагэдыі гэраічных патрыётаў. Чэкістыя акружылі аддзел і перабілі яго амаль на палавіну. Многія дорага прадалі сваё жыцьцё, канчаючы з сабой апошнім выстралам. Тыя партызаны, што асталіся жывымі, усяго 316 чалавек, бальшыня якіх была раненая, былі ўзятыя ў палон — і «Белая сьвітка» перастала існаваць.

Раненыя былі адпраўленыя ў шпіталі. Іх старанна даглядалі, каб вылечыць, а потым «падгатаваць» да спэцыяльнай сэсыі Ваеннай калегіі Вярхоўнага суду СССР. У студзені 1934 году усім падсудным быў вынесены сьмяротны прыгавор.

27 студзеня, а другой гадзіне ночы, ў гарадзе Вялічку, за магільнай сьвятыняй прыгавор быў выкананы. Кіраўнік аддзелу Хведар Сыч, ягоныя памочнікі Каліненка, Вайцяхоўскі, Красінец, Турак і іншыя гэройскія патрыёты згінулі.

Але не загінула ні памяць аб іх, ні воля народу к свабодзе. Летам 1941 году Вялічк быў узяты нямецкай арміяй. Сваякі ўдзельнікаў «Белай сьвіткі», што яшчэ асталіся пры жыцьці, разам зь іншымі паставілі на месцы трагічнай пагібелі беларускіх гэрояў гранітны крыж-памятнік з надпісам:

«Гэроі, спакой вашаму слаўнаму мінуламу. Мы змагаемся й ідзём далей вашым слаўным сьледам ... Госпадзі, прымі іх у Царстве Тваім!»

Цяпер, зразумела, гэтага крыжа ўжо няма. Але надпіс быў зроблены ня толькі на ім, а і ў сэрцах усіх верных патрыётаў Беларусі — напрымірымых ворагаў бальшавізму.

УКРАІНСКАЯ ПРЭСА АБ 25-ЫМ САКАВІКУ

З нагоды 34-ай гадавіны абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі ўкраінская газэта «Хрысьціянскі Голас», што выходзіць ў Мюнхэне, у нумары 13 за 30 сакавіка 52 г. памясьціла спэцыяльную перадавіцу «Дружба й прыязьнь — зарука перамогі». Артыкул падрабязна спыняецца над паасобнымі этапамі беларускага вызвольнага руху, што прывялі да Акту 25-га Сакавіка, цытуе даўжэйшыя ўрыўкі з трох устаўных грамадаў і заканчвае наступнымі словамі: «Навязваючы да гэтых слоў (словы Акту 25 Сакавіка — Рэд.), прыходзіцца сьцьвердзіць, што далёка ня ўсе народы, якія прывыклі гаварыць пра волю народаў, далі Беларусі, як таксама Украіне, належнае падтрыманьне ў змаганьні за волю й справядлівасьць. Затое змаганьне супраць грознага супольнага ворага за аднаўленьне собскіх суверэнных дзяржаваў замацавала сярод паняволеных чырвонаю Маскою народаў пачуцьцё запраўднай дружбы й прыязьні.

І гэта ёсьць найлепшаю зарукаю рэалізацыі правоў гэтых народаў на вольнае, незалежнае жыцьцё».

Адпаведныя зацемкі аб сьвяце 25-га Сакавіка памясьціла таксама газэта «Украінські Вісті», што выходзіць у Новым Ульме, і газэта «Украінец-Час» — ворган украінскай эміграцыі ў Францыі.

Народны артысты Беларусі

Усім тым беларускім Установам і Арганізацыям, а таксама паасобным Грамадзянам, якія ў дзень 25 сакавіка — 34-ую гадавіну абвешчаньня незалежнасьці Беларусі прыслалі нам свае павіншаваньні, Рэдакцыя складае на гэтым месцы сваю шчырую падзяку.

Першы беларускі канцэрт у Монтрэалі

Толькі ў канцы мінулага году быў зарганізаваны ў Монтрэалі аддзел Згуртаваньня Беларусаў Канады, якое аднак ужо праявіла інтэнсыўную дзейнасьць на беларускай культурна-грамадзкай ніве й у галіне гуртаваньня беларусаў Монтрэалю, якіх тут — значная колькасьць. Першай публічнай імпрэзай Аддзелу было сьвяткаваньне гадавіны Слуцкага Паўстаньня, а апошняй — удалы публічны канцэрт ладжаны 9 сакавіка сёлета.

У праграму канцэрту ўваходзілі: п'еса Ф. Аляхновіча «Заручыны Паўлінкі», Адэлькі, сп-ня Монід у ролі Агаты дь сп. Валодзя Б. у ролі Пранціся заслугоўваюць шчырага прызнаньня.

Канфэрэнсье сп. Чопчыц весяліў прысутных сваімі жартаўлівымі апавяданьнямі, а сп-ня Грынько,здраджаючы варты ўвагі малады талент, выканала танец «Цукеркі». Пасьля на сцэне паявіліся Дзед Тамаш із сваёю Грыпінаю (сп Паўловіч і сп-ня Ч.), выклікаючы ў аўдыторыі вясёлы сьмех. Яшчэ быў выкананы «Фінскі камічны танец», а сяброўскі хор пад кіраўніцтвам сп. Чопчыца прасьпяваў «Слуцкія ткачыхі»

Аматарскі гурток пры Згуртаваньні Беларусаў у Монтрэалі

жартаўлівыя апавяданьні, народныя скокі, камічны «Лубок» ды выкананьне беларускіх народных песьняў.

Самае выкананьне п'есы выпала вельмі добра, зьдзіўляючы навет некаторых украінскіх знатакоў мастацтва. Ня гледзячы на тое, што сп. Сьпічонак у ролі Сьцяпана, сп-ня Лашук у ролі Альжбеты й сп-ня Шантар у ролі Паўлінкі выступалі першы раз на сцэне, яны аднак патрапілі ўліць усю душу ў свае ролі. Іншыя выканальнікі роляў: сп. Станкевіч у ролі Якіма, сп-ня Грынько у ролі «Дні праходзяць», «Зязюленька» і «Лявон». Канцэрт быў закончаны адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гымну.

Пры гэтым хачу ад імені Згуртаваньня Беларусаў у Монтрэалі злажыць шчырую беларускую падзяку Брацтву УАПЦ, Яго Вялебнасьці пратаярэю Слюзару, сп. сп. Кіпіба, Ішчук, Кульба за аказаную нам услугу.

В. Ждан,
Старшыня ЗБ у Монтрэалі

Гішпанская прэса аб Беларусі

Адзін з паважнейшых гішпанскіх штодзённікаў «El Pueblo» за 19 сакавіка зьмясьціў хроніку прэсавай агенцыі «Філь» — «Беларусь на сумленьні сьвету».

У гэтым даволі абшырным і цікавым артыкуле аўтар абзнаёмлівае гішпанскае грамадзянства зь гісторыяй і культурай Беларусі ды яе значэньнем і ўплывамі на жыцьцё й падзеі Эўропы. У артыкуле шырака насьветлены страшныя цярпеньні й цяжкае змаганьне беларускага народу, якое няўпынна із што раз мацнеючаю сілаю вядзецца за сваю вольную й незалежную дзяржаву.

У канцы аўтар выражае надзею, што хутка настане той мамэнт, калі ўсе беларусы, рассыпаныя па розных куткох сьвету, змогуць вярнуцца на сваю вольную й ад нікога незалежную бацькаўшчыну Беларусь.

АГУЛЬНЫ ЗЬЕЗД ЗГУРТАВАНЬНЯ ВЕЛАРУСАЎ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

Дня 26/27 красавіка сёлета ў Беларускім Доме ў Лёндане (52, Penn Road, London, N. 7) адбудзецца 6-ы Агульны Зьезд сяброў ЗБВВ. Зьезд гэты будзе мець вельмі вялікае значэньне для беларускай эміграцыі ў Вялікабрытаніі, паколькі ён адзначыць 5-цігадовы юбілей і снаваньня й дзейнасьці ЗБВВ.

Міхал ідзе, і думкі ходзяць
І ў пункт адзін яны прыводзяць:
Каб як зямлі сабе прыдбаць
І службы гэтае ня знаць,
Тады паны ўжо не пашкодзяць.
Ды толькі вось дзе закавыка:
Купіць зямлю — купіць ня лыка,
Тут грошы трэба — і ня сотка ...
Эх, брат, рука, рука каротка!
Дзе ўзяць? І розум тут ня зьмесьціць.
Але ўсё-ж думку Міхал песьціць,
Пад самым сэрцам яе носіць!
Яна зь ім заўжды: ў лесе, дома;
Яна яму даўно знаёма,
І нават ён, калі прызнацца,
Даўно жыве ўжо ў сваей хатцы.
А гэта хата вось якая.
Перш-на-перш выгляд добры мае;
Стаіць пры рэчцы ці крыніцы,
На ёй дзьве дымніцы-блізьніцы
З чырвонай цэглы і фарсісты.
У хаце ёсьць пакойчык чысты,
А вокны сьветлы і панадны,
І броўны ў сьценах вельмі ладны:
Шырокі, роўны, бяз прыточак
І жоўценькі, як той жаўточак.
Хлявец, гуменца — ўсё там нова,
І ўсё дакладная будова!
Пры доме сад, хоць невялічкі,
Ды добры сад, ніводнай дзічкі;
І тут навокал тваё поле, —
Раздольле тут табе і воля!
Працуй, ледзь з хаты толькі вышлі.
Але ўсё гэта — толькі мысьлі,
Эх, гэта толькі мары-кралі!
О, каб яны ды праўдай сталі!
У лесе глуха, цесна стала,
І смуткам цісьне лес Міхала,
І нейк маркотны ў гэтым боры,
Душа імкнецца на прасторы,
І вочы просяць сьвету, волі.
Міхал ідзе туды, на поле,
Дзе Нёман, выгнуўшыся дужкай,
Абводзіць лес прыгожай стужкай;
Але цяпер марозам скован
І ад людзкіх вачэй захован,
І толькі жолаб, нізка ўгнуты,
Ды лёд, ад сьнегу ветрам зьдзьмуты,
Яго дарогу вызначалі.
І ціха ўсё вакол. Маўчалі
Пад белай посьцілкаю далі.
Там, угары, дальш з-панад Нёмна
Сяло глядзела зь сіня цёмна;
Над ім стаяў дым белаваты,
Панура ў сьнезе ніклі хаты.
Міхал на горцы прыпыніўся.
Стаіць, бы сон яму тут сьніўся,
І тут усе тыя масьцінкі
Яго наводзяць на ўспамінкі.
Вось тут калісь — даўно было то —
Дзяўчына зь іх сяла, Дарота,
Купалася раз і ўтанула,
І сьмерць яе тут агарнула.
І гэта тут было здарэньне,
Калі на бераг, на каменьне
Гады два тры назад, вясною
Яхіма вынесла вадою,
Якога тыдняў тры шукалі,
Ды не найшлі й шукаць ня сталі.
Таксама тут і здань здалася, —
Аб ёй і гутарка вялася. —
Што быццам нехта на вадзе,
Яшчэ нябачаны нідзе,
Сядзеў і зь люлькі зацягаўся
Ды раптам зьгінуў, бы распаўся ...
Таемны вы, зямлі скрыжалі!
Чаго ў сябе вы ня ўпісалі!
Міхал раптоўна здрыгануўся,
Зірнуў за Нёман і прыгнуўся,
З-за хвойкі хціва выглядае
І дубальтоўку зь плеч зьнімае,
Увесь хвалюецца, дрыжыць:
Ваўчуга зь сёл сюды бяжыць
І проста валіць на Міхала!
Аж сэрца ў радасьці ўзыграла:
«Пастой-жа, брат, пастой, ваўчуга!
Ужо-ж спаткаю, валацуга!»
А воўк імчыцца, сьнег зьдзірае,
І толькі хвост яго мільгае;
Відаць далі яму дзесь жаху.
«Ну, брат Міхась, ня дай-жа маху!»
Ён брамкі ў стрэльбе адчыняе,
Прыклад падносіць да пляча;
«Ня так дасі ты стракача!»
Міхал паціху разважае.
А воўк ляціць. Вось ён на Нёмне ...
Вось ён за горкай ... ня відаць —
Ён будзе тут часін за пяць ...
«Трымайся-ж, браце, цэлься, помні!»
Міхал замёр, ня міргне вока:
Разьвязка скора, недалёка —
Вось-вось пакажацца зьвяруга! ...
Ды доўга гэта штось натуга —
Няма, а быць ужо пара!
Цьфу, ты! Што-ж гэта за мара?
Ўстае Міхал, глядзісць вакола,
Як-бы што страціў, невясёла,
А рукі ўсё яшчэ дрыжаць.
Ну, хоць-бы гада напужаць!
І дзе ён дреўся? дзе, праклятый?
Міхала рух бярэ заўзяты,
Ня возьме тропу ён ніяк,
Бяжыць управа наўскасяк,
А можа там яго спаткае.
А не, дык сьнег хоць запытае
Але й туды прабег дарма:
Там і сьлядоў яго няма.
Бяжыць назад — няма! — прапала!
Аж нейкі пот праняў Міхала.
Міхал на Нёман тут рванууся
І як зірнуў, аж здрыгануўся,
І ўсё ў ім раптам задрыжала,
Аж нават шапка ледзь ня спала,
Калі прычын Міхал дазнаўся:
У стрыжаню воўк шалпатаўся!
Міхала згледзіў — лясь зубамі!
І злосна бліскае вачамі.
Міхал хапае дубальтоўку
І хоча выстраліць у воўка,
А потым стрэльбу апускае
І воўка зблізка разглядае.
А ён — вось тут, бяры рукамі,
Завіс на лапах, як у яме;
Стрыжэнь глыбокі, лёд пакаты,
А бедны воўк, вадой падцяты,
Скрабе па лёдзе капцюрамі
І носам рые, рве зубамі
І ўвесь пружніцца і рвецца,
Але нічога не ўдаецца,
І ўсё слабее ў воўка сіла.
Ды страшна сьмерць, усім жыць міла!
Ён рэшту сіл ізноў зьбірае,
Мацней на лапы налягае,
Ды іх няма за што зацяць,
Яны слабеюць, сьлізгацяць
І толькі скробаюць па лёдзе,
Перабіраюць край стрыжэню,
Няма надзеі нават ценю
У той яго бядзе-прыгодзе, —
Няма, ваўчок, табе збавеньня!
Дарэмны ўсе твае імкненьні!
І не надоўга сілы стане
Вясьці з вадою тут змаганьне.
Слабее воўк і абмярзае,
А плынь усё больш падбірае,
І, барукаючысь з вадою,
Ён павярнуўся галавою
І ўскінуў погляд на Міхала.
Вачамі злосна ўжо ня косіць,
Глядзіць, як-бы ратунку просіць ...
Тфу, ты! аж шкода яго стала —
Так вочы жаласна глядзяць,
Ну, вось, даль-бог, шкада страляць!
Яшчэ раз, бедны воўк рванууся,
На сьпіну раптам павярнуўся,
Завыў жалобна і каротка
І — шуг пад лёд той, як калодка!
І зьнікла ўсё: жыцьцё, змаганьне,
І прагавітасьць паляваньня.
Міхал стаіць і разважае,
А потым голаву ўскідае,
Як-бы ён хоча папытаць,
Хоць тут нікога ня відаць:
«Ну, што ты скажаш, брат, на гэт

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Калоскі

№ 2 красавік 1952 — наш дадатак для дзяцей — Выходзіць раз у месяц

Возера Кромань

Пакінуўшы Сьвержань, шырокаю блакітнаю істужкаю плыве рака Нёман па шырокай даліне, сярод сенажацяў ды зялёных гаёў. Абгінае ён з поўначы Наваградзкае ўзгор'е, таму левы яго бераг тут няроўны й часта высока падымаецца над далінаю ракі.

На нізкім правым беразе Нёмана, на пяскох і балотах раскінулася вялікая Налібоцкая пушча. Рака Бярэзань із сваімі прытокамі прарэзвае ўва ўсіх кірунках пушчу, забірае ў ёй шмат вады й глыбокаю шматводнаю ўліваецца ў раку Нёман.

Ёсьць у пушчы й некалькі азёраў, зь якіх найбольшае й найглыбейшае возера Кромань.

Мясцовая легенда гаворыць, што вельмі даўно, шмат соцен гадоў таму назад, на месцы цяперашняга возера была ў пушчы вялікая паляна. На паляне стаяў хутар, а ў ім жыў стары Кромань з сынам і нявесткаю. Прыгожая й заможная была Кроманявая паляна ў вянку адвечных зялёных сосен!

Стары Кромань з сынам зімою палявалі на дзікую зьвярыну ў пушчы, а летам даглядалі ў дуплях старых дрэў пчолак, ад якіх мелі мёд і воск.

Аднойчы, стаміўшыся на працы ў лесе, стары Кромань з сынам ляглі адпачываць у хаце. Нявестка з малым дзіцем выйшла з хаты й села на лаўцы пад шырокай расахатай ліпой. Палажыла яна сваё дзіцятка ў сябе на прыполе, калыхала яго й ціха сьпявала яму песеньку. Было вельмі горача, сонца пражыла няміласэрна.

У гэтым часе выйшаў зь лесу на паляну старэнькі чалавек з сукаватым кіем у руцэ й, кульгаючы, накіраваўся на хутар. Ішоў ён паволі, пот кроплямі сплываў зь яго твару, дрыжачаю рукою апіраўся ён на кій, цяжка дыхаў і нага, відаць, яму балела. Падыйшоў ён да ліпы, дзе сядзела нявестка, нізка пакланіўся й слабым хрыпаватым голасам прагаварыў:

«Мая ты, маладзічка! Мая ты, добрая! Дай мне хоць трохі халоднае вады напіцца. Сяньня такая гарачыня, такая сьпёка, што ледзьве дацягнуўся да вас зь лесу, стаміўся зусім і аслабеў.

Нявестка моўчкі прыглядалася на старога, а пазьней зь нейкай пагардлівай усьмешкай і злосьцю адказала: «Няма тут для цябе вады. Вунь там за плотам сьцежка ёсьць. Ідзі тою сьцежкаю аж у лес, можа-ж не памрэш у дарозе, а ў лесе крынічка ёсьць, там і нап'ешся».

Старэнькі ўздыхнуў, замігалі яго вочы, абцёр рукавом з твару пот, губы яго зашавяліліся, але нічога не сказаў, павярнуўся й паволі пайшоў, кульгаючы, адкуль прыйшоў.

А нявестка й далей калыхала на прыполе сваё дзіцятка. Пазьней яе самую пачаў марыць сон. Задрамала, але скора скрозь драмату пачула, што кругом нешта вельмі моцна зашумела, быццам пушча ў навальніцу. У гэтым-жа часе пырснула вада ў твар жанчыны. Яна адчыніла вочы й із страху замёрла: усюды кругом зь зямлі біла высокімі фантанамі вада, усё ўжо на панадворку плавала. Раптоўна задрыжэла, закалыхалася Кроманявая паляна й з шумам глыбака правалілася ўніз, а вада зараз-жа запоўніла ўтворануюяму па самыя берагі. І там, дзе перад некалькімі часінамі расла высокая сакавітая трава й мноства рознакалёрных пахучых кветак, зь якіх пчолкі зьбіралі мядок, беглі цяпер адна за другою зеленаватыя, халодныя вадзяныя хвалі й зь ціхім шумам паласкалі берагі новаўтворанага возера Кромань.

Ад таго часу, пасьля гарачага летняга дня, калі ўвечары паверхня возера й акаляючыя яго чароты, кусты й дрэвы засьцілаюцца густым туманом, выйходзіць з возера жанчына з маленькім дзіцем на руках. Яна цэлую ноч ходзіць у тумане й паміж дрэваў і кустоў шукае старэнькага кульгавага дзядулю, каб напаіць яго халоднаю вадою.

Алесь

ВЯЛІКДЗЕНЬ

Голасам магутным загрымелі звоны, —
Па блакітным небе ў блеску сонца кос
Палілісь ўрачыста радасныя тоны,
Бо Хрыстос памёршы ў трэці дзень ўваскрос,
Вецярок вясьняны з радасьці сьпявае,
Птушак пералівы ймкнуцца ў вышыню,
А вясна на ліры гымн Хрысту іграе,
Гожа прыбірае краскамі зямлю.

І ты, наша моладзь, ранамі Хрыстуса
Збаўлена ад грэху, зрок ўзьнясі увысь!
Удзячнаю малітвай добраму Ісусу,
Сэрцам і душою, горача малісь!

Знаемімся між сабой

Шырока разьліўся ў 1948 годзе прыгожы Дунай, а як-жа весела было гуляць над ім і плюскацца ў вадзе.

Ведалі гэта добра вучні беларускай народнай школы ў Остэргофэне. І як-жа часта цэлай клясай разам з настаўнікам, які так добра вёў гульні, выбіраліся над Дунай.

Усе дзяўчаткі, у той час скаўткі-пралескі, і усе хлопцы — ваўчаняты пакінулі нязычлівую Нямеччыну. Выэмігравалі ў багатую Амэрыку, там — і настаўнік, асталася тут толькі адна Рая С.

Яна часта ўспамінае сваіх сяброваккралесак, але й у новым лягеры сяньня яна знайшла некалькі беларускіх дзетах і гуляе зь імі.

А вы: Ніна С., Маня Л., Поля Г., Рая В., Валя В., Валя Л., Герда К., Ліля К., Надзя Г., Зіна К., Лёля М., Ірка Ц., і вы хлопчыкі, як вам паводзіцца сяньня?

Адгукнецеся й напішыце ў нашую газэтку!

Ці не забыліся вы бел. нар. школы ў Остэргофэне й таго, што там вучыліся?



Але гэтым разам навет тата не сварыўся, бо ведаў, што бедны Непаслухмянка і так ужо быў даволі пакараны.

З гэтага часу зьмяніўся Непаслухмянка й стаў добрым і паслушным Грызігарэшкам.

Цётка Гандзя



Казачка аб вавёрцы Непаслухмянцы

На скраю старой дубровы стаяў таўшчэзны, магутны дуб. Тут, у дзюпле жыла адна вавёрчына сям'я, у гнязьдзе з травы й карэньняў. Сям'я складалася з таты, мамы й трох дзяцей, дзьвюх дзяўчынак і аднаго хлапца.

Бацька меў сьветла-бранзовую афарбоўку й такі прыгожы пушысты хвосьцік. Ён быў надта суровы. Мама насіла цямнейшае футра, яна была добрая мама й заўсёды бараніла сваіх дзетак перад бацькам, калі той хацеў пакараць іх за непаслухмянства. Дзеці часта былі непаслушнымі, асабліва найменшы Рызігарэшак, так яго й празвалі Непаслухмянкай.

Дзьве сястрычкі: Хуткаскочка й Рыжы Хвосьцік былі мілыя й вясёлыя дзяўчынкі й трымаліся крыху здалёк ад малога Непаслухмянкі, які ўсьцяж меў у галаве недарэчныя жарты.

Калі, напрыклад, у цені разложыстага дуба сядалі людзі, каб адпачыць, Непаслухмянка кідаў ім на галовы малыя жалуды або вылушчаныя шышкі.

У нядзельку часта ўся сям'я выбіралася ў госьці да добрай цёткі, якая жыла аж на самым узгорку каля развалінаў старога замчышча. Смачнымі ядранымі гарэшкамі частавала іх цётка

Але ў гэтую нядзелю Непаслухмянка меў застацца ў хаце, бо меў ён страшны катар. Мама зрабіла яму кампрэс, абвязала насаткай, якую раней была знайшла пад дубам, і моцна забараніла вылазіць зь цёплай пасьцелькі.

Хутка стала вельмі сумна й нудна малому Непаслухмянцы й ён выхіліўся з гнязда, каб зірнуць, што робіцца на сьвеце, бо — ці то здалося яму — нешта ў траве зашалясьцела. Так, так, там ёсьць нешта ў траве. Бліснулі чорненькія вочкі цікавасьцю й у вадзін мамэнт быў Непаслухмянка ўнізе разам із сваім кампрэсам. Глянуў у вадзін бок, у другі — нічога не заўважыў — аж раптам — што за страх, вось узьнімаецца страшная гадзюка перад ім і шыпіць із злосьцю. Хоча малы Непаслухмянка бегчы, але ўжо абвілася зьмяя навокал яго і вось рыхтуецца затруць сваім сьмяротным ядам.

Ажно — вось чуе скамянелы із страху Непаслухмянка — скок — скок — гэта-ж сястрычкі! Хуткаскочка й Рыжы Хвосьцік скачуць да хаты (забылася мама гасьцінец, які прыгатавала для цёткі й выслала па яго дзяцей).

І якраз у гэты мамэнт, калі зьмяя ўжо ўхапіла сваімі ядавітымі зубамі беднага Непаслухмянку, — скок! — і Хуткаскочка была ўжо каля зьмяі. Рыжы Хвосьцік пасьпяшалася за ёй і пачалі яны біць злую гадзюку сваімі хвосьцікамі-мяцёлкамі й пачалі яе дзерці сваімі пазуркамі. Скарыстаў з цудоўнае дапамогі Непаслухмянка й хутка быў у гнязьдзе, у пасьцельцы.

Вось і бацькі зьявіліся, не дачакаўшыся дзяўчынак. Як убачылі яны зьмяю, скочылі на дапамогу.

Пераможаная гадзюка ўцякла ў кусты.

І калі бацькі набліжаліся да гнязда, убачылі яны на галінцы дуба насаткукампрэс і яны ўжо ведалі, што й на гэты раз Непаслухмянка астаўся верным сваёй мянушцы.

Вялікодная песьня

Абыякава, бязь ніякай радасьці глядзелі вочы старога настаўніка Зарэчнага на першыя праявы вясны: як увачавідкі зелянелі азіміны, як зь зялёнай травы на ўзгорку выхіляліся першыя веснавыя краскі, над якімі ўвіхаліся згаладаўшыя пчолкі, як сьпяшаліся, працавалі на блізкіх дрэвах птушкі.

Здавалася, што глыбокія фалды, што барозьнілі ягоны твар, яшчэ больш паглыбляліся. Такім чужым да ўсяго гэтага рухлівага сьвету за ягоным акном адчываў сябе настаўнік і такім нешчасьлівым.

Набліжаўся Вялікдзень. Вось роўна год, як ён захварэў і ня быў у школе. Праўда, можа дзеці й не адчулі зусім ягонай адсутнасьці. Прыйшоў на яго месца заступнік з суседняй вёскі — малады настаўнік і ягоны здаровы, сардэчны сьмех здабыў адразу штурмам маладыя сэрцы вучняў.

Даўно забыўся, развучыўся так сьмяяцца настаўнік Зарэчны, але ўсё-ж думкі ягоныя ўвесь час блудзілі па так добра знаёмым яму школьным пакоі.

Вось і цяпер устала перад змучанымі вачыма настаўніка, як жывое, апошняе здарэньне ў той апошні дзень перад ягонай хваробай. І ўсяму вінен быў гэты Пятрусь — як заўсёды прыйшоў у школу зь неадробленымі лекцыямі й зусім не навучыўся Вялікоднай Песьні ды яшчэ пасьміхаўся сабе, як-жа скочыў тады ён, як разьлаваўся. А хворае сэрца зваліла настаўніка з ног. А ці ён, Пятрусь гэты, ці ўспомніў яго калі? — Напэўна не, забыўся й цешыцца нейдзе, што ён захварэў і ня будзе больш яго змушаць вучыцца напамяць вершаў.

У міжчасе здарылася й зь Пятрусём малая прыгода. Гэта было падчас летніх канікулаў. Ужо добра зьмяркалася, як паслала Пятруся матка з збанком малака да хворае цёткі. Сьпяшаючыся хлопчык, зьбіў з ног старую бабку Алесю на павароце каля школы й у прыдачу абліў яе новую хустачку малаком — сырадоем.

Узлавалася бабка, калі пазнала Пятруся — «Бачыце яго, які хват, мала табе яшчэ, чарцянё, што настаўнік празь цябе захварэў, я сама чула, як ён у гарачцы тваё імя ўспамінаў. Ну глядзі-ж, калі ён памрэ, ты будзеш вінаваты.

Крэкчучы пайшла бабка ў вуліцу.

А Пятрусь стаяў, словы бабкі Алесі прыкавалі яго да месца, уся істота хлапца адчула нейкі нявымоўны страх. Ці-ж можа гэта быць, што ён можа стацца прычынай сьмерці чалавека? Праўда, ужо на другі дзень пасьля таго здарэньня, як захварэў настаўнік, неяк няёмка адчуваў сябе Пятрусь, а цяпер? О, Божа! — ён-жа ня ведаў, што так здарыцца, ужо запраўды ляпей было навучыцца тую Вялікодную Песьню, хоць так заўсёды мала часу меў на навуку Пятрусь.

Ніколі так памалу ня йшоў Пятрусь да хаты, ішоў і прыпыняўся, і разважаў. І вось ясна яму цяпер стала, што ён-жа любіў свайго старога спадара настаўніка, хаця ён ня быў такі вясёлы, як гэты новы. І захацелася нешта прыемнае яму зрабіць. Але што? Нічога яму ня прыходзіла ў галаву, нічога ня прыйшло й у наступныя тыдні. І ня раз успамінаў ў доўгія васеннія вечары Пятрусь хворага настаўніка, аж аднаго разу асьвяціла яго думка-бліскавіца.

Так, ён ужо ведаў, што ён зробіць, толькі трэба пачакаць, пачакаць да Вялікадня.

І прыйшоў чаканы Вялікдзень.

Сонца залаціла зялёныя даліны й лясы, далікатна разыходзіўся ў сьвежым паветры пах першых красак. У вакно выглядаў хворы настаўнік і тужыў за чалавекам, за жывою істотаю, зь якой-бы мог замяніць хоць колькі словаў, каб забыцца, адсунуць хоць на нейкі час тую настырлівую думку аб сьмерці, якая канчае ўсё — усе згрызоты й боль, а можа й не канчае, як зразумець Цябе Цудоўнае Ўваскрасеньне?

Нехта пастукаў у дзьверы і, не чакаючы на заклік, увайшоў Пятрусь. У левай руцэ ён трымаў чырвонае вялікоднае яечка. І калі ён глянуў на сумны, змучаны, знаёмы твар свайго настаўніка, яго агарнуў такі жаль, што ён хацеў заплакаць, але перамогся.

— «Спадар настаўнік, я вывучыў Вялікодную Песьню» — радасна сказаў хлопчык, і не чакаючы на дазвол, пачаў выразна й павольна з акцэнтам, так, як любіў настаўнік, дэклямаваць:

Хрыстос уваскрос! — гудуць званы,
Хрыстос уваскрос! — ім лес уторыць.
Ўсё цёплым подыхам вясны
Толькі аб тым пяець, гаворыць.

Водгук находзіць у душах
Той пераможны вясны звон.
І навет лютай сьмерці жах
Нам з сэрцаў вымятае ён.

Нас ня пужае жорсткі лёс,
Нас вера моцная жывіць:
Што, як прырода й Хрыстос,
Ўваскрэсьнем мы, — каб вечна жыць...

Сьлёзы цяклі з вачэй настаўніка ўсё шпарчэй і шпарчэй, і здавалася яму, што змываюць яны той цяжар, які даўно адчуваў ён у сабе, праясьніўся той шэры туман, які засьцілаў яму сьвет, бо вось дадзена яму зразумець, што было раней ад яго схавана. У Песьні Вялікоднай быў адказ на ўсё, чаго ён шукаў, у песьні, якую так прыгожа сказаў, крыху зьбянтэжаны Пятрусь, бо-ж ніколі ня бачыў ён, як плакаў яго настаўнік.

— «Скажы мне яшчэ раз яе, Пятрусёк!» — папрасіў ён. І Пятрусь пачаў нанова й сам ён пачаў адчуваць нешта вялікае й непераможнае ў словах песьні. Нясьмела працягнуў Пятрусь чырвонае яечка, на якім былі выдрапаныя словы: «У довад шчырага каханьня».

Настаўнік узяў яечка, доўга яго разглядаў і ўрэшце засьмяяўся так шчыра и свабодна, што й Пятрусь пачаў сьмяяцца таксама.

Яны былі шчасьлівыя абодвы, яны ведалі, што заўсёды любілі адзін аднаго й так прыемна ім было ў трох, бо й Хрыстос быў зь імі й цешыўся разам.

І калі настаўнік вярнуўся ў школу, меў ён, праўда, тыя самыя барозны на твары, але вочы яго глядзелі так радасна, так ясна й ужо на першай сваей лекцыі знайшоў ён нагоду засьмяяцца.

І зьдзівіліся дзеці, але былі надта задаволеныя, што іх настаўнік так прыгожа ўмее сьмяяцца й ясна ім стала, што гэта-ж яго заўсёды яны найбольш любілі, і пачалі старацца, каб цяпер яму гэта пры кажнай нагодзе выказаць.

Ад часу да часу адсоўваў настаўнік Зарэчны шуфляду ў сваёй шафе, дзе ляжала чырвонае вялікоднае яечка з словамі: «У доказ шчырага каханьня», і кажны раз адчуваў ён нанова, які вялікі скарб можа быць схаваны ў такім малым хлапцоўскім сэрцы.

Не забыўся й Пятрусь праз усё сваё жыцьцё Вялікоднай Песьні й чым старэйшы ён быў, тым лепш яе разумеў і цешыўся, што ў канцы жыцьцёвага шляху ня сьмерць, але сьветлае Ўваскрасеньне.

З.

Шпакі прыляцелі

Тату, маму й малога хлопчыка Толіка перавезьлі ў другі лягер. Толіку новы лягер вельмі спадабаўся. Тут было шмат дрэваў, кустоў, кветак. Яшчэ зімою ён заўважыў, што на некаторых дрэвах былі прымацаваныя нейкія будачкі. Зімою яны былі пустыя. Толік вельмі сябраваў із сваім дзедам, хадзіў гуляць зь ім і аб усім яго распытваў. Дзед яму й растлумачыў, што гэтыя будачкі завуцца шпакоўнямі. У іх вясною й летам жывуць птушкі-шпакі. Людзі любяць шпакоў за іх прыгожыя сьпевы й за тое, што яны на палёх, сенажацях і садох зьнішчаюць шкодных чарвякоў, вусяніцаў, жукоў ды іншых мошак. Шпакі на зіму адлятаюць у цёплыя краі, а на вясну вяртаюцца да нас.

Вось адзін раз дзед разьбіў старую скрынку й сказаў Толіку: «Пара рабіць нам хатку шпаком, хутка будзе вясна». Толік старанна дапамагаў дзеду. Трымаў дошчачкі, падаваў гвазды. Калі шпакоўня была гатовая, дзед прарэзаў дзюрачку й прыбіў каля яе два калочкі, каб шпакі маглі сядзець ля сваёй хаткі. Пастанавілі прымацаваць шпакоўню на высокую старую ліпу, што расла пад вакном Толіка. Шпакоўню прымацавалі так, каб сонейка сьвяціла ў дзюрачку. Шпакі любяць і рады сонейку.

«Ну, Толік, хатка гатовая, чакай гасьцей» — сказаў дзед. Толік зь нецярпеньнем чакаў і ўсё паглядаў на ліпу.

Аднойчы раніцаю Толік радасна закрычаў: — «Глядзеце! хутчэй сюды, ужо прыляцелі шпакі. Вунь чорныя два сядзяць ля шпакоўні. Адзін ужо палез і ў сярэдзіну». Шпакі васяла сьвісталі. Назаўтра Толік бачыў, як яны насілі ў сваіх дзюбках у хатку сухую траўку, саломку, пер'е. Гэта яны рабілі мяккую пасьцельку для сваіх маленькіх дзетак.

Ліпа адзелася лісьцём, якім амаль закрыла ўсю шпакоўню. Толік часта сядзеў зь дзедам на лаўцы пад ліпаю й слухаў сьпевы шпака. Дзед расказваў, што цяпер там у шпакоўні ёсьць яечкі, зь якіх хутка выйдуць птушаняткі. Толіку вельмі хацелася паглядзець, што робіцца там, але дзед перасьцярог яго й сказаў, што ў гэты час птушачку ня можна пужаць і трывожыць.

Аднаго дня Толік заўважыў, што шпакі нешта носяць у дзюбках у хатку, адтуль быў чуцён піск. Ён адразу здагадаўся, што зь яечак вывяліся

(Заканчэньне на 12 балоне)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Некалькі словаў адказу

(у парадку дыскусыі)

З закідамі рэлігійнай абыякавасьці беларуская інтэлігенцыя спатыкаецца ўжо ня першы раз. Раней аб гэтым пісалі праваслаўныя япіскапы, што паходзілі зь Беларусі й належылі да Расейскай Зарубежнай Царквы, думаючы пры помачы гэткіх выказваньняў асягнуць сваю мэту — убіць клін паміж шырокімі масамі вернікаў і інтэлігенцыяй і загнаць гэтую масу ў расейскую царкву. Масы аказаліся, праўда, лепш нацыянальна ўсьведамленыя, чым гэта здавалася расейцам, і ўсюды, дзе былі групкі беларускай інтэлігенцыі, расейская акцыя спаткала належны адпор.

Цяпер гэтай справай занялася другая старана — каталіцкая. У нумары 46 часапісу «Божым Шляхам», у артыкуле а. Сіповіча пад загалоўкам «Рэлігійныя крывулі нашае інтэлігенцыі», знаходзім такія самыя цьверджаньні. З увагі на тое, што артыкул зьмешчаны ў рэлігійнай прэсе можна было-б не займацца ім ў вагульнай прэсе, аднак парушаныя ў ім праблемы, якія закранаюць ня толькі рэлігійныя, але й нацыянальныя справы, змушаюць заняцца разглядам некаторых цьверджаньняў, у ім зьмешчаных.

Айцец Сіповіч цьвердзіць, што да голасу беларусаў на сьвеце мала прыслухоўваюцца, бо ня могуць прыслухоўвацца й верыць людзям, якія наракаюць, што на бацькаўшчыне няма свабоды арганізацыяў, а самі тут у вольным сьвеце мала цікавяцца арганізацыйным жыцьцём; людзям, якія наракаюць, што на бацькаўшчыне лютуе прасьледаваньне рэлігіі, а самі тут у вольным сьвеце жывуць безрэлігійным жыцьцём. А. Сіповіч сьцьвярджае, што калі ў некага ўчынкі супярэчаць словам, дык такому чалавеку ніхто не паверыць.

Ужо ў першай частцы цьверджаньня а. Сіповіча ёсьць нутраная супярэчнасьць, бо цяжка сабе ўявіць такую асобу, што ня цікавіцца арганізацыйным жыцьцём, а адначасова наракае на нястачу свабоды арганізацыі.

Калі-ж справа йдзе пра нараканьні на факт прасьледу рэлігіі ў Савецкім Саюзе, дык трэба гэта сказаць ясна й адкрыта, што незадаваленьне з такога стану выклікана шмат у каго з пасярод інтэлігенцыі не асабістай патрэбай, але ўважаньнем, што павінна быць свабоднае выкананьне рэлігійных практыкаў, але не рэлігійнага прымусу, для тых, хто гэтага патрабуе.

Беларуская інтэлігенцыя стаіць у гэтай справе на становішчы аднаго з французскіх энцыклёпэдыстаў, які сказаў аднаму із сваіх апанэнтаў, што ніколі ня згодзіцца зь ягонымі паглядамі, але гатоў аддаць свае жыцьцё за тое, каб гэны апанэнт меў магчымасьць выказываць свае погляды.

У крытычных выказываньнях а. Сіповіча аб беларускай інтэлігенцыі ёсьць аднак і цьверджаньне, якое павінна ўважацца за пахвалу, хіба мімавольную. А. Сіповіч цьвердзіць, шо ў гутарках аб дамаганьні беларускасьці царкоўных арганізацыяў цяжка пачуць выразна сфармуляваны рэлігійны сьветапагляд, у імя якога стаўляюцца гэтыя дамаганьні. Для тых, што гэтыя вымаганьні стаўлялі, справа ўвесь час была ясная, для тых-жа, для каго яна неясная, можна ўдакладніць. Дамаганьні беларускасьці рэлігійных арганізацыяў вынікаюць не з рэлігійнага, але нацыянальнага сьветапагляду, які лічыць, што незалежна ад догмаў данае рэлігійнае арганізацыі, калі выклад гэтых догмаў робіцца для беларусаў, дык павінен адбывацца ў беларускай мове.

За мора крыві й сьлёз, пралітых у Савецкім Саюзе, аўтар робіць адказным абыякавасьць да рэлігіі, якая была ў расейскай інтэлігенцыі, і, паклікаючыся на Апакаліпсіс, заклікае да гарачасьці ў рэлігійных справах. Адносна абыякавасьці расейскай інтэлігенцыі да рэлігіі, дык здаецца, што гэтая абыякавасьць ня была вялікшай, чым у іншых народаў. Абыякавасьць гэная мела таксама сваю прычыну ў факце існаваньня прымусовасьці рэлігійных практыкаў для вялікай часткі інтэлігенцыі, што знаходзілася на дзяржаўнай працы й у падтрыманьні праваслаўнай царквою існуючага ладу, які быў зьненавіджаны гэтай інтэлігенцыяй. Цікава было-б даведацца чаму, паводле а. Сіповіча, за абыякавасьць расейскай інтэлігенцыі плацяць сягоньня вугорцы ці палякі?

З пункту гледжаньня нацыянальнага заклік да рэлігійнай гарачасьці даволі шкодны, бо-ж, як піша а. Сіповіч, праўдзівай зьяўляецца толькі адна рэлігія. Паколькі-ж кажны чалавек з гарачым рэлігійным пачуцьцём будзе ўважаць сваю рэлігію адзіна праўдзівай, дык гэта ніякім чынам ня прычыніцца да палепшаньня адносінаў паміж людзьмі. Калі даны народ зьяўляецца аднаверным, дык ягонае гарачае перакананьне аб адзіна праўдзівасьці ягонай рэлігіі не зьяўляецца яшчэ так шкодным, але ў народзе, які зьяўляецца аднарэлігійным, занадта гарачае перакананьне ў адзінапраўдзівасьці сваёй рэлігіі можа прывесьці толькі да павялічэньня колькасьці канфліктаў паміж сябрамі аднае нацыі, прыналежных да розных рэлігійных арганізацыяў.

У сувязі з гэтым становішча беларускай інтэлігенцыі, часта ня вынікаючае з глыбейшай прадуманасьці, а хутчэй інстынктоўнае, аднак правільнае. Беларуская інтэлігенцыя лічыць, што незалежна ад пажаданасьці свабоднага выкананьня рэлігійнай практыкі, занадта вялікая гарачасьць у рэлігійных справах зьяўляецца для беларускага народу ня вельмі пажаданай, бо вядзе толькі да тварэньня канфліктаў на ўзлоньні народу.

З пункту гледжаньня нацыянальнага лепшай формулай зьяўляецца гарачасьць у супольных нацыянальных справах і цёпласьць у справах, якія зьяўляюцца толькі справаю часткі народу.

У свой час на захадзе Эўропы панавала рэлігійная гарачасьць і ў сувязі з гэтым былі доўгія пэрыяды рэлігійных войнаў ці навет проста ліквідацыя іншаверцаў. Цяпер на гэтым самым абшары рэлігійныя справы зрабіліся з гарачых цёплымі й якраз гэтая цёпласьць робіць немагчымай рэлігійныя войны й дае людзям магчымасьць карыстацца з свабоды сумленьня.

Гісторыя павучае нас, што лепш, калі кажны вернік будзе хоць на дне душы мець сумліў, ці ягоная рэлігія зьяўляецца «адзіна праўдзівай».

В. Мікалаеня

Новыя тэхнічныя культуры на Беларусі

Да нядаўна галоўнай тэхнічнай культурай на Беларусі, што вырашчвалася ў вялікім маштабе, быў лён. Наш лён яшчэ перад першай сусьветнай вайной заваяваў сабе вялікую славу на міжнародных рынках і прыносіў вялікія даходы. Як сьцьвярджае інж. М. Абрамчык у сваей працы «Аб прыродных багацьцях Беларусі», «зь беларускім лёнам ня можа канкураваць ніводнае гаспадарства».

РАЗВОДЖАНЬНЕ КОК-САГЫЗУ

Пасьля першай сусьветнай вайны адзін беларускі вучоны прытарнаваў да балоцістай глебы паўдзённай Беларусі й да беларускага клімату азыяцкую расьліну, званую кок-сагыз, карэньні якой даюць вялікі працэнт натуральнага каўчуку (гумы). Хутка аказалася, што расьліна гэтая ў нашых умовах добра родзіць, таму пачалі яе разводзіць у вялікім разьмеры, засяваючы ей сотні й тысячы гэктараў. Бяручы пад увагу, што ў паўдзённай Беларусі шмат балоцістай глебы (Палесьсе), пэрспэктывы далейшага ейнага разьвіцьця вялізарныя.

Сяньня нельга дакладна сьцьвердзіць, колькі зямлі ў Беларусі адводзіцца пад кок-сагыз і колькі атрымліваюць зь яго каўчуковых карэньняў, бо савецкія статыстыкі апэруюць, як правіла, толькі працэнтамі, а ня лічбамі абсалютнымі. У кажным выпадку ёсьць пэўным, што разводжаньне гэтае цэннае расьліны адбываецца на вялікіх зямельных плошчах, якія з кажным годам усьцяж павялічваюцца, і што з ураджаю беларускага кок-сагызу савецкая індустрыя мае вялікія прыбыткі.

Гэтак сакратар ЦК камуністычнай партыі Беларусі Н. Патолічаў на 8-ым партыйным пленуме 24. 1. 1952 г. заявіў, што, у прыраўнаньні да папярэдняга году, пасевы кок-сагызу былі ў 1951 г. павялічаныя больш чым у два разы. Тамжа даведваемся, што калгасы Любанскага раёну выканалі плян здачы дзяржаве карэньняў кок-сагызу на122 %, Церахоўскага раёну — 112%, Петрыкаўскага — 110% і г. д. У 1950 г. найвышэйшы ураджай быў дасягнуты ў межах 30 цэнтнараў з гэктара, а ў некаторых калгасах Любанскага раёну — навет 100 цэнтнараў з гэктара. Да гэтага часу каўчукаводствам галоўным чынам займаліся калгасы Бабруйскай, Менскай, Гомельскай, Палескай і Магілёўскай акругаў, а ў 1951 г. ўпяршыню сталі сеяць гэтую расьліну яшчэ пяць новых акругаў («Зьвязда» за 27. 1. 1952).

Трэба ведаць, што гума адыгрывае сяньня першарадную ролю ў розных галінах прамысловасьці й зьяўляецца вельмі цэнным матарыялам. Краіны заходняй Эўропы прывозяць каўчук з цёплых краінаў або вырабляюць яго сынтэтычна. Таму наш кок-сагыз, які мае ў Беларусі вялікія пэрспэктывы разьвіцьця, можа стацца аднэй з найважнейшых і найбольш даходнай тэхнічнай культурай будучай незалежнай Беларусі.

ЦУКРОВЫЯ БУРАКІ Ў БЕЛАРУСІ

Пачынаючы з 1949 г. у Беларусі пачалі фактычна ўпяршыню сеіць у палявых умовах цукровыя буракі, якія таксама даюць добры ўраджай. Аб разводжаньні цукровых буракоў у Беларусі даведваемся зь менскай «Зьвязды» за 16. 1. 1952 г. (І. Цімчук: «Цукровыя буракі ў Беларусі»), хаця й тут ураджай гэтай культуры, як і адводжаная для яе пасяўная плошча падаецца, на жаль, толькі ў працэнтах у прыраўнаньні да папярэдніх гадоў. І так, прыймаючы пасеўную плошчу 1946 г. за 100%, газэта інфармуе, што ў 1950 г. яна павялічылася да 144%, а ў 1951 г. — да 240%.

Цукровыя буракі дагэтуль разводзіліся на Беларусі толькі ў Горадзенскай акрузе, а ў бягучым годзе ўпяршыню будуць яны засеены ў вакрузе Баранавіцкай. Што гэтая культура мае на Беларусі ўсе дадзеныя добра разьвівацца, сьветчыць тое, што нядаўна ў Ськідэльскім раёне Горадзеншчыны быў пабудаваны буйны цукровы завод. Аднак і тут бяздарныя спосабы балышавіцкага гаспадарваньня далі свае адваротныя вынікі. Нявыкананьне пляну й поўная адсутнасьць элемэнтарнага ўменьня разводжаньня цукровага бурака былі прычынай, што ў мінулым годзе завод, ня маючы сыравіны, больш стаяў бязьдзейна, чымсьці працаваў над вырабам цукру. Гэтак, прыкладам, у калгасе імя Леніна Ськідэльскага раёну было пасеяна 162 гэктары буракоў. Зь іх адзін толькі гэктар, які прыпадкова быў аброблены правільна, даў 160 цэнтнараў буракоў, а ўсе астальныя — у 3—4 разы меней. У калгасе імя Сталіна гэтага-ж раёну было адведзена пад цукровыя буракі 160 гэктараў. Але з прычыны дрэннай і няўмелай працы 11 гэктараў пасеваў зусім прапала, а астальныя далі ўраджай вельмі нізкі.

Ня гледзячы на гэтыя няўдачы, выкліканыя хвальшывай сыстэмай калгаснай гаспадаркі, у Беларусі ёсьць усе ўмовы для разводжаньня цукровых буракоў і вырабу собскага цукру. Таму й гэты прадукт у будучай вольнай Беларусі станецца адным з важнейшых жаролаў нацыянальнага даходу.

Р. С.

УВАГА, БЕЛАРУСЫ ЎСІХ КРАІНАЎ!

Адна прыязная да беларусаў бэльгійская газэта згадзілася ў сваей цьнкаграфіі рабіць бясплатна кліше для «Бацькаўшчыны». У сувязі з гэтым Рэдакцыя мае намер зьмяшчаць агульныя й усебаковыя справаздачы з жыцьця й дзейнасьці беларускай эміграцыі зь ілюстрацыямі ў кажнай краіне ейнага расьсяленьня. Фатаграфіі да кліше павінны быць на матавай, а не глянсаванай (бліскучай) паперы, якія, разам з рукапісамі просім як найхутчэй высылаць на наступны адрас у Бэльгіі:

Dr. Borys Ragula
43, rue Leopold, Luovain. Belgium

На гэты-ж адрас просім таксама перасылаць прыгатаваныя да друку працы з розных галінаў беларусаведы й літаратурныя творы нашых пісьменьнікаў, якія будуць выдадзеныя друкам.

ДА НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ

Некаторыя чытачы «Бацькаўшчыны», асабліва ў заакіянскіх краінах, прысылаюць нам грошы за газэту ў пісьмах. Гэтыя грошы часта да нас не даходзяць разам ізь пісьмамі. Таму на будучыню просім ніякіх грошаў у пісьмах нам не перасылаць, а слаць іх афіцыяльна, адкуль гэта можна, а адкуль ня можна, накіроўваць іх на адрас нашых Прадстаўніцтваў у дадзенай краіне.

Чытайце, выпісвайце й пашырайце адзіную беларускую тыднёвую незалежніцкую газэту на эміграцыі —

«БАЦЬКАЎШЧЫНУ»!

Абавязкам кажнага беларуса ёсьць прыдбаць новых падпішчыкаў для — «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»!

Зьезд беларускіх камбатантаў у Бэльгіі

«За Веру Хрыстову й Бацькаўшчыну Беларусь жыцьцё сваё палажыўшых...» моліцца беларускі сьвятар а. Аўген у беларускай праваслаўнай капліцы ў Лювэне. Капліца напоўненая маладымі беларускімі камбатантамі, якія тут, як і некалі на палёх баёў за Бацькаўшчыну, стаяць плячо к плячу й глыбака схіляюць галовы ў малітве за паўшых сяброў на розных фронтах змаганьня за дарагую нашую бацькаўшчыну Беларусь. Нявідочная сіла злучае гэнага беларускага работніка з маладым студэнтам з закончаным інжынерам ці дыпляваным лекарам.. Розьніцы зьнікаюць, бо розьніцы гэныя чыста павярхоўныя. У грудзях студэнта, інжынера й лекара й у грудзях работніка б'ецца тое самае гарачае баларускае сэрца, а душу точыць той самы нясьцерпны боль-туга за роднымі гонямі, за тым, што так далёка й так блізка, так дорага й так балюча. З тым самым сэрцам, з той самай душой і тым-жа нясьціхаючым болем моліцца за беларускіх жаўнераў свой беларускі сьвятар.

Прысутнічае шмат іншанацыянальных гасьцей. Яны захопленыя беларускім царкоўным хорам, які натхнёны сваім дырыгентам сьпявае нашыя малітвы з асаблівым пачуцьцём.

Урачысты гадавы сход адчыняе ўступаючы старшыня сп. Цімафейчык. Пасьля гэтага была прасьпяваная жаўнерская малітва, а пазьней пачаліся прывітаньні. Спачатку прывітаў прысутных а. Робэрт ван Кавэлярт, Сакратар Камітэту Дапамогі Беларускім Студэнтам,, пэтым др. Барыс Рагуля, як прадстаўнік ураду БНР, прывітаў зьезд ад імя Прэзыдэнта БНР, прадстаўнік Нацыянальнай Украінскай Гвардыі ў Бэльгіі й напасьледак беларускі прадстаўнік з Ангельшчыны сп. А. Лашук.

Цікавы рэфэрат на актуальныя вайсковыя беларускія тэмы быў прачытаны сп. Юрым Сенькоўскім, ведамым да гэтага часу нашаму грамадзянству з салёвых выступленьняў зь беларускімі песьнямі. Тэма была даволі глыбока прадуманая й закранула нязвычайна цікавыя й актуальныя праблемы. Справаздачы, дыскусыі, здаровая будуючая крытыка, якая не забылася таксама падчыркнуць вялізарных заслугаў уступаючага ўраду, пляны працы на будучыню — усё гэта сьветчыла аб маладой энэргіі й вялікім энтузыязьме нашых камбатантаў у Бэльгіі. Сярод гэтай студыюючай моладзі й работнікаў мы бачым і сп. сэнатара Рагулю, які жыва цікавіцца жыцьцём лювэнскага асяродзьдзя й захопліваецца ягоным няспынным ростам, ягоным сьмелым маршам у будучыню, ягоным бязьмежным патрыятызмам і вялізарнаю ахвярнасьцю для нацыянальнай справы. Ня дзіва зусім, што прадстаўнік з Ангельшчыны, ад'яджаючы сказаў: «Я пачуваю сябе малодшым на некалькі гадоў, вашае асяродзьдзе дадало мне сілы да далейшай грамадзкай працы й веры, што гэтая праца прынясе пажаданыя рэзультаты». Прывітальнай тэлеграмай Прэзыдэнту БНР М. Абрамчыку й генэралу Ф. Кушалю ды нацыянальным гымнам закончыўся гадавы зьезд беларускіх камбатантаў у Бэльгіі. Пасьля сьвяточнага абеду адбылася мастацкая частка з удзелам студэнцкага хору й з аддзелам жаўнерскага гумару ў выкананьні сп. Шчэцькі.

У новы ўрад Беларускіх Камбатантаў у Бэльгіі ўвайшлі: Тодар Цімафейчык — старшыня, Аляксандар Марговіч — сакратар і Юры Сенькоўскі — скарбнік.

А. С.

Інстытут Беларусаведы у Мадрыдзе

Пры Цэнтры Абмены Эўрапэскай Культуры ў Мадрыдзе зарганізаваўся Інстытут Беларусаведы імені Льва Сапегі. Гэты Інстытут зьяўляецца сэкцыяй вышуспомненай арганізацыі й ставіць сабе за мэты: разьвіцьцё й пашырэньне розных студыяў і навуковых досьледаў, якія адносяцца да беларускае нацыі й беларускай дзяржавы ў мінуўшчыні й сучаснасьці. Спэцыяльным прадметам досьледаў Інстытуту маюць быць наступныя галіны: філязафічная, юрыдычная, эканамічная, гістарычнасацыяльная, этнічная, філялягічная, літаратурная, фальклёрыстычная й артыстычная. Дасьледваньне праблемаў, асьпірацыяў і тэндэнцыяў беларускага народу абзнаямленьня зь імі краінаў Заходняй Эвропы, спэцыяльна Гішпаніі й краінаў гішпанскае мовы, як і народаў Ісляму. Інстытут спэцыяльна ставіць сабе за мэту вывучэньне міжнародных узаемадачыненьняў, якія мелі месца ў гісторыі паміж Беларусяй і краінамі Заходняй Эўропы, як рэлігійных асабліваснцяў беларускага народу.

Старшынёю Цэнтру Абмены Эўрапэйскае Культуры быў назначаны на старшыню Інстытуту Беларусаведы Прынц Тодар Ляскарыс-Комнэно, першы асыстэнт пры катэдры права на мадрыдзкім універсытэце, на сакратара — Ул. Рыжы-Рыскі.

Дня 24-га сакавіка сёлата ў клюбе «Мэдына» адбыўся канстытуцыйны акт Інстытуту Беларусаведы, пасьля чаго мела месца акадэмія, у праграму якой уваходзіў рэфэрат старшыні Інстытуту на тэму «Беларусь і Эўропа». Дакладчык шырака насьветліў галаўнейшыя гістарычныя падзеі Беларусі ў мінуўшчыні ў сучаснасьці, падкрэсьліваючы трагічны лёс і цярпеньні беларускага народу, які цяпер стогне пад маскоўска-бальшавіцкім ярмом.

Акадэміяй кіраваў, як ейны старшыня, біскуп Закарыяс дэ Вскарра.

Аб самым акце адкрыцьця Інстытуту, як і аб дакладзе ягонага старшыні былі зьмешчаныя зацемкі ў некалькіх мадрыдзкіх газэтах.

Адрас Інстытуту, на які просіцца кіраваць усю карэспандэнцыю й прэсу, а так-жа наладжваць сувяць, наступны:

Illmo Sr. Don Uladyslau Ryzy-Ryski,
Apartado de Correos 6.026 — Madrid, Espana.

V.

ЯШЧЭ АДНО ВЫСТУПЛЕНЬНЕ Ў БРУКСЭЛІ

Пасьля апошняга канцэрту ў Бруксэлі, аб якім чытачы чулі ўжо з «Бацькаўшчыны», некаторыя з прысутных бэльгійцаў запрапанавалі сп. праф. М. Равенскаму даць яшчэ адно выступленьне ў большай залі. Разумеючы ўсе цяжкасьці (эгзамены ледзь не на носе) студэнты ўзялі на сябе ўсю арганізацыю гэтага канцэрту. Праф. Равенскі, як шырака ведама, чалавек з добрым сэрцам. Людзі просяць, — як-жа адмовіцца? Парадзіўшыся з ансамблеўцамі, згадзіўся.

І вось у суботу 5-га красавіка сёлета Беларускі Студэнцкі Ансамбль выступіў ізноў перад бруксэльскімі глядачамі. У праграму ўваходзілі рэлігійныя, нацыянальныя й народныя песьні й танцы, вакальныя салёвыя выступленьні, творы для піяніна сучасных беларускіх кампазытараў ды патрыятычныя песьні. Амаль кажны з слухачоў меў у руках праграму, на адвароце якой, апрача ўводнага слова аб беларускай народнай музыцы, быў зьмешчаны кароценькі нарыс гісторыі Беларусі ды змаганьня беларускага народу за незалежнасьць сваей бацькаўшчыны.

Уступнае слова сказаў ужо добра ведамы беларускай эміграцыі, наш вялікі прыяцель а. Робэрт ван Кавэлярт. Пасьля — прадугледжаная праграма. Канцэрт прайшоў зь вялікім пасьпехам; пасьля некаторых нумароў прыходзілася чакаць даволі доўга, пакуль заля ня сунімецца з воплескамі. Але хваліць Ансамбль гэтым разам хіба ня варта, бо чытачы могуць ужо зьняверыцца ды падумаць, калі-ж ім урэшце дзе-небудзь ды што-небудзь ня ўдасца? Аднак хай будзе довадам посьпеху тое, што адразу пасьля канцэрту Ансамбль атрымаў запросіны выступіць з канцэртам у бруксэльскім радыё.

Трэба спадзявацца, што ансамблеўцы неяк і на гэта выкамбінуюць час. А зь ім цяжка — эгзамены блізка, а яшчэ трэба як найхутчэй закончыць насьпеўваньне грамафонных плітак і, да гэтага. яшчэ й у гэтым месяцы даць даўно ўжо абяцаныя два канцэрты ў Парыжы.

Вось каб можна было прытачыць крыху гэтага часу!...

Ул. Немановіч

Прадстаўніцтвы „Бацькаўшчыны“

ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ:

1. **У Бэльгіі:**
   Mr. Karas Leonid, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.
2. **У Ангельшчыне:**
   The Whiteruthenian Editorial Foundation 52, Penn Road, London, N. 7. England.
3. **У Францыі:**
   Mr. Symaniec Vladimir, 15, rue du L... Boncour, Neuilly s/Seine, France.
4. **У З Ш А:**
   Mr. B. Danilovich,
   222 Suydam St. New Brunsvick. N. J. U. S. A.
5. **У Канадзе:**
   Mr. Joseph Corny. 270 Clinton Str. Toronto, Ont., Canada.
6. **У Аргентыне:**
   Asociacion Bielorusa en la Argentina calle Coronel Sayos 2981, 4 de Junio prov. Buenos Aires. Argentina.
7. **У Аўстраліі:**
   Mr. Jackievic Donat, 60 Fisher Street, East Brisbane, Q-ld, Australia.
8. **У Вэнэцуэлі:**
   Dudzickj Vladimir, Crucesita a San Miquel 74, Caracas, Venezuela.
9. **У Новай Зэляндыі:**
   Mr. Karanieuskj Marjan, Burns Izonse, Mosgiel, New Zeeland.

Непасрэдна з гэтых прадстаўніцтваў просім суродзічаў выпісваць «Бацькаўшчыну» і там-жа разьлічвацца за газэту.

Шпакі прыляцелі

(Заканчэньне)

птушаняткі, а іх тата й мама носяць ім чарвячкоў, жучкоў, мошак.

Калі шпачкі падрасьлі, яны пакінулі шпакоўню й весяла лёталі стайкамі па палёх і сенажацях. Толік часта паглядаў на ліпу, дзе вісела шпакоўня, але там цяпер было ціха.

Адноўчы, калі ўжо на дрэвах пажоўкла лісьцё, а дзень хоць быў сонечны, але кароткі, Толік, паказваючы на шпакоўню, весела зваў дзеда: «Глядзі, зноў шпачкі прыляцелі, сыпяваюць, можа зноў будуць рабіць гняздо?» — «Не, гнязда на зіму птушкі ня робяць», адказаў дзед. — «Шпакі прыляцелі да сваіх хатак, каб разьвітацца зь людзьмі й хаткамі. Яны ўжо зьбіраюцца ляцець у вырай». Толік памахаў ручкаю птушкам і крыкнуў ім: «Бывайце! Вясною вяртайцеся хутчэй да нас зноў. Я зь дзедам пабудуем для вас яшчэ некалькі хатак».

Л. П.